СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II КВАРТАЛ і I ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.
Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	I квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 САКАВІКА 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 44
(26908)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ ЖОРСТКАГА КАНТРОЛЮ ЗА ЯКАСЦЮ БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ

Гэта тэма стала адной з цэнтральных падчас даклада 9 сакавіка кіраўніку дзяржавы старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандра Якабсона.

Прэзідэнту было даложана аб выніках работы КДК у 2010 годзе і задачах на 2011 год.

У цэнтры ўвагі сустрэчы знаходзілася ўзмацненне кантролю за будаўніцтвам жылля і яго якасцю. Як паказалі вынікі работы за 2010 год, у гэтай сферы застаецца яшчэ шмат нявырашаных праблем. Так, у мінулым годзе каля 180 тыс.кв.м жылля было знята з уводу ў эксплуатацыю. Прэзідэнт запатрабаваў жорсткага кантролю за якасцю будаўніцтва жылля, каб такія факты ў будучыні не паўтараліся. Аляксандр Якабсон запэўніў, што пытанні будаўніцтва жылля, яго аб'ёмаў і якасці будуць заставацца пад строгім кантролем камітэта і ў гэтым годзе.

Акрамя таго, на сустрэчы падрабязна была разгледжана тэма аказання дзяржпадтрымкі і эфектыўнасці яе выкарыстання. Як было даложана кіраўніку дзяржавы, па выніках 2010 года колькасць неэфектыўных праектаў, якія выкарыстоўвалі дзяржпадтрымку, склала каля адной трэці ад колькасці суб'ектаў гаспадарання, праверэных камітэтам. Разам з тым варта мець на ўвазе, што шэраг суб'ектаў гаспадарання з-за аб'ектыўных абставін не можа працаваць эфектыўна, у прыватнасці гэта датычыцца некаторых прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу. Прэзідэнт даручыў правесці сур'ёзны аналіз сітуацыі і далажыць яму аб выніках.

Штогод дзяржпадтрымку атрымліваюць больш за 3 тыс. суб'ектаў гаспадарання. Пры гэтым на працягу апошніх гадоў выразна прасочваецца негатыўная тэндэнцыя недасягнення атрымальнікамі падтрымкі даведзеных мэтавых паказчыкаў. Пэўная частка сродкаў дзяржпадтрымкі траціцца неэфектыўна, пры гэтым асноўная сума неэфектыўна выкарыстаных сродкаў прыпадае на рэалізацыю асобных інвестыцыйных і інавацыйных праектаў, што сведчыць аб недастатковай прапрацоўцы прымаемых рашэнняў аб неабходнасці іх рэалізацыі. Камітэт дзяржкантролю прапануе накіроўваць дзяржпадтрымку выключна на акупныя праекты.

Аляксандр Лукашэнка, гаворачы ў цэлым аб рабоце Камітэта дзяржаўнага кантролю, запатрабаваў глыбокай аналітычнай работы пры ажыццяўленні кантрольных функцый. Старшыня КДК у сваю чаргу падкрэсліў, што ў 2011 годзе кантрольна-аналітычная работа прыме больш маштабныя формы.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«РОЛЯ ЖАНЧЫН У ГРАМАДСКІМ ЖЫЦЦІ ПАСТАЯННА ЎЗРАСТАЕ»

Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на ўрачыстым прыёме ў Палацы Рэспублікі, прысвечаным Дню жанчын.

«Гэта свята — сімвал глыбокай павагі працаўніц, шанавання маці, захаплення каханымі, прызнання вялікай ролі ў грамадстве ўсіх прадстаўніц прыгожага полу, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вас называюць лепшай паловай чалавецтва не толькі таму, што вы мілыя, пяшчотныя, але і таму, што дзякуючы сваёй душэўнасці робіце жыццё больш дасканалым і гуманным. Бясцэнна тое багацце душы і любові, якое вы дорыце і ў будні, і ў святы не толькі сваім родным і блізкім, але і ўсім людзям».

Паводле яго слоў, пастаянна расце роля жанчын у грамадскім жыцці Беларусі, у прыняцці палітычных рашэнняў. «І вельмі дарэчы тут вашы разважлівасць, мэтанакіраванасць і ўменне знаходзіць згоду», — сказаў кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы, што ў Беларусі функцыянуе жаночае грамадскае аб'яднанне і амаль 70 працэнтаў дзяржслужачых — жанчыны.

«Мацярынства і выхаванне дзяцей з'яўляюцца свяшчэннай, дадзенай Богам, місіяй жанчыны. Усялякай пахвалы і падтрымкі заслугоўваюць тыя з вас, хто паспяхова спалучае прафесійныя і сямейныя абавязацельствы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка, падзякаваўшы жанчынам за вялікі ўклад, які яны ўносяць у павышэнне дабрабыту і прэстыжу рэспублікі.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў у Палацы Рэспублікі 6 ордэнаў і медалёў жанчынам, якія ўвасабляюць самыя лепшыя рысы беларускага народа, такія як працавітасць, самаадданасць і служэнне блізкім. Так, за нараджэнне і выхаванне пяцярых дзяцей ордэн Маці атрымалі работніца Магілёўскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя № 7 Ганна Вайтасевіч і загадчыца гаспадаркі ўстановы адукацыі «Казянская дзяржаўная агульнаадукацыйная школа-сад» Браслаўскага раёна Ала Пучынская. Ордэнам Пашаны ўзнагароджана токар рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання «Гомсельмаш» Галіна Баранава...

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

НАЦБАНК: АДСТУПЛЕННЯЎ АД АБ'ЯЎЛЕНАЙ КУРСАВОЙ ПАЛІТЫКІ Ў БЕЛАРУСІ НЕ БУДЗЕ

Аб гэтым паведаміў БЕЛТА начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Нацыянальнага банка Анатоль Драздоў.

«Палітыка курсаўтварэння ў Беларусі, аб'яўленая Нацыянальным банкам раней, у тым ліку і ў частцы калідора ваганняў курсу беларускага рубля да кошту кошыка замежных валют, застаецца нязменнай. Адступленняў ад аб'яўленай курсавой палітыкі няма і быць не можа», — сказаў Анатоль Драздоў. Курсавая палітыка Нацбанка ў 2011 годзе накіравана на забеспячэнне ўстойлівасці беларускага рубля. У адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2011 год, зацверджанымі ўказам Прэзідэнта ад 19 лістапада 2010 года № 597, захоўваецца рэжым прывязкі абменнага курсу беларускага рубля да кошту кошыка замежных валют. У 2011 годзе межы калідора ваганняў кошту кошыка замежных валют, які ўключае ў сябе расійскі рубель, долар ЗША і еўра з роўнымі долямі, звужаны да +/-8 працэнтаў адносна кошту кошыка, які склаўся да пачатку 2011 года (Br1054,68). Гэта значыць, што дыяпазон дапушчальных ваганняў курсу беларускага рубля да кошыка валют складзе ад Br970,03 да Br1138,73. Пры гэтым для забеспячэння стабільнага курсу нацыянальнай валюты ў межах гэтага калідора Нацыянальным банкам будуць задзейнічаны ўсе неабходныя меры ў галіне грашова-крэдытнай палітыкі.

Старшыня праўлення Нацбанка Пётр Пракаповіч запэўнівае, што курс нацыянальнай валюты да кошыка замежных валют у гэтым годзе будзе знаходзіцца ў запланаваных межах аб'яўленага калідора. У далейшым Нацбанк плануе звужэнне калідора ваганняў курсу нацвалюты. Курс беларускага рубля адносна кошыка замежных валют з пачатку года знізіўся на 4,75 працэнта і з 10 сакавіка 2011 года ўстаноўлены на ўзроўні Br1104,77.

Фотарэпартаж

КОНЬ ЗАЦУГЛЯНЫ

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Бадай, яшчэ ні адна выставачная пляцоўка апошніх гадоў не збірала гэтулькі наведнікаў, як выстаўка пародзістых коней у мінулыя выхадныя дні. Яна праходзіла ў сталічным Белэкспа і паказала, якія мы, нават гарадскія жыхары, неабыякавыя да гэтай істоты. Але каб гэтак здзіўляцца!.. Небеспадстаўна лічыцца, што Беларусь — нацыя сялянская. Конь на вясковым падворку — не раскоша, не экзотыка, а першы памочнік гаспадара. Дастаткова выехаць за межы сталіцы ўсяго на 10-15 кіламетраў — і глядзі сабе на каня: і ў колах, і з плугам, і на выпасе. Здзівіць нашага чалавека гэтай жывёлай, здавалася, проста немагчыма. Але думаць так памылкова. Бо конь каню розніца. Гэта па-першае. А па-другое, чым болей з'яўляецца ў нас жалезных коней, тым мацнейшая туга ў чалавека па колішнім, і натуральнае жаданне быць бліжэй да матухны-прыроды толькі расце. Конь, несумненна, — адна з самых прыгожых і разумных істот на зямлі, ён будзе заўсёды ўвасабленнем гармоніі і хараства.

СТАР. 4

НА ВЫХАДНЫЯ ІСТОТНА ПРЫГРЭЕ, МЕСЦАМІ ДА ПЛЮС 10—12

У чацвер і пятніцу на тэрыторыю Беларусі завітаюць вільготныя атмасферныя франты з боку Атлантыкі, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму ў чацвер у заходніх рэгіёнах, а ў пятніцу па ўсёй тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галаледзіца. Удзень у чацвер будзе ад мінус 2 да плюс 3, на поўдні — да 5 цяпла. У пятніцу прагназуецца ўзмацненне ветру, парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература ўначы ад мінус 5 да плюс 2; удзень 1—6 цяпла, на паўднёвым захадзе нават да плюс 8 градусаў. На выхадныя атмасферны ціск пачне павялічвацца, таму ўначы будзе падмарожваць да 0 — мінус 7, у нядзелю на паўночным усходзе месцамі да мінус 10—13 градусаў. Часам будзе ісці невялікі дождж, таму ўначы і раніцай на асобных участках дарог галаледзіца. Удзень у суботу 0—8 цяпла, у нядзелю — плюс 2—9, у Брэсцкай вобласці — да 10—12 цяпла. Сіноптыкі адзначаюць, што такі тэмпературны фон на выхадныя будзе на 1—5 градусаў вышэй за кліматычную норму гэтых дзён сакавіка. На наступным тыдні ападкі будуць выключна ў выглядзе дажджу, уначы будзе каля 0, удзень стабільна 2—10 цяпла, а на поўдні — да плюс 12—13 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

СЯРОД БЕЛАГА ДНЯ...

4 сакавіка, калі ў філіяле «Беларусбанка», што ў Пружанах, не было наведнікаў, зайшоў невядомы і, пагражаючы касіру прадметам, які меў падабенства з пісталетам, запатрабаваў грошы.

Рабаўнік прыхапіў больш за 13 тысяч расійскіх рублёў, 2 млн 510 тысяч беларускіх, а яшчэ 3 128 долараў ды 1 885 еўра... і пакінуў памяшканне.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Ад медаля Надзею Скардзіну аддзяліла 9 секунд

Гэта пакуль лепшы вынік нашых біятланістаў на чэмпіянаце свету

Фота БЕЛТА.

На чэмпіянаце свету па біятлоне, які праходзіць у расійскім Ханты-Мансійску, беларусы пакуль застаюцца без медалёў. Не ладзяцца справы ў лідара нашай каманды Дар'і Домрачавай — няма і прызавых месцаў. У гонцы праследавання, напрыклад, Дар'я дапусціла аж 8 промахаў, прыехаўшы на фініш 36-й. А ўчора ў індывідуальнай гонцы Домрачава таксама адстралялася не вельмі — 6 промахаў і 19-е месца. Затое яшчэ адна беларуска, якая дагэтуль і не прэтэндавала на ролю лідара, паказала ўчора нечаканы вынік. 25-гадовая Надзея Скардзіна заняла ў індывідуальнай гонцы 4-е месца!

Месца хоць і высокае, але крыўднае, тым больш што ад бронзавага медаля біятланістку аддзяліла ўсяго 9 секунд! Надзея пераадолела дыстанцыю з чатырма агнявымі рубяжамі за 50 хвілін 10 секунд, толькі аднойчы прамахнуўшыся. Праўда, за промах у гэтай дысцыпліне налічваецца штрафная хвіліна. З першага месца спачатку беларуску адцясніла шведка Хелена Эххольм, потым другі вынік паказала немка Ціна Бахман. А бронзу ўзяла ўкраінка Віта Семярэнка, апярэдзіўшы Надзею на 9 секунд. Людміла Калінчык заняла 56-е месца, Вольга Назарава — 58-е.

На медалі ў мужчын мы, вядома, моцна і не спадзяваліся. Пакуль лепшы вынік паказаў Яўген Абраменка — таксама ў індывідуальнай гонцы. Ён стаў 26-м з вынікам 51 хвіліна 55,8 секунды і двума промахамі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

19 САКАВІКА МЕСЯЦ ПАГРАЖАЕ ЗЯМЛІ КАТАСТРОФАМІ

19 сакавіка ў чарговы месяцавы перыгей, ці «суперпоўню», спадарожнік Зямлі наблізіцца да планеты на максімальна блізкую адлегласць, пачынаючы з 1992 года. Месяц і Зямлю будуць раздзяляць усяго 356,5 тысячы кіламетраў.

Напярэдадні месяцавага перыгея-2011 інтэрнэт пазапаўнялі трывожныя прагнозы навукоўцаў пра тое, што «суперпоўня» можа выклікаць сур'ёзныя прыродныя катаклізмы: у першую чаргу землятрус і вулканічную актыўнасць па ўсім свеце. Так, у папярэднія фазы максімальнага збліжэння Месяца з Зямлёй (1955, 1974, 1992 і 2005 гадах) метэаролагі фіксавалі экстрэмальныя ўмовы надвор'я, якія пацягнулі за сабой шэраг маштабных прыродных бедстваў.

КАДАФІ СТАВІЦЬ УМОВЫ

Муамар Кадафі заявіў, што гатовы адмовіцца ад улады, калі атрымае грашовы выкуп, гарантыю бяспекі, а таксама імунітэт ад крымінальнага праследавання. Аднак прадстаўнікоў апазіцыі не задавальняюць умовы лівійскага прэзідэнта, бо яны маюць намер прыцягнуць палкоўніка да суда за злачынствы супраць свайго народа.

8 сакавіка Нацыянальная рада Лівіі дала Кадафі 72 гадзіны на тое, каб пакінуць тэрыторыю краіны. У гэтым выпадку апазіцыянеры былі гатовыя адмовіцца ад крымінальнага праследавання. Тым часам войскі палкоўніка працягваюць наносіць удары па лівійскіх гарадах. Па апошніх звестках з Трыпалі ў сераду вылецелі адразу тры асабістыя самалёты Кадафі — адзін накіроўваўся ў Каір, яшчэ два ляцелі ў Вену і Афіны. Хто знаходзіўся на борце, вядома не было. Таксама

паведамлялася пра тое, што знік атрад з 40 целаахоўніц, якія забяспечвалі бяспеку прэзідэнта Лівіі. Знакамітыя жанчыны-спецбайцы (якія, па чутках, усе з'яўляюцца нявінніцамі) выключна адданыя кіраўніку Лівіі і гатовыя абараняць яго нават коштам свайго жыцця. Калі ў 1998 годзе тэрарысты напалі на картэж Кадафі, адна з целаахоўніц закрыла лідара сваім целам і загінула, яшчэ сем атрымалі цяжкія раненні.

ПАЧАК ЧЫПСАЎ СТРАШНЕЙШЫ ЗА ЦУКЕРКІ

Фінскія дыетолагі высветлілі: лепш з'есці каробку цукерак, чым пачак чыпсаў. Адмыслоўцы выступаюць супраць цвёрдага абмежавання ў ежы, асабліва супраць монадыет, якія прадугледжваюць спажыванне толькі аднаго прадукту.

Калі чалавеку хочацца з'есці шкодны прадукт, не варта сябе абмяжоўваць. Досыць уразаць яго аб'ём. Горш за ўсё арганізм чалавека пераносіць спалучэнне тлушчу і солі. Іх працяглае спажыванне пагражае захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы і назапашваннем залішняй вадкасці ў целе. Зменшыць негатыўны ўплыў на арганізм аматары піцы і гамбургераў здольныя, проста дадаўшы ў рацыён салату з гародніны. А адзіны недахоп цукерак — цукар. Ён не так небяспечны для арганізма, калі абмяжоўваць яго спажыванне.

ТЫСЯЧУ ДОЛАРАЎ АДДАЛІ ФАТОГРАФУ-АМАТАРУ

У Мінску назвалі лаўрэатаў II штогадовай міжнароднай прэміі ў галіне вэб-журналістыкі «Yousmi Media Awards-2010»

— Нідзе я не вучылася фатаграфаваць, — прызнаецца ўладальніца галоўнага прыза ў 1000 долараў Надзея Дзегцярова. — Раней увогуле працавала праграмістам, але пасля сышла ў фатаграфію — зацягнула. Працую зараз на партале open.by — фотакарэспандэнтам.

Прэмія «Yousmi Media Awards», якую прыдумаў і ўвасобіў у жыццё студэнт-пяцікурснік Інстытута журналістыкі БДУ, а сёння і кіраўнік кампаніі «Сучасныя Медыя Сістэмы» Дзяніс Місюля, сабрала сёлета больш за 200 заявак ад 430 аўтараў. На конкурс свае працы дасылалі журналісты з 25 краін свету.

Як вядома, членамі журы конкурсу сталі карэспандэнты вядомых сусветных СМІ: Reuters, France Press, Associated Press, Руская служба Бі-бі-сі, РыаНавіны і інш. Вынікі такім чынам былі падведзены ў шасці намінацыях: лепшы журналіст (аматар/прафесіянал), лепшы фатограф (аматар/прафесіянал), лепшы блог, лепшы блог пра Беларусь, лепшы сайт СМІ, лепшае відэа. Дадаткова былі ўручаныя прызы ў намінацыі «Персона года» і «Прыз глядацкіх сімпатый». Галоўны прыз у 1000 долараў рашэннем журы прысудзілі Надзеі Дзегцяровай:

— Я вельмі люблю фатаграфаваць, — прызнаецца шчаслівая пераможца. — І не толькі па роду працы, але перш за ўсё для сябе. Як нарадзіўся мой пераможны здымак? Хадзіла, шукала пэўныя сюжэты, здымала. Зайшла ў дворык, а там жанчына выйшла развешваць бялізну.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Шчаслівая пераможца на цырымоніі ўзнагароджання прыйшла з сынам. «Мой сын — гэта мая сям'я, «— расказала Надзея ДЗЕГЦЯРОВА.

Проста чароўная жанчына — напэўна, на апошнім месяцы цяжарнасці. Спачатку каля яе круціліся малыя дзеці, затым выйшаў муж з вазком. Жыццё. Я і фотаздымак назвала: «Няхай жыве жыццё!»

Інстытут журналістыкі будзе прэміраваць лепшых студэнтаў?

Конкурс «Yousmi Media Awards» — не першая цалкам студэнцкая ініцыятыва Інстытута журналістыкі БДУ. Нядаўна на факультэце завяршыўся літаратурны конкурс «Брама мар», прыдуманы для студэнтаў з усёй Беларусі. Ужо традыцыйнымі сталі і ўнутрыфакультэцкія мерапрыемствы, кшталту жартоўнай прэміі «Залатая качка», якую студэнты прысуджаюць лепшым выкладчыкам.

СТАР. 4

Андрэй КРАЎЧАНКА:

«У ПАДАРУНАК ЗА ПЕРАМОГУ ЗРАБЛЮ ТАТУІРОЎКУ»

У Парыжы завяршыўся чэмпіянат Еўропы па лёгкай атлетыцы ў залах, які прынёс беларускай камандзе залаты медаль у сямібор'і. Яго заваяваў наш многабарац Андрэй Краўчанка.

Сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Пекіне па дзесяцібор'і набраў на турніры ў Францыі 6282 ачкі, устанавіўшы нацыянальны рэкорд. Перамогу нашаму спартсмену прынеслі апошнія віды — скачкі з шастом і бег на дыстанцыі 1000 метраў, дзе беларус апярэдзіў усіх супернікаў. Вынік Андрэя Краўчанкі адметны яшчэ і тым, што дагэтуль ніхто з беларусаў не перамагаў у сямібор'і на чэмпіянатах Еўропы ў памяшканнях.

Пасля перамогі Андрэй падзяліўся ўражаннямі:

— Я прыехаў на турнір з траўмай нагі і яшчэ на размінцы апасаўся, што не змагу выйграць медаль. Баяўся за скачкі ў даўжыню і вышыню. Але доктар і масажыст нашай каманды зрабілі ўсё, каб у мяне быў медаль.

— Калі зразумеў, што можаш выйграць?

— Калі ўзяў у скачках у вышыню 209 см. Пайшлі эмоцыі, і на спробе 212 см нага ўжо не балела. Болевы парог быў пераадолены, далей быў адзін адрэналін. Я заўсёды бачу прарочыя сны перад спаборніцтвамі, так было і цяпер, нават прысніў, што на 1000 мне прыйдзецца ўпірацца з французам. Але тут дзякуй Эдуарду Міхану, які задаў тэмп і дапамог мне паказаць такі вынік. Вялікае прывітанне балельшчыкам, маім блізкім і дзяўчыне, якія за мяне перажывалі!

— Які падарунак сабе зробіш?

— Новае тату. Пакуль не вырашыў, якое, але звязана яно будзе з мнагабор'ем.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

НА ТАРАН

Каля вёскі Ясны Лес Бабруйскага раёна, на трасе Мінск—Гомель, адбылося лабавое сутыкненне «Мазды» і «Форда». Паводле інфармацыі Магілёўскай ДАІ, вадзіцель «Мазды» не справіўся з кіраваннем на слізкай дарозе, выехаў на сустрэчную паласу і пратараніў «Форд». На месцы загінуў 35-гадовы вадзіцель «Мазды», жыхар Мінскай вобласці. Яго цела, як і яшчэ дваіх параненых, давялося даставаць з аўтамабіляў работнікам МНС з дапамогай спецыяльнага абсталявання. Жонка вадзіцеля «Мазды» 35-ці гадоў шпіталізавана з цяжкімі траўмамі. Вадзіцель «Форда», 27-гадовы мінчанін, атрымаў чэрапна-мазгавую траўму, а 29-гадовая пасажырка «Форда» з траўмамі і пераломам сківіцы таксама апынулася ў бальніцы.

Ілона ІВАНОВА.

Фота Магілёўскай ДАІ.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Воложинского райпо (продавец)

проводит открытый аукцион по продаже здания магазина № 75 «На узгорку», об. пл. 553,2 кв.м, расположенного по адресу: **Минская область, г. Воложин, ул. Щербины, 54.**

Начальная цена с НДС – 63 265 093 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,1888 га.

Задаток в сумме 6 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, ***если иное не предусмотрено договором купли-продажи.***

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **12.04.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.04.2011** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Автомагистраль» (продавец)

проводит открытый аукцион по продаже незавершенного строительством законсервированного здания склада ПСС и соли **(арочник)** (готовность 70 %, инв. № 630/U-62514), об. пл. **907,9 кв.м**, расположенного по адресу: **Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Вередовская, д. 6 б.**

Начальная цена с НДС – 504 068 400 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,3400 га.

Задаток в сумме 50 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, ***если иное не предусмотрено договором купли-продажи.***

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **12.04.2011 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 11.04.2011 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

ОХОТХОЗЯЙСТВО
ОАО "ГРОДНЕНСКАЯ ТАБАЧНАЯ ФАБРИКА "НЕМАН"
150 лет
ПРИГЛАШАЕТ ПОСЕТИТЬ СТЕНД
НА X МЕЖДУНАРОДНОЙ ВЫСТАВКЕ-ЯРМАРКЕ
«ОХОТА И РЫБОЛОВСТВО. ВЕСНА 2011»
10-13 МАРТА
г. МИНСК НВЦ БЕЛЭКСПО на Я.КУПАЛЫ, 27
Телефоны для справок: 8 0152 52-20-75, +375 29 787-12-26, +375 29 787-28-14
УНП 500047627

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.03.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	3 019,00	1 чэшская крона	172,56	USD	28,2945
▼ 1 еўра	4 185,84	1 польскі злоты	1 054,62	10 UAH	35,6062
1 латвійскі лат	5 934,74	▼ 1 расійскі рубель	106,70	1000 BYR	9,3815
1 літоўскі літ	1 213,45	1 украінская грыўня	380,43	EUR	39,3039

Агенства Прадпрыемства Гратэска

Інтэрв'ю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі газеце «Вашынгтон пост»

«ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ ДА НАС З ДАБРОМ!»

Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю адной з вядучых газет ЗША «Вашынгтон пост». Пытанні, якія, па ўсім бачна, цікавяць не толькі выданне, задавала прадстаўніца амерыканскага істэблішмэнта, старшы рэдактар газеты Элізабет Грэхем Веймаўт. Многія з іх датычыліся мінулых выбараў Прэзідэнта Беларусі.
Інтэрв'ю ў цэлым заняло каля трох гадзін.
Значную частку гэтага часу кіраўнік дзяржавы патраціў, каб выправіць павярхоўнае ўяўленне субяседніцы аб нашай краіне, атрыманае выключна з газетных публікацый.

Фота БЕЛТА.

АПАЗІЦЫЯ НА ВЫБАРАХ НЕ ПРАПАНАВАЛА БЕЛАРУСКАМУ НАРОДУ НІЧОГА КАНСТРУКТЫЎНАГА

У прыватнасці, спадарыню Веймаўт цікавіла рэакцыя Аляксандра Лукашэнкі на санкцыі з боку ЗША і ЕС. Ці не хацеў бы ён у такой сітуацыі паступіць інакш?

— Для таго каб, па-першае, перадумаць і зрабіць па-іншаму, трэба, напэўна, не дай бог, перажыць падзеі ночы 19 снежня. Але я Вас расчарую: калі б гэта адбылося зноў заўтра, паслязаўтра ўночы, я зрабіў бы дакладна гэтак жа, як зрабіў тады. Гэта значыць, нікога не збіваючы, не забіваючы, не прымушаючы сілай. А абараняў бы Дом урада так, як гэта належыць па Канстытуцыі і закону. Калі Вы хочаце мяне папракнуць у тым, што я абараніў Канстытуцыю і закон, дык і напішыце ў Злучаных Штатах Амерыкі, што «Вашынгтон пост» папракае Прэзідэнта Беларусі, што ён дзейнічаў строга па Канстытуцыі і закону.

Паводле слоў Элізабет Веймаўт, ЗША спадзяваліся на тое, што Беларусь будзе больш адкрыта ў адносінах да Еўропы і ЗША. «Усім апазіцыйным кандыдатам была прадастаўлена магчымасць прымаць удзел у выбарах, і мы бачылі, што ўлады Беларусі былі настроены на ўзаемадзеянне з Захадам», — адзначыла яна, дадаўшы, што падзеі пасля 19 снежня выклікалі здзіўленне.

— Мы таксама вельмі спадзяваліся, што амерыканцы і Еўропа — гэта прыстойныя людзі, якія вельмі зацікаўлены ў тым, каб наша краіна была суверэннай і незалежнай, і што вы можаце будаваць з намі прыстойныя адносіны. Але падзеі 19 снежня нас пераканалі ў тым, што вы гэтага не хацелі і да 19 снежня.

«У БЕЛАРУСІ НЕ МЕНШ ДЭМАКРАТЫІ І СВАБОДЫ, ЧЫМ У ЗША»

У Беларусі ні ў якім разе не менш дэмакратыі і свабоды, чым у ЗША, сказаў кіраўнік дзяржавы.

— Я вам скажу па-амерыканску, як у Злучаных Штатах Амерыкі, калі б любы грамадзянін ЗША ўчыніў злачынства, а побач з ім быў экс-кандыдат у Прэзідэнты, яны адказвалі б на роўных: і экс-кандыдат, і грамадзянін, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Чаму Вы вылучаеце чацвёра або сямёра, як Вы сказалі, былых экс-кандыдатаў, дзеянні якіх павінны разглядацца за рамкамі крымінальнага або іншых законаў Беларусі? Закон для ўсіх адзіны: што для грамадзяніна радавога, што для былога экс-кандыдата, які, дарэчы, у Беларусі па закону прыраўноўваецца да любога грамадзяніна Беларусі.

...Па выбарах ні амерыканцы, ні еўрапейцы — афіцыйныя і іншыя асобы — не прад'явілі прэтэнзій. Ніхто пад сумненне выбары не паставіў. Таму што ўсе кандыдаты ў прэзідэнты мелі магчымасць выступаць у беларускіх сродках масавай інфармацыі. Пры гэтым прыміце пад увагу, што яны цалкам запаланілі эфір праз расійскія СМІ. А расійскія сродкі масавай інфармацыі ў нас абсалютна ўсе распаўсюджваюцца: і электронныя, і папяровыя. Таму ім хапала часу.

Пытанне ў тым, Элізабет, з чым яны прыйшлі на выбары, што яны сказалі беларускаму народу. Нічога, акрамя таго, што Лукашэнку расстраляць, павесіць, устараніць і гэтак далей. Гэтага беларускі народ не прымае. Напэўна, і амерыканцы гэта сустрэлі б у штыкі.

Звяртаючыся да Элізабет Грэхем Веймаўт, беларускі лідар пацікавіўся тым, як бы зрабіў амерыканскі Прэзідэнт і службы бяспекі, калі б незадаволеная меншасць, якіх было каля трох тысяч, прарвалася да Белага дома і пачала яго граміць, спрабуючы захапіць.

Э.В. — Калі б яны сапраўды спрабавалі сілай прарвацца ў Белы дом, калі б яны білі вокны і наносілі пашкоджанні ўрадавым будынкам, то ўлады прадухілілі б такія падзеі, людзі былі б затрыманы...

Э.В. — ...Ці будзеце Вы разглядаць магчымасць амнісціравання тых людзей, якія былі арыштаваныя той ноччу?

— Гэта маё права. Калі прыйдзе час, я пра гэта скажу. Зараз такой неабходнасці няма. Цяпер усе тыя, дзе даказана, што яны ламалі і білі дзяржаўную ўстанову, іх справы знаходзяцца ў судзе. І толькі суд мае права разглядзець гэтыя справы. Гэтак жа, як і ў ЗША. Уявіце, што ў ЗША Абама цяпер бы ўвязаўся ў судовы працэс. Яму не быць больш Прэзідэнтам на другі тэрмін. А чаму вы мяне падбіваеце да таго, каб я ўвязваўся або ўмешваўся ў справы правасуддзя?!

...Скажыце мне, калі ласка, паважаная прадстаўнік дэмакратыі, навошта ЗША разбурылі Ірак? Гэта міжнароднае злачынства. Чаму вы за гэта не адказваеце? Пра якую пасля гэтага можна гаварыць дэмакратыю, калі забіты тысячы не толькі іракскіх грамадзян і іншых, але загінулі тысячы амерыканцаў. А ў іх дзеці, сем'і... А што творыцца цяпер у Іраку, у Афганістане, дзе галоўную скрыпку іграе «дэмакратычная» краіна? А як вы адрэагавалі на тое, што вашу калегу журналістку згвалтавалі на плошчы ў Каіры?..

Чаму вы не занялі жорсткую пазіцыю? Вы баіцеся, таму што вы бачыце там свае інтарэсы. І вам трэба ўстанаўліваць адносіны з тымі, хто сёння ў Егіпце і ў іншых арабскіх краінах пасля рэвалюцыі прыйдзе да ўлады. І глыбока наплываць на тое, што там згвалтавалі вашу калегу — грамадзянку ЗША. Вось ваша дэмакратыя і праўда... А калі гэта здарылася б у Беларусі, вы ўжо нас размазалі б па ўсёй планеце. Магчыма, і войскі ўвялі б або крылатыя ракеты сюды паслалі б для таго, каб дэмакратыю нейкую навязаць. Вось, Элізабет, амерыканская дэмакратыя — двухаблічная, магчыма, трохаблічная.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, выбарчае заканадаўства Беларусі нічым не горшае, чым, напрыклад, у Расіі, Казахстане, Азербайджане, з якімі Захад і ЗША ў тым ліку вельмі актыўна супрацоўнічаюць.

— А што датычыцца падліку і галасавання. Вы ведаеце, дай бог, каб у Амерыцы былі такія ўмовы, як у Беларусі. У нас па пошце ніхто не галасуе, а прыходзіць асабіста на ўчастак і галасуе. А ў вас можна і па пошце. А наглядальнікаў вы наогул на ўчастку не пускаеце. А калі пусціце, то яны могуць толькі пастаяць у парозе і хуценька выбрацца адтуль. І мы вас у гэтым не папракаем. Калі вам так зручней, калі ласка, жывіце. І мы не крычым гвалтам аб тым, што гэта нам не падабаецца. А вы замест таго, каб займацца сваімі праблемамі, — дзесьці дзверы ў свеце рыпнулі не так, пачынаеце ўзнімаць шум. Навошта?

Э.В. — Вы бывалі ў ЗША?

— Вядома. Вельмі шмат разоў быў, напэўна, разоў пяць. У асноўным на міжнародных канферэнцыях. А аднойчы я прыляцеў у вашу краіну і пабываў у розных пунктах з усходу на захад. А потым вы вырашылі, што гэта шкодна для ЗША, і закрылі мне ўезд у Злучаныя Штаты Амерыкі.

Элізабет, але я — не вораг ЗША. І да Аль-Каіды не належу. Што гэта за дэмакратыя такая, што вы выбудоўваеце жалезныя заслоны?!

...Я не адгароджваюся ад амерыканскіх журналістаў, як гэта вы зрабілі, забараніўшы ўезд нашым журналістам у Амерыку. Навошта вы забаранілі ўезд нашым журналістам у Амерыку? За тое, што яны маюць свой пункт гледжання?

Э.В. — Я не ведала, не думала аб гэтым...

— Вось бачыце... А вы нас папракаеце ў недэмакратычнасці. Ну а навошта вы маіх дзяцей пакаралі? Ну, мяне пакарайце, а прычым тут дзеці? Навошта вы дзясяткам невінаватых, якія не маюць дачынення ні да выбараў, ні да 19 снежня, закрылі ўезд? Навошта? Не ведаеце... А ў нас ёсць такія пытанні да ўрада Амерыкі. І яшчэ вельмі шмат пытанняў.

Э.В. — Што датычыцца Пасольства ЗША, тое, што гавораць супрацоўнікі Пасольства ЗША. Так, вы выгналі Пасла ЗША з Беларусі...

— Але вы выгналі нашага Пасла з Амерыкі, ну і што?

Э.В. — Вы нашага выгналі першым.

— А навошта нам Пасол, які арганізоўвае акцыі «пятай калоны»? Элізабет, прызначэнне Пасла — паляпшаць адносіны паміж дзяржавамі, а не нагнятаць!

Э.В. — Вы сапраўды думаеце, што Пасол ЗША арганізоўваў гэта?

— Элізабет, я не думаю, я ведаю! Я Прэзідэнт краіны і я ведаю гэта! І потым, хто вам перашкаджае прысылаць свайго Пасла ў Беларусь? І ўвогуле, навошта ў Беларусі амерыканскі Пасол, калі вы не хочаце супрацоўнічаць з нашай краінай? Чым ён будзе тут займацца? Грошы прывозіць «пятай калоне»? Нам гэта не трэба.

Калі вы хочаце з намі супрацоўнічаць, як дэмакратычная Амерыка, як імперыя сусветная, давайце садзіцца за стол і будзем супрацоўнічаць. І тады пытанняў аб паслах і якіх-небудзь арганізацыях, аб якіх Вы гаворыце, нават аб людзях, існаваць не будзе.

Э.В. — Якім чынам адбываецца, што людзі, што знаходзяцца ў турме, былыя прэзідэнцкія кандыдаты, не маюць доступу да адваката? Чаму Вы не можаце аддаць загад, каб доступ адвакатаў да гэтых людзей быў дазволены?

— Вы ведаеце, у нас не трэба на гэта аддаваць загады. Усё, што Вы гаворыце, гэта — абсалютная хлусня! Адвакат на тое і адвакат, каб сустракацца са сваім падабаронным.

Э.В. — Але, прынамсі, у газетах гаворыцца пра тое, што Вы пазбаўляеце...

— Навошта Вы мне гаворыце пра газеты? Ваша газета «Вашынгтон пост», я Вам зараз знайду «Вашынгтон пост» і пакажу, што вы напісалі. Гэта такая гнюсная хлусня, што нават мяне, чалавека, які шмат пабачыў, яна абурае...

Таму не трэба спасылацца на газеты і гаварыць пра нейкія факты, якіх увогуле ў прыродзе няма.

...Вось чытайце, што напісаў «Вашынгтон пост». Гэта дзікунства... Гэта рэдакцыйны артыкул.

Э.В. — Што тут няправільна?

— Усё няправільна.

Э.В. — Як Вы ведаеце, што гэта хлусня?

— Адкуль я ведаю, што гэта хлусня? Ну, таму што я чытаю і супастаўляю з тымі фактамі, якія ў нас былі. І я быў сведкам у рэжыме «он-лайн» таго, што адбывалася ля Дома ўрада. Як Вы ведаеце, там устаноўленыя паўсюдна камеры, яны выведзены на маніторы. І я бачыў усё, што там адбывалася. Гэтаксама, як у Белым доме.

І потым, наш не вельмі сяброўскі канал «Еўраньюс» гэтыя карцінкі паказаў.

Э.В. — Мне падалося, што Вы кантралюеце ўсе станцыі тэлевізійныя.

— Вы ведаеце *(смяецца)*, мне не было б калі тады займацца сваёй справай, калі б я ўсе гэтыя станцыі кантраляваў.

ЗАХАВАННЕ БАЗЫ ГУАНТАНАМА І ГАНЕННІ НА Д. АСАНЖА — ПРЫКМЕТЫ НЕДЭМАКРАТЫЧНАСЦІ Ў ПАЛІТЫЦЫ ЗША

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць захаванне базы Гуантанама і ганенні на заснавальніка WikiLeaks Джуліяна Асанжа прыкметамі недэмакратычнасці ў палітыцы ЗША.

— Навошта вы на базе Гуантанама без суда і следства трымаеце тысячы зняволеных? Адпусціце іх!

Э.В. — Гэта тыя людзі, якія спрабавалі ўзарваць Сусветны гандлёвы цэнтр.

— А вы адкуль ведаеце, што яны спрабавалі ўзарваць? Гэта толькі суд павінен сказаць. Гэта недэмакратычна. У дэмакратычнай дзяржаве гэта можа зрабіць толькі суд, такое заключэнне. І нават не журналіст, нават такога высокага ўзроўню, як Вы. Якая ж гэта дэмакратыя? Вы абяцалі закрыць гэту базу як анахранізм мінулага. Чаму не закрылі?

Э.В. — Людзі ў Гуантанама не з'яўляюцца кіраўнікамі дэмакратычнай або рэспубліканскай партыі ЗША...

— І ў нас 45 чалавек не з'яўляюцца кіраўнікамі. У вас што, для дэмакратычнай партыі свой закон, для рэспубліканцаў — свой, а для іншых людзей — трэці закон?! У вас адзін закон для ўсіх!

Э.В. — Так, у нас ёсць трэці закон для тэрарыстаў, якія ўзрываюць буйныя будынкі. Гэта не адно і тое ж.

— А ў нас адзін закон для пагромшчыкаў будынкаў і для тых, хто ўзрывае. У нас усе адказваюць па аднаму закону! Я не хачу, каб у Беларусі з часам узарвалі які-небудзь будынак, як у вас узарвалі гандлёвы цэнтр у Нью-Ёрку. А ўсё пачынаецца з гэтых пагромаў.

Э.В. — Ці лічыце Вы, што ЗША павінны закрыць базу Гуантанама?

— Неадкладна трэба закрыць! Таму што гэта, як вы сказалі ў мой адрас, дрэнны сігнал міжнароднай супольнасці.

Э.В. — Многія людзі пагадзіліся б з Вамі.

— Усё ў вас кантралюецца. Чаго ж вы распачалі мітусню з гэтым «Вікіліксам»... Асанжам? Вы ж дэмакраты. Навошта вы хочаце пасадзіць чалавека за краты? Ён апублікаваў факты, тое, што яму стала вядомым. Што ён няпраўду напісаў? Дзе няпраўда? Вам гэта не падабаецца. Вы пачалі кампанію ганення на гэтага чалавека, каб арганізаваць экстрадыцыю ў ЗША і, як я чытаў у вашых газетах, прыгаварыць яго да смяротнага пакарання.

Э.В. — Гэта не мы, гэта ўрад ЗША робіць.

— Ну, вось бачыце. А вы мяне папракаеце. Дык вы разбярыцеся са сваім урадам, а потым са мной.

Э.В. — Што Вы думаеце пра Туніс і Егіпет?

— Гэта вам яшчэ адгукнецца. І вельмі моцна. Гэта ўзор беспрынцыповасці і двухаблічнасці палітыкі ЗША. Лепш там не будзе... Тое, што радыкалізуецца ўся арабская дуга (а сёння гэтыя дэманстрацыі перакінуліся ўжо аж да Індыі), амерыканцам мала не падасца. А вы яшчэ хочаце і ў цэнтры Еўропы пераварот арганізаваць — у Беларусі. Думаю, з намі лепш супрацоўнічаць, чым нас пераварочваць.

У БЕЛАРУСІ НЯМА ПРАБЛЕМ З РЭГІСТРАЦЫЯЙ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ

У прыватнасці, у кіраўніка дзяржавы пацікавіліся, ці плануецца змяніць заканадаўства, каб зрабіць магчымай дзейнасць няўрадавых арганізацый без рэгістрацыі.

— А ў вас магчыма дзейнасць арганізацый, якія не зарэгістраваны? Ці наогул у якой-небудзь краіне свету магчыма?

У Беларусі грамадская арганізацыя, якая не парушае законы і Канстытуцыю, можа зарэгістравацца без усялякіх праблем. А вось калі на амерыканскія грошы, на грошы амерыканскіх падаткаплацельшчыкаў, наша «пятая калона», але ніяк не апазіцыя, будзе дзейнічаць такімі метадамі, то іх жыццё ўскладніцца.

...У нас значна менш моцны кантроль, чым у Злучаных Штатах Амерыкі. На парадак ніжэйшы кантроль. Першае.

Другое. Няхай выконваюць законы пры рэгістрацыі. І любая партыя, любая арганізацыя будзе зарэгістравана, як 2,5 тысячы, якія ў нас сёння дзейнічаюць, грамадскія арганізацыі і гэтак далей.

Э.В. — У сітуацыі, калі маюцца праблемы ў стасунках з Еўрапейскім саюзам і Злучанымі Штатамі, які Ваш план далейшых дзеянняў? Ці існуе нейкі трэці шлях развіцця, скажам, глыбокае супрацоўніцтва з Іранам, Венесуэлай, Кітаем? Вы выклікаеце ўражанне разумнага чалавека, і ў Вас павінен быць нейкі варыянт далейшага развіцця падзей.

— Элізабет, мы спрабуем працаваць па ўсім свеце, мы стукаемся ва ўсе дзверы, але ўваходзім у тыя дзверы, якія нам адчыняюць. Мы вельмі хацелі б, дапусцім, супрацоўнічаць са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Калі б наш тавараабарот быў пяць—дзесяць мільярдаў долараў, гэта было б вельмі добра для нашай эканомікі.

Калі мы пастукалі ў дзверы Венесуэлы, Венесуэла нам гэтыя дзверы адчыніла. Нам адчыніў дзверы Кітай, прадаставіўшы 15-мільярдны крэдыт для развіцця эканомікі. Індыя нам адчыніла дзверы, усе ўсходнія, афрыканскія, лацінаамерыканскія краіны, Бразілія, Расія і гэтак далей.

«У РЭЗІДЭНЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА ВЫ КУПІЦЕ ЛЮБУЮ АПАЗІЦЫЙНУЮ ГАЗЕТУ»

Э.В. — У дачыненні да свабодных сродкаў масавай інфармацыі — чаму Вы не дазваляеце свабодным сродкам масавай інфармацыі працаваць у Беларусі? Што б здарылася, калі б яны працавалі?

— Дык ідзіце на першы паверх у рэзідэнцыю і купіце любую апазіцыйную газету. У мяне ў рэзідэнцыі.

Э.В. — Але гэтыя апазіцыйныя газеты, гэта прэса не з'яўляецца прыватнай — яна з'яўляецца ўрадавай прэсай.

— Я Вам кажу пра прэсу не апазіцыйную нават, а праамерыканскую, варожую.

Вы ім плаціце грошы — яны перапісваюць тое, што друкуе «Вашынгтон пост» і іншыя вашы газеты, і публікуюць. І ў нас людзі гэта чытаюць. І я Вам прапаную купіць гэтыя газеты прама цяпер. Хочаце, мы за свой кошт набудзем Вам і прынясём?

Э.В. — Я сама змагу гэта зрабіць.

— Так, яны не дорага каштуюць. Таму, я думаю, у Вас грошай хопіць. Але калі не хопіць, мы Вам пазычым.

Э.В. — Але я не магу чытаць па-руску.

— Мы Вам усё перакладзём. Самую гадасць мы Вам перакладзём, перапісаную з «Вашынгтон пост».

Э.В. — Мне прыемна гэта чуць.

Але інтэрнэт належыць ураду.

— Ды не, прычым... Якая розніца, каму ён належыць, калі Вы там можаце адкрыць сваю старонку і прачытаць. Гэта першае. Другое. Нічога там ураду не належыць.

Э.В. — Мне здаецца, што я чытала, што Ураду належыць толькі адзін інтэрнэт-сайт.

— Не ведаю. У нас сайтаў шмат. Ёсць у Прэзідэнта свой сайт.

Э.В. — Мне здавалася, што доступ у інтэрнэт кантралюецца дзяржавай.

— Ды мы не можам кантраляваць доступ у інтэрнэт! Як Вы не разумееце... мы на скрыжаванні гэтых шляхоў.

Э.В. — Паглядзіце, як егіпцяне зрабілі — яны змаглі перакрыць доступ у інтэрнэт.

— А мы не можам. А што, амерыканцы не могуць перакрыць доступ у інтэрнэт?

Э.В. — Мы гэтага не робім.

— І мы гэтага не робім, якія да нас прэтэнзіі?

Э.В. — У мяне няма ніякіх прэтэнзій.

Але ўсе кажуць, што ў вас няма па-сапраўднаму свабоднай прэсы тут. А Вы кажаце, што ў вас усё-такі ёсць сапраўдная свабодная прэса?

— Дык Вы пайдзіце і паглядзіце. Я ж Вам дазваляю — зрабіце так, як Вы хочаце.

«ТАКІ ПРЫРОСТ ВУП МАЕ ТОЛЬКІ КІТАЙ»

Э.В. — Як Вы бачыце эканамічную сітуацыю?

— Нашу эканамічную сітуацыю?

Э.В. — Так.

— За першыя месяцы гэтага года — прырост. Быў і дэфіцыт бягучага балансу. Гэта пытанне дынамічнае. Некалі дэфіцыт, некалі плюс... Не ведаю, што б рабіла Амерыка, калі б яна не мела магчымасці друкаваць долары. Вы яшчэ ў большай даўгавой яме, чым мы.

Таму, так, ёсць недахопы пэўныя. Але ёсць і добрыя тэндэнцыі — за першыя месяцы гэтага года прырост ВУП 7 працэнтаў. Такі прырост мае толькі Кітай.

Мы плануем у гэтым годзе атрымаць 10—11 — па годзе.

Так, у нас сапраўды ёсць перакосы з экспартам, імпартам, таму што, як Вы бачыце, нафта падаражала ў два разы, а мы яе ўсю завозім з-за мяжы. У тым ліку і прыродны газ.

Э.В. — Але ці не імпартуеце вы гэту прадукцыю з Расіі?

— Ну так. І гэта наша бяда гістарычная, што мы залежныя па сыравіне, перш за ўсё, амаль на 100 працэнтаў, па вуглевадародах, ад Расіі.

Э.В. — Вы ў асноўным вашы тавары, якія вырабляеце ў Беларусі, экспартуеце ў Расію?

— Не. 47 працэнтаў — у Расію, а астатняе — у Еўрасаюз і іншыя дзяржавы.

Раней было — 85 працэнтаў мы экспартавалі ў Расію. Гэта значыць, мы спрабуем дыверсіфікаваць свае пастаўкі.

ЛУКАШЭНКА ПАРАІЎ НЕ ДЭМАНІЗАВАЦЬ УЛАДЗІМІРА ПУЦІНА

Э.В. — Што датычыцца прэм'ер-міністра Пуціна. Якія стасункі Вы з ім маеце, як Вы з ім узаемадзейнічаеце? У Вас добрыя адносіны? Ці падаецца Вам, што Пуцін зноў стане Прэзідэнтам Расіі?

— Па-першае, Прэзідэнтам Расіі стане той, каго абярэ расійскі народ. Па-другое, мы з Пуціным у вельмі добрых адносінах. Мы больш за дзесяць гадоў працуем разам. І раю вам не дэманізаваць Пуціна.

...Але хачу вам сказаць, што Пуцін не падабаецца амерыканцам, палітыкам у Злучаных Штатах Амерыкі, таму што гэта такі жорсткі чалавек, чалавек са стрыжнем унутраным, і які без ваганняў у любой сітуацыі будзе абараняць інтарэсы Расіі. Напэўна, гэта Амерыцы не падабаецца. Таму вы пачынаеце так паціху на яго навальвацца. ...Гэта чалавек, які заўсёды гатовы аказаць дапамогу. І калі ён паабяцае, ён зробіць. Таму вы спрабуйце з ім дамовіцца. Спрабуйце, калі хочаце, у яго выбіць гэта абяцанне. Калі ён скажа «так, я гэта зраблю», ён абавязкова зробіць, у адрозненне ад Амерыкі або Еўропы.

Э.В. — Мне падалося, што летась нават намагаліся «перазагрузіць» адносіны.

— Вы спрабавалі і заўсёды спрабуеце адносіны «перазагрузіць» сабе на карысць. З Расіяй на такой мове, і з Пуціным у прыватнасці, размаўляць я вам не раю.

Э.В. — Вы мяркуеце, што ён зноў стане Прэзідэнтам?

— Калі ён гэтага захоча, цалкам магчыма, таму што ён у Расіі сёння адзін з вядучых палітыкаў. А па рэйтынгах ён усіх апярэджвае. Таму, цалкам магчыма, калі ён гэтага захоча. Калі ён захоча выставіць сваю кандыдатуру на будучых прэзідэнцкіх выбарах, ён выставіць яе. Я лічу, яны дамовяцца.

«Я НЕ ЗБІРАЮСЯ ГУЛЯЦЬ У ПАЛІТЫЧНЫЯ ГУЛЬНІ НІ З АМЕРЫКАНЦАМІ, НІ З ЕЎРАПЕЙЦАМІ»

— Ні з амерыканцамі, ні з еўрапейцамі я не збіраюся гуляць у якія-небудзь палітычныя гульні. Таму што вашы палітыкі і заходнікі паказалі сябе вельмі непрыстойнымі. Усё, што яны абяцалі, — яны падманулі нас! Калі вы хочаце з намі супрацоўнічаць на нармальных прынцыпах — мы гатовы супрацоўнічаць. Не хочаце — абыдземся без вас.

Калі вы зацікаўлены супрацоўнічаць, давайце будзем шукаць шляхі, а не выстаўляйце нам сваю інтэрпрэтацыю дэмакратыі і ўмовы гэтай дэмакратыі. Дэмакратыя — рэч універсальная. Як улада народа — мы разумеем. А тое, што вы навешалі на дэмакратыю сваё разуменне, і з гэтым трафарэтам лезеце ў кожны дом — гэта не да твару амерыканцам, — лічыць беларускі лідар. — Прытым у вас адна дэмакратыя для Расіі і для Беларусі, у вас іншая дэмакратыя для Еўрапейскага саюза, трэцяя дэмакратыя для Кітая, чацвёртая — для Ірана, Венесуэлы. Пятая дэмакратыя, як аказалася сёння, для Ізраіля і шостая — для арабскай дугі. Вось ваша дэмакратыя.

...Чаму вы парушылі нашы дамоўленасці 1994 года, калі мы без усялякіх умоў перадалі ядзерную зброю таму, каму вы хацелі?! Вы абяцалі, што ніколі не прыменіце да нас эканамічныя санкцыі. Чаму вы іх прымяняеце? Хто вам будзе пасля гэтага верыць? Ваш Прэзідэнт падпісаў гэта пагадненне. Чаму вы прымяняеце да нас эканамічныя санкцыі?

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што і цяпер Беларусь адкрыта для супрацоўніцтва з ЗША і Еўропай.

— Гэта вы ад нас закрываецеся. Мы што вам забараняем уезд у Беларусь? Не! Гэта вы забараняеце нам уезд у Амерыку. Мы вам не пагражаем эканамічнымі санкцыямі. Гэта вы нам пагражаеце эканамічнымі санкцыямі! Гэта вы нас папракаеце ў тым, што мы супрацоўнічаем з Венесуэлай, Іранам, Кітаем, Расіяй! А што нам застаецца рабіць?

Калі вы хочаце з намі супрацоўнічаць як дэмакратычная Амерыка, як імперыя сусветная, давайце садзіцца за стол і будзем супрацоўнічаць.

БЕЛАРУСЬ ХАЦЕЛА Б МЕЦЬ ДОБРЫЯ АДНОСІНЫ З ЗША

На завяршэнне сустрэчы Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь хацела б мець добрыя адносіны са Злучанымі Штатамі Амерыкі, «калі гэтага хочаце вы».

— Але мы нікому не дазволім ставіць перад намі нейкія нерэальныя задачы і ўмовы, у тым ліку амерыканцам. Можа яшчэ і таму, што ў гады Другой сусветнай вайны, калі мы былі з вамі па адзін бок барыкад, мы паклалі на алтар перамогі над фашызмам трэць нашага насельніцтва. І толькі за гэта вы павінны нас паважаць.

Прэзідэнт таксама папрасіў не дэманізаваць ні яго, ні Беларусь.

— Мы цалкам нармальныя людзі. Ніколькі не горшыя, чым амерыканцы. І сітуацыя ў нашай краіне, і жыццё ў нашай краіне абсалютна спакойныя, дзе кожны чалавек можа маліцца свайму Богу, рэалізоўваць свае нацыянальныя і палітычныя інтарэсы, свабодна будаваць сваё жыццё. ...Мы стабільная і спакойная краіна. І гэта людзі цэняць.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў перадаць амерыканцам, што ў Беларусі да іх вельмі добра ставяцца, любяць і паважаюць.

— Мы ніколі сабе не дазволім узводзіць жалезную заслону, каб яны не маглі да нас прыехаць. Мы вас будзем чакаць тут, як самых лепшых сяброў. Прыязджайце да нас з дабром!

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 сакавіка 2011 г. № 9 (247)

Замчышча, фальварак і мястэчка...

У беларускай глыбінцы дзякуючы намаганням мясцовых улад будзе створаны сучасны комплекс адпачынку і аздараўлення на ўзроўні «пяцізоркавага» атэля. Такога комплексу турыстычных і аздараўленчых паслуг на вышэйшым узроўні на Віцебшчыне яшчэ не было. Як сцвярджаюць інвестары і аўтары праекта, комплекс зможа смела канкурыраваць з аналагічнымі ў Еўропе.

Пабываць на старажытным замчышчы, на тыповай для Беларусі гарадской плошчы з лаўкамі рамеснікаў, павеславаць у адноўленай ладдзі, наведаць традыцыйныя яўрэйскае мястэчка, татарскую слабаду, беларускую вёску, польскую сядзібу, фальварак — усё гэта і не толькі ўжо хутка з'явіцца адразу ў адным месцы — ля вёскі Пліса Глыбоцкага раёна. Тут, на базе збудаванняў былой вайсковай часці ракетчыкаў, ствараецца насамрэч унікальны комплекс для аздараўлення і прыёму турыстаў, разлічаны на адначасовы прыём каля 600 чалавек. Гасцям прапануюць як аздараўленчы адпачынак, так і экскурсійны — на выхадныя і святочныя дні.

Што тычыцца замчышча, праекціроўшчыкі і будаўнікі пастараюцца зрабіць копіі прыпадтрымцы навукоўцаў, каб дасягнуць аўтэнтычнасці. А пры стварэнні нацыянальных пасяленняў зробяць дамы з аднаўленнем атмасферы быту. Таксама пабудуюць у мініяцюры кірху, мячэць, царкву і гэтак далей. У карчме — а іх з'явіцца некалькі — можна будзе пакаштаваць стравы нацыянальных кухняў.

Праектаваннем сёння займаюцца мінскія спецыялісты, а інвестарам стала вядомая будаўнічая фірма — таксама са сталіцы. Яна ж возьме на сябе асноўную частку будаўнічых работ. У выніку таксама будзе створана каля ста новых рабочых месцаў.

На тэрыторыі цэнтра плануецца арганізаваць натуральную сялянскую гаспадарку, якая будзе забяспечваць прадуктамі харчавання адпачывальнікаў. Ёсць ідэя стварыць і вінакурню.

Сярод іншых цікавых «кропак» будучага цэнтра аздараўлення і турызму — востраў. Існуе легенда, што менавіта тут у свой час схавалася знакамітая княжна Рагнеда. Востраў, які знаходзіцца на адлегласці каля 150 метраў ад берага, будзе даследаваны археолагамі, а гісторыкі пастараюцца адшукаць адпаведныя пацвярджэнні...

Усе работы завершаць у 2014 годзе. А прыняць першых наведвальнікаў плануецца яшчэ раней. Каб рэалізаваць усе ідэі, спатрэбіцца не адзін дзясятак мільярдаў рублёў. Інвестар укладвае свае грошы і плануе карыстацца банкаўскімі крэдытамі. Шукаюць і партнёраў. Аўтары цікавай ідэі, безумоўна, знойдуць аднадумцаў для яе рэалізацыі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

ВАШ РЭЙС ЗАТРЫМЛІВАЕЦЦА...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У мінулы аўторак, 1 сакавіка, мікрааўтобус, які выконваў міжгародні рэйс «Мінск—курортны пасёлак Нарач» (час адпраўлення з аўтавакзала «Маскоўскі» — 10.10), быў нечакана затрыманы. Вадзіцель, які прыбыў на пункт адпраўлення своечасова і гатовы быў рушыць у дарогу ў адпаведнасці з раскладам, не змог патлумачыць пасажырам прычыну гэтай затрымкі. Людзі, пераважная большасць якіх ехала на адпачынак, не дачакаліся дакладных тлумачэнняў і ад адміністрацыі вакзала...

Дазвол на адпраўленне вадзіцель мікрааўтобуса атрымаў прыкладна праз паўгадзіны, калі нервы пасажыраў былі ўжо парадкам «накручаныя». Абураныя такім стаўленнем, людзі звярнуліся ў рэдакцыю: маўляў, паўсюдна гаворыцца пра выкананне сацыяльных стандартаў, пра паляпшэнне якаснага ўзроўню жыцця, а тут... Мала таго, што відавочна быў парушаны расклад руху, дык яшчэ і сам мікрааўтобус аказаўся не прыстасаваным да праезду з багажом — сумкамі і чамаданамі быў застаўлены ўвесь праход. Не дай Бог што здарылася б — нават выйсці немагчыма! «Ніхто не патрабуе ад транспартнікаў забеспячэння шыкоўных умоў, але выконваць элементарнае (а не псаваць людзям настрой) яны, напэўна, маглі б», — сказаў адзін з пасажыраў таго рэйса.

У першую чаргу я звязалася з кіраўніком прыватнага транспартнага ўнітарнага прадпрыемства «Крывічы-Аўта» Мядзельскага раёна, якое (на ўмовах дамоўленасці са сталічным аўтавакзалам) забяспечвала гэты рэйс, **Яўгенам ЖУРАЎСКІМ**.

— Часам такія затрымкі рэйсаў сапраўды адбываюцца, але не па нашай віне, — патлумачыў Яўген Раманавіч. — Мая задача — адправіць мікрааўтобус у рэйс, што і было зроблена. Вадзіцель прыбыў на вакзал своечасова, да 10.10 (час адпраўлення) і здаў пуцявы ліст у дыспетчарскую. Але ён не мае права пачаць рух, пакуль яму не аддадуць гэты пуцявы ліст назад. Наступны па часе рэйс да пасёлка Нарач **(на 10.40 — Н. К.)** звычайна выконвае Мядзельскі аўтапарк № 7 Мінскаблаўтатранса, інакш кажучы, дзяржаўнае прадпрыемства. Калі па нейкіх прычынах яно не ў стане гэта зрабіць, то дыспетчар ці аддзел перавозак аўтавакзала затрымліваюць адпраўленне майго мікрааўтобуса, каб пасадзіць у яго людзей, якія ўзялі білеты на 10.40. Людзі ж ні ў чым не вінаватыя, іх трэба давезці да пункта прызначэння.

Зразумела, гэта выклікае незадаволенасць пасажыраў затрыманага мікрааўтобуса. Але мне, прыватніку, спрачацца з дзяржструктурай не выпадае. Галоўнае, каб колькасць пасажыраў не перавышала колькасць месцаў у салоне.

Што датычыцца багажных месцаў, яны ў такіх мікрааўтобусах сапраўды не прадугледжаны, сказаў Яўген Жураўскі. Але пасажыру падчас пакупкі білета павінны гэта патлумачыць. І ўжо ён сам будзе вырашаць, якому транспартнаму сродку аддаць перавагу — прыватнаму ці дзяржаўнаму.

— Можа, у салонах маіх «маршрутак» і бывае цеснавата з-за багажу, затое ў рэйсы мы выходзім без збояў, — запэўніў Яўген Жураўскі.

Дырэктар Мядзельскага аўтапарка № 7 прадпрыемства «Мінаблаўтатранс» **Мікалай БЯЛЯЦКІ** быў настроены не так аптымістычна.

— Стан матэрыяльна-тэхнічнай базы нашага аўтапарка пакідае жадаць лепшага. Рэйсы з Мінска да пасёлка Нарач выконваюць невялікія аўтобусы, разлічаныя на 28 ці 35 месцаў, якія перыядычна выходзяць са строю. Але ж трэба мець на ўвазе, што яны абслугоўваюць не толькі названы маршрут, а і ўвесь Мядзельскі раён — такім чынам выконваюцца сацыяльныя стандарты ў сельскай мясцовасці. Здараецца, што аўтобус і ўвогуле праходзіць пустым па тым ці іншым маршруце, але паколькі ёсць стандарт, ён павінен выехаць у рэйс нават без пасажыраў. Да прыватных транспартных прадпрыемстваў такія заданні не даводзяць. Таму і праблемы з паломкамі ў нас узнікаюць часцей. Адмоўна ўплываюць на тэхнічны стан нашых аўтобусаў і цяперашнія ўмовы надвор'я, мінусавая тэмпература. Стараемся, безумоўна, адрэагаваць своечасова, замяніць няспраўны транспартны сродак. Але не заўсёды атрымліваецца. Усё ўпіраецца ў недахоп фінансаў... Сёлета набылі мікрааўтобус Пежо Баксёр для пасажырскіх перавозак, але такі ў нас пакуль што толькі адзін. Калі ўлічыць, што рэйсы на Нарач запатрабаваныя, асабліва летам, нядрэнна было б да сезона папоўніць наш аўтапарк тэхнікай, павялічыць колькасць рэйсаў, магчыма, прадугледзіць нават чартарныя рэйсы, каб людзям было больш зручна. Будзем думаць, узгадняць свае прапановы з Мінаблаўтатрансам.

Начальнік аддзела перавозак сталічнага аўтавакзала «Маскоўскі» **Юлія СТАРАВОЙТАВА** лічыць, што маршрут «Мінск — курортны пасёлак Нарач» запатрабаваны толькі ў сезон, летам. Цяпер жа, пакуль сезон яшчэ не пачаўся, транспарту на Нарач ходзіць нават больш чым дастаткова.

— Здараюцца, праўда, непрадбачаныя сітуацыі, як гэта адбылося 1 сакавіка. Аўтобус Мядзельскага аўтапарка № 7, які павінен быў у 10.40 выехаць па маршруце «Мінск — курортны пасёлак Нарач», зламаўся. Каб забраць пасажыраў, якія не пажадалі здаць білеты, мы вымушаныя былі аб'яднаць два рэйсы ў адзін. Таму і затрымалі мікрааўтобус, які паводле раскладу павінен ад'язджаць у 10.10 — хацелі дачакацца пасажыраў наступнага рэйса... Праблема заключалася ў тым, што перавозчык — у нашым выпадку аўтапарк № 7 Мінаблаўтатранса — не здолеў прадаставіць ніякага транспартнага сродку. Хоць павінен быў паклапаціцца пра яго замену... У гэтай сітуацыі аўтавакзал аказаўся тым «звяном», якое павінна было вырашаць пытанне з дастаўкай пасажыраў. Мы выходзілі з сітуацыі так, як, на наш погляд, было лепш для людзей. У адпаведнасці з дагаворам, да аўтапарка № 7 Мінаблаўтатранса будуць прад'яўлены штрафныя санкцыі.

А наконт нязручнасцяў з багажом... Праблема перавозчыка заключаецца ў тым, што сёння правоз багажу ніхто правіламі аўтамабільных перавозак адмяніць не можа. Няма такога паняцця, як «маршрутка» — ёсць «аўтобус малой умяшчальнасці» або «аўтобус вялікай умяшчальнасці». І калі пасажыр хоча ехаць пэўным рэйсам, яму не скажаш: у вас, маўляў, вялікі багаж, таму вам лепш дачакацца іншага аўтобуса. Людзям хочацца даехаць да пункта прызначэння хутчэй, і мы імкнёмся дапамагаць ім у межах сваіх магчымасцяў.

Наталля КАРПЕНКА.

МЯСЦОВЫ ЧАС

Не патонуць, дык выплывуць?

Вясковым прадпрымальнікам не хапае інфармаванасці і прававых ведаў

Вёску Ляўкова Талачынскага раёна можна аднесці да глыбінкі. Да раённага цэнтра Талачын і буйнога горада Оршы дарога адсюль няблізкая. Пражывае ў Ляўкове 57 жыхароў. Большасць — пенсіянеры. А працаздольныя — іх 12 чалавек — працуюць у мясцовым сельгаспрадпрыемстве ці на дзяржаўных прадпрыемствах суседняга пасёлка Коханава. Выбіраюць пакуль менавіта такі род дзейнасці і паранейшаму ігнаруюць магчымасць заробку з асабістай падсобнай гаспадаркі. На падворках трымаюць жыўнасць толькі для сваіх патрэб, і ў асноўным драбязу: птушак ці свіней. Карова на ўсю вёску засталася адна — у пенсіянераў, якім улетку актыўна дапамагаюць нарыхтоўваць кармы дарослыя дзеці.

Вяскоўцы як вяскоўцы. Забяспечваюць сябе гароднінай і часткова — мясам. Лішкі сваёй прадукцыі рэалізоўваць развучыліся, бо нявыгадна: кааперацыя неразвітая, на рынак у горад вазіць далёка... На погляд старэйшыны вёскі Леаніда Зуева, адбівае ахвоту гаспадарыць на зямлі і прававая недасведчанасць. Людзі не ведаюць нават, куды звярнуцца, каб спытаць: якія ў іх, як гаспадароў сялянскага падворка, правы? Дзе можна ўзяць крэдыт пад нізкі працэнт і на якіх умовах? Як законна рэалізаваць сваю прадукцыю?

Але, на думку таго ж старэйшыны, не ўсё так безнадзейна.

У вёсцы пустуе частка дамоў. Каля іх — з дзясятак зямельных участкаў, якія ніхто не засявае. Прадпрымальны вясковец мог бы выкарыстаць зямлю пад пашу для кароў ці пад агароды. Мясцовая ўлада была б толькі рада, каб участкі не зарасталі пустазеллем. Расказаў старэйшына і пра тое, што ў Ляўкова два гады таму прыязджая сям'я ператварыла свой падворак у цяплічную гаспадарку і намагаецца зарабіць на пражыццё продажам прадукцыі, якую вырошчвае ў цяпліцах. Мясцовыя жыхары ўважліва назіраюць, ці атрымаецца што ў Шаблавінскіх. Калі ў бліжэйшыя год-два ўбачаць прыкметы іх заможнага жыцця, можа, тады і знойдуцца ахвотнікі пераняць гэткі спосаб гаспадарання.

* * *

Сядзібу Шаблавінскіх у вёсцы лёгка пазнаць па шарэнзе плёначных цяпліц. Гаспадыню Валянціну Мікалаеўну сустрэла якраз на падворку.

Вырошчваць агуркі і памідоры ў цяпліцах і тым самым зарабляць на жыццё прымусіла яе бяда: захварэў муж, кармілец сям'і. У свой час Уладзімір Іосіфавіч жыў з упэўненасцю, што мужчына павінен забяспечваць сям'ю матэрыяльна, а жонцы не трэба працаваць: ёй хопіць клопату з выхаваннем дваіх дзяцей. Таму ездзіў на заробкі ў Расію, будаваў дамы, і сям'я не адчувала недахопу сродкаў. Ды раптам дало збой сэрца, пра заробкі за мяжой прыйшлося забыць. Урачы наогул забаранілі Уладзіміру Іосіфавічу напружана працаваць. Давялося Валянціне Мікалаеўне задумацца над тым, якім чынам яна зможа ўтрымліваць сям'ю (дваіх дзяцей-школьнікаў і мужа). Працаўладкавацца на дзяржаўным прадпрыемстве было нерэальна: карэнныя жыхары — і тыя не ўсе ўладкоўваюцца, а Валянціна Шаблавінская, прыезджая, мела яшчэ менш шанцаў. Вось і ўзялася яна за вырошчванне агуркоў ды памідораў. Ідэю абдумалі ўдваіх з мужам. Слушныя парады далі шклоўскія агароднікі, з якімі пазнаёміліся на аршанскім рынку. Знайшлі нават і кандыдата сельскагаспадарчых навук, які спецыялізуецца «на агурках». Ён расказаў, якія гатункі лепш пладаносяць на мясцовай глебе, пагадзіўся кансультаваць сям'ю і ў працэсе вырошчвання гародніны. Пасля гэтага Уладзімір Іосіфавіч, зарэгістраваўшыся як індывідуальны прадпрымальнік, звярнуўся ў раённы цэнтр занятасці па субсідыю пад цяплічную гаспадарку.

«Людзі не ведаюць, якія ў іх, як у гаспадароў сялянскага падворка, правы? Дзе можна ўзяць крэдыт пад нізкі працэнт? Як законна рэалізаваць сваю прадукцыю?

Шаблавінскім выдзелілі крыху больш за два мільёны рублёў. На гэтую суму яны закупілі плёнку і насенне. На дзесяці сотках паставілі дзесяць цяпліц. У некаторых з іх склалі пячуркі з цэглы, каб высаджваць расаду як мага раней. І вось ужо два сезоны пастаўляюць на мясцовы рынак агуркі і памідоры. За гэты час вярнулі дзяржаве два мільёны і плацяць падатак за той перыяд рэалізацыі прадукцыі.

* * *

Праўда, за два гады сям'я не разбагацела. Жывуць Шаблавінскія сціпла, лічачы кожную капейку. Праўда, з выручкі другога сезона купілі дзецям новую вопратку, а сабе — танную машыну, каб вазіць агародніну на бліжэйшыя рынкі. Відавочна, што нялёгка ім развіваць сваю справу, але прыпыняцца сям'я не збіраецца.

Цяпер Шаблавінскія ведаюць, якой вышыні цяпліцы трэба рабіць, як паліваць і чым угнойваць глебу... Але, па словах гаспадыні, чым больш спазнавалі агародніцкую справу, тым больш праблем вызначалася на будучыню.

Аказалася, што мала вырасціць ураджай — трэба ўмець аператыўна і выгадна яго рэалізаваць. Неабходна загадзя шукаць пакупнікоў — прадпрыемствы і арганізацыі — якія набудуць частку гародніны оптам, заключаць дагавор аб пастаўках. Без крэдыту цяплічную гаспадарку таксама не пацягнуць, бо трэба прыдбаць элементарныя тэхнічныя прыстасаванні. З гэтай мэтай сёлета наведаліся Шаблавінскія ў філіял банка. А ім адказалі, што крэдыт могуць даць толькі пад 20 працэнтаў гадавых — як прадпрымальнікам. Шаблавінскія ж палічылі, што пад 20 працэнтаў крэдыт ім не вытрымаць. Праўда, нядаўна прачыталі ў газеце, што на развіццё асабістай падсобнай гаспадаркі можна ўзяць крэдыт пад 5 працэнтаў у філіяле «Белаграпрамбанка». На такія ўмовы яны згодныя і сёлета паспрабуюць здзейсніць сваю мару.

Валянціна Мікалаеўна перажывае, што ім з мужам не хапае прававых ведаў, а таксама інфармацыі пра рынкі збыту, дзе можна рэалізаваць сваю прадукцыю. Гэтыя веды нялёгка здабыць, жывучы ў «глыбінай» вёсцы, як у вакууме.

Станоўчы бок гаспадарання на зямлі, на думку Шаблавінскіх, заключаецца ў тым, што іх сям'я жыве адной мэтай. Галоўным у доме па-ранейшаму застаецца гаспадар. Ён кіруе сям'ёй, генерыруе ідэі і рэалізуе іх з дапамогай жонкі і дзяцей. Акрамя агуркоў і памідораў, сям'я плануе падчас чарговага сезона вырошчваць капусту. Спрабуюць замацавацца і ў пчалярстве — на працягу двух гадоў трымаюць тры вуллі пчол для апылення кветак агуркоў і памідораў. Калі напрактыкуюцца ў гэтай справе, то зробяць спробу пашырыць і яе...

Вольга ШУТАВА.

Выратуй і захавай

Нядобраўпарадкаванасць, закопчаныя сцены, дым ад цыгарэт, затхлы пах. Такім убачылі дом у вёсцы Заходы Шклоўскага раёна супрацоўнікі МНС, якія прыйшлі з мэтай прафілактыкі ў сям'ю. Яны не маглі паверыць, што ў такіх антысанітарных умовах, сярод смецця, жывуць людзі! І нягледзячы на тое, што на гадзінніку яшчэ не было і 11 гадзін раніцы, але ўсе ў доме ўжо п'яныя і нават агрэсіўныя.

— Але самая страшная карціна адкрылася потым: на ложку, загорнутая ў коўдру, дрыжала ад холаду і страху 8-гадовая дзяўчынка, дачка гаспадароў хаты, — паведаміла **інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Магілёўскім абласным упраўленні МНС Вольга НЕХАРОШЫХ**. — Малая настолькі перапалохалася — нават кінулася пераконваць усіх у тым, што маці клапоціцца пра яе і корміць. Аднак пусты халадзільнік, халодная печка і вільготныя сцены ў доме, поўным п'яных людзей, абвяргалі ўсе добрыя словы. Таму камісія прыняла рашэнне забраць дзіця з сям'і: дзяўчынку пад сваю апеку ўзяла родная цётка.

Выратавальнікі МНС задаюцца пытаннем, колькі яшчэ маленькіх дзяцей вымушаны жыць у голадзе, холадзе і страху перад нецвярозымі бацькамі? Пра якую бяспеку можна гаварыць, калі людзі п'юць і потым засынаюць з цыгарэтай у руках, пры гэтым рызыкуючы не толькі сваім жыццём, але і іншых?

Сёлета ў Магілёўскай вобласці ўжо сталі ахвярамі агню 62 чалавекі, прычым больш за 85% з іх былі ў стане алкагольнага ап'янення.

Ілона ІВАНОВА.

ВЯЗЫНСКІ «ЭКСПЕРЫМЕНТ»

СЕЛЬСАВЕТ З ЧАСОВЫМ «ІНТЭРНАТАМ»

На першы погляд, Вязынскі сельсавет — па ўсіх паказчыках даволі «сярэдні». І ўсё ж ён мае сваю асаблівасць: з 33 населеных пунктаў 23 — зусім невялікія. Пераважную большасць насельніцтва малых вёсак складаюць пажылыя і часта адзінокія людзі.

— Шмат хто з пенсіянераў і інвалідаў карыстаецца паслугамі нашых сацыяльных работнікаў, іх паслугі запатрабаваныя, але гэта — толькі частковае вырашэнне праблемы догляду, — адзначае **дырэктар Вілейскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Людміла СЛЯПЦОВА**. — У лепшым выпадку сацыяльны работнік будзе знаходзіцца ў хаце па паўтары гадзіны пяць разоў на тыдзень. Увесь астатні час даводзіцца быць сам-насам.

Ёсць і яшчэ адзін шлях — пераезд у дом-інтэрнат для састарэлых. Пры жаданні вялікіх пытанняў з афармленнем сюды не ўзнікне. Але гэты варыянт далёка не лепшы. Назаўсёды з'ехаць з мясцін, дзе прайшло жыццё, наважыцца далёка не кожны.

— Мы думалі, як падтрымаць гэтых людзей, і ў рэшце рэшт з'явілася ідэя стварыць для адзінокіх пенсіянераў дом сезоннага пражывання, прычым не дзе-небудзь у Вілейцы, а бліжэй да людзей — у цэнтры свайго ж сельсавета, — распавядае Людміла Сляпцова. — Загадзя мы правялі своеасаблівы маніторынг па ўсіх сельсаветах раёна і высветлілі — гэту ідэю падтрымліваюць 85 працэнтаў вяскоўцаў. Вось і давялося пераканацца, што попыт тут сапраўды ёсць, і попыт значны.

У якасці эксперыменту дом сезоннага пражывання было вырашана адчыніць у Вязыні. Прычын аказалася некалькі. Па-першае, у адрозненне ад невялікіх вёсак, тут ёсць уся неабходная інфраструктура, у тым ліку крама, ФАП і клуб. Па-другое, у Вязыні аказаўся незапатрабаваным будынак былой бібліятэкі. І яшчэ: стварэнне дома сезоннага пражывання актыўна падтрымаў мясцовы сельсавет, які шмат у чым і скаардынаваў усю падрыхтоўчую работу.

У абсталяванне былога будынка бібліятэкі прыйшлося ўкласці грошы — на гэта былі выдаткаваныя сродкі аддзела занятасці раённага ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Кіраўніцтва раёна падтрымала і з пракладкай водаправода. Аднак пры гэтым давялося задзейнічаць і некаторыя «дадатковыя рэзервы». Скажам, для набыцця ў дом сезоннага пражывання тэлевізара, халадзільніка, прадметаў першай неабходнасці знайшліся спонсары. Дапамогу ў нарыхтоўцы бульбы і агародніны аказала сельгаспрадпрыемства. А дробны рамонт узяў на сябе сельсавет.

Па сутнасці, гэтым выдаткі і абмежаваліся. Было вызначана: жыхары дома сезоннага пражывання за кошт сваіх пенсій вядуць сумесны бюджэт, цалкам аплачваюць уласнае харчаванне і камунальныя паслугі.

— Першыя жыхары з аддаленых вёсак Вязынскага сельсавета з'явіліся тут у лістападзе мінулага года. На той момант у доме былі абсталяваныя пакоі, гасцёўня, кухня і санвузел. А далейшым плануецца таксама ўстанавіць душавую кабіну, — заўважае Людміла Сляпцова. — Але трэба падкрэсліць адразу, што гэта — не інтэрнат у класічным разуменні. Для жыхароў дома сезоннага пражывання не існуе ніякіх рамак, ніякага строгага распарадку. Ім проста даецца памяшканне з лістапада па красавік, а свой вольны час і свае справы яны плануюць цалкам самастойна. І гэтаксама ў любы час яны могуць наведаць сваю хату ў роднай вёсцы. Адно, што ў дом сезоннага пражывання пяць разоў на тыдзень прыходзіць сацыяльны работнік — каб дапамагчы пажылым людзям весці хатнюю гаспадарку.

Ніхто не хавае, што першым часам да дома сезоннага пражывання некаторыя ставіліся з недаверам, а хтосьці — нават скептычна. Аднак добраахвотнікі перазімаваць тут знайшліся. І пра гэта цяпер ніхто не шкадуе. Таму ў тэрытарыяльным цэнтры адзначаюць: эксперымент у Вязыні працягнецца і наступнай зімой. А, магчыма, ён знойдзе падтрымку і ў іншых сельсаветах раёна.

— Перавага дома сезоннага пражывання ў тым, што ён знаходзіцца блізка ад родных мясцін вяскоўцаў, таму не парушаецца іх звыклы лад жыцця, захоўваецца магчымасць сустрэч са сваякамі, сябрамі, суседзямі і былымі калегамі, а вясной ёсць магчымасць вярнуцца ва ўласную хату, да прысядзібных участкаў, — кажа Людміла Сляпцова. — Разам з тым мы лічым, што ў аказанні сацыяльных паслуг трэба ісці далей, неабходна шукаць новыя падыходы. У прыватнасці, з'явілася яшчэ адна не менш цікавая задума на будучыню: прапанаваць адзінокім пажылым грамадзянам, якія маюць праблемы са здароўем, пажыць зімой у прыёмных сем'ях больш маладых пенсіянераў — зноў жа з вядзеннем сумеснага бюджэту. Прычым людзі, якія хацелі б прымаць у сябе гасцей на пэўны час, у раёне ёсць. І справа не ў тым, што, магчыма, гаспадарам у якасці заахвочвання будзе выплачвацца чвэрць стаўкі сацыяльнага работніка. Больш маладыя пенсіянеры падтрымліваюць саму ідэю перш-наперш па іншай прычыне: жыць разам заўжды прасцей і весялей.

Сяргей ГРЫБ.

Вілейскі раён.

ПАЎТАРЫ ТОНЫ СПІРТУ

затрымана ў вёсцы Свяцілавічы Веткаўскага раёна падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікамі міліцыі сумесна з падаткавікамі Гомеля. «Мерседэс-Бэнц», якім кіраваў беспрацоўны жыхар Брэсцкай вобласці, перавозіў 320 ёмістасцяў па 5 літраў кожная без акцызных марак і суправаджальных дакументаў. Падаткавікі праводзяць праверку наконт паходжання 1600 літраў празрыстай вадкасці з характэрным пахам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЖАНОЧЫ РАМАН З ДАСТАЎКАЙ ДАХАТЫ

Пяць выездаў — 148 чытачоў!

Сёлета з пачатку лютага па Гродзенскім раёне пачаў курсіраваць бібліёбус — так называецца перасовачная бібліятэка, якая абслугоўвае, як правіла, жыхароў аддаленых вёсак. Купілі за кошт сродкаў абласнога бюджэту мікрааўтобус, склалі графік выездаў па трынаццаці маршрутах. Вось толькі ці будзе запатрабаваная гэтая паслуга? Мо не надта яна вяскоўцаў і цікавіць?

За адказам дырэктар раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Галіна Дзятчык запрашае нашага карэспандэнта ў чарговы, пяты па ліку, рэйс бібліёбуса — на гэты раз па населеных пунктах Азёрскага сельсавета. Разам з намі — Тэрэса Гулеўская, якая ўжо 39 гадоў займаецца бібліятэчнай справай менавіта ў гэтым раёне і цяпер спецыяльна замацаваная за бібліёбусам, і загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Тамара Сарадоева.

Што ўяўляе сабой перасовачная бібліятэка? Гэта мікрааўтобус «Газэль», які акрамя пасажырскіх месцаў, абсталяваны шафай для кніг. У кожнай шуфлядцы — свая тэматыка: «Класіка», «Дэтэктывы», «Жаночыя раманы», «Фантастыка», «Літаратура для дзяцей», «Часопісы». Увогуле па маршруце, які ўключае ў сябе восем населеных пунктаў, у гэты дзень накіроўваецца больш за паўтысячы адзінак літаратуры. І гэта толькі невялікая частка фондаў бібліятэчнай сістэмы Гродзенскага раёна, дзе цяпер налічваецца каля 477 тысяч экзэмпляраў. Толькі летась набылі 12 тысяч выданняў, так бы мовіць, на любы густ. Было б толькі жаданне чытаць, а прапанова проста каласальная. Прычым не толькі ў цэнтральнай раённай, але і ў іншых бібліятэках, якіх на тэрыторыі раёна 27. Яны, дарэчы, працуюць у адной звязцы, і калі нейкага выдання няма ў адной бібліятэцы, то чытацкі заказ аператыўна выканаюць пры дапамозе іншай.

На першы погляд, маючы такую колькасць бібліятэк, не зусім лагічна траціць бюджэтныя грошы яшчэ і на бібліёбус, прымусу ж быць не павінна. Аднак загадчыца Азёрскай бібліятэкі Валянціна Салаўёва лічыць новую форму абслугоўвання вельмі патрэбнай. Так, у гэтай бібліятэцы шмат пастаянных чытачоў, многія жыхары прыходзяць самі, але нямала і такіх, у каго жаданне ёсць, ды магчымасці не дазваляюць, альбо цяжка даехаць. Валянціна Іванаўна, вядома, пра такіх людзей клапацілася, аднак паспрабуйце, не маючы ўласнага транспарту, пацягаць у руках гэтыя пакеты з кнігамі па аддаленых вёсках... А тут — дастаўка літаральна дахаты.

Валянціна Салаўёва сустракае бібліёбус каля крамы ў Стрыеўцы. Некаторыя вяскоўцы ўжо ведалі пра гэту навіну, чакалі бібліёбус і, як здалося, вельмі ўважліва ставіліся да выбару літаратуры. Прычым не толькі для сябе. Напрыклад, стараста вёскі Стрыеўка Зінаіда Баўбыр узяла некалькі жаночых раманаў, а для ўнучкі — казкі Андэрсэна і Уладзіміра Ліпскага. Мажліва, наступным разам будзе заяўка і ад яе мужа.

Прыкладна за паўгадзіны паслугамі бібліёбуса скарысталася сем чалавек, у тым ліку і дзве работніцы гэтай крамы. Бралі па пяць-сем экзэмпляраў, асаблівым жа попытам сярод кніг карысталіся, акрамя жаночых раманаў, дэтэктывы. А сярод часопісаў — «Вокруг света», «За рулём», «Алеся», «Гаспадыня»...

У асноўным такія ж прыярытэты былі і ў чытачоў, з якімі мы неўзабаве сустрэліся непасрэдна каля хат у Стрыеўцы. Людзі дзякавалі за такую паслугу («Малайцы, дай вам Бог здароўя!») і, зноў жа, вельмі зацікаўлена ставіліся да выбару літаратуры. А наш карэспандэнт у якасці «лікбезу» даведаўся, што, аказваецца, даволі запатрабаваным цяпер з'яўляецца не проста дэтэктыўны жанр, а менавіта дамскі дэтэктыў. Хоць цешыць і тое, што гэтым чытацкія інтарэсы не абмяжоўваюцца: пенсіянер Мікалай Аляксандравіч, напрыклад, узяў з бібліёбуса ажно сем гістарычных раманаў. Прычым і ён, і іншыя сяляне цікавіліся візітоўкамі бібліятэчных работнікаў. А значыць, працяг будзе?

...Потым у вёсцы Лакно і ў іншых населеных пунктах людзі цікавіліся не толькі жаночымі раманамі і дэтэктывамі, але і, напрыклад, літаратурай па трусагадоўлі. Наступным разам абвязкова прывязуць. Не застануцца без увагі і іншыя запыты, трэба толькі звязацца з раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай самому альбо праз мясцовага бібліятэкара ці старасту.

Увогуле ў той дзень паслугамі бібліёбуса скарысталася 25 чалавек, а за пяць рэйсаў — 148, людзям выдалі 1117 кніг і часопісаў. Прычым наладжана сувязь не толькі з асобнымі чытачамі, але і з установамі, напрыклад, для адзінокіх пажылых людзей. Літаратура выдаецца бясплатна. Хоць не выключаны і платны варыянт з мізэрнымі, можна сказаць, сімвалічнымі цэнамі. Калі будуць заяўкі на кнігі з так званага камерцыйнага фонду, на навінкі, дык гэта будзе каштаваць для вяскоўца ўсяго 250 рублёў за экзэмпляр.

— На тэрыторыі Гродзеншчыны ў значнай ступені захавалася хутарская сістэма, — кажа **дырэктар Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага Лідзія МАЛЬЦАВА**. — Адлегласць паміж паселішчамі дасягае трыццаці кіламетраў, таму абслугоўванне жыхароў аддаленых вёсак на працягу мінулага года ажыццяўлялася з дапамогай 65 бібліятэчных пунктаў і дзесяці бібліёбусаў. На канец года колькасць перасоўных бібліятэк павялічылася да пятнаццаці. Цяпер паслугамі бібліёбуса могуць карыстацца вяскоўцы Астравецкага, Ашмянскага, Бераставіцкага, Воранаўскага, Гродзенскага, Дзятлаўскага, Зэльвенскага, Іўеўскага, Карэліцкага, Лідскага, Мастоўскага, Навагрудскага, Свіслацкага, Слонімскага і Смаргонскага раёнаў.

Людзям аказваюцца не толькі бібліятэчныя паслугі. Супрацоўнікі перасовачнай бібліятэкі віншуюць іх з юбілеямі, святамі і іншымі значнымі падзеямі ў жыцці. Практыкуюцца сумесныя выезды бібліятэкараў і клубных работнікаў. Напрыклад, бібліёбус Навагрудскай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы ладзіць цыкл «Віншуем і жадаем», арганізоўвае сустрэчы з фельчарам ФАПа вёскі Неўда. Слонімскі бібліёбус прапанаваў жыхарам 36-ці аддаленых і маланаселеных вёсачак выставы (напрыклад, «Залатыя парады рыбалову»), агляды «На хвалі перыядычнага друку», дыялогі («Сям'я — ключ да шчасця»), гадзіны беларускай мовы («Спадчыны роднае слова»), акцыю-віншаванне да Дня пажылых людзей і г.д.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Открытое акционерное общество «ХОРОШЕЕ НАСТРОЕНИЕ»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2010 г.

млн руб.

АКТИВ	На конец отчетного года в млн руб.	ПАССИВ	На конец отчетного года в млн руб.
Основные средства:		Уставный фонд	83
первоначальная стоимость	4276	Добавочный фонд	2779
амортизация	1708	Непокрытый убыток	-215
остаточная стоимость	2568	Доходы будущих периодов	-
Нематериальные активы:	-	Прибыль (убыток) отчетного года	38
первоначальная стоимость	1	Краткосрочные кредиты и займы	-
амортизация	1	Кредиторская задолженность	30
остаточная стоимость	-		
Вложения во внеоборотные активы	-		
Запасы и затраты	28		
Налоги по приобрет. ценност.	-		
Дебиторская задолженность	113		
Денежные средства	6		
БАЛАНС	2715		2715

Открытое акционерное общество «ХОРОШЕЕ НАСТРОЕНИЕ»

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

млн руб.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	931	916
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	149	143
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	782	773
Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	626	533
Валовая прибыль (020-021-030)	040	156	240
Управленческие расходы	050		
Расходы на реализацию	060	60	147
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	070	96	93
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080		1
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081		
Операционные доходы, (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	0	1
в том числе: проценты к получению	091		
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092		
доходы от операций с активом	093		1
прочие операционные доходы	099		
Операционные расходы	100		10
в том числе: проценты к уплате	101		
расходы от операций с активами	102		1
прочие операционные расходы	109		9
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	0	-9
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130		4
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131		
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	0	4
Внереализационные расходы	150	8	42
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-8	-38
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (+/-070+/-120+/-160)	200	88	46
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210		11
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220		
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/-200+/-210+/-220)	240	88	57
Налог на прибыль	250	14	5
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	35	39
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	1	
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	300	38	2
Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310		
Прибыль (убыток) на акцию	320		
Количество прибыльных организаций / сумма прибыли	330		
Количество убыточных организаций / сумма убытка	340		

Руководитель Бернада Е.А.

Главный бухгалтер Страузова Н.В. УНП 100097687

ОАО «ВЕСТА», г. Витебск,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 24 марта 2011 года в 15 часов в актовом зале Витебского учебного центра профсоюзов по адресу: г. Витебск, ул. Правды, д. 8а.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах деятельности акционерного общества за 2010 год.
2. Об утверждении годового баланса и отчета о прибылях и убытках ОАО «Веста» за 2010 год.
3. Отчет Наблюдательного совета.
4. Отчет ревизионной комиссии.
5. Утверждение размера дивидендов за 2010 год.
6. Определение направлений использования прибыли общества в 2011 году.
7. Об уменьшении уставного фонда ОАО «Веста».
8. О внесении изменений в Устав ОАО «Веста» и утверждении Устава в новой редакции.
9. О внесении изменений в Положение о собрании акционеров ОАО «Веста».
10. О внесении изменений в Положение о Наблюдательном совете ОАО «Веста».
11. О внесении изменений в Положение о ревизионной комиссии ОАО «Веста».
12. О внесении изменений в Положение о порядке начисления и выплаты дивидендов по акциям акционерам ОАО «Веста».
13. О признании утратившим силу Положения о порядке начисления и использования фондов, образуемых за счет прибыли, ОАО «Веста».
14. Об утверждении Положения об использовании прибыли ОАО «Веста».
15. О внесении изменений в Положение об аффилированных лицах ОАО «Веста».
16. Выборы Наблюдательного совета общества.
17. Выборы ревизионной комиссии общества.
18. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета.
19. Об оказании спонсорской помощи.

УНП 300200651

Наблюдательный совет

ОАО «БЕЛЭНЕРГОАВТОМАТИКА»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 31 марта 2011 года в 14.00 ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ПО ИТОГАМ РАБОТЫ за 2010 год по адресу: г. Минск, ул. Омельянюка, 20, второй этаж, зал заседаний

Повестка дня:

1. Отчет о работе Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии в 2010 году.
2. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году и основных направлениях деятельности Общества в 2011 году.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков и распределение прибыли за 2010 год, с учетом заключения Ревизионной комиссии.
4. О направлении использования чистой прибыли Общества в 2011 году и первом квартале 2012 года.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. О внесении изменений и дополнений в устав Общества, изложив его в новой редакции.

С материалами можно ознакомиться по месту нахождения Общества в рабочие дни **с 22 по 30 марта 2011 года с 8.00 до 16.00.**

Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.00 по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 11 марта 2011 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100064414

Организация:

ОАО «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ»

Учетный номер плательщика: УНП 100347020
Вид деятельности: Ремонт, строительство
Организационно-правовая форма: Акционерное общество
Орган управления: Министерство связи
Единица измерения: млн руб.
Адрес: 220049, г. Минск, пер. Чайковского, 3

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	34 365	39 473
амортизация	102	19 752	23 175
остаточная стоимость	**110**	**14 613**	**16 298**
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	7	3
амортизация	112	6	2
остаточная стоимость	**120**	**1**	**1**
Доходные вложения в материальные ценности:			
первоначальная стоимость	121	-	-
амортизация	122	-	-
остаточная стоимость	**130**	**-**	**-**
Вложения во внеоборотные активы	**140**	**20**	**1 056**
В том числе: незавершенное строительство	141	20	1 056
Прочие внеоборотные активы	150	-	-
ИТОГО по разделу I	190	14 634	17 355
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	**210**	**2 962**	**3 816**
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	2 770	3 522
животные на выращивании и откорме	212	-	
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	8	
расходы на реализацию	214	-	
готовая продукция и товары для реализации	215	81	112
товары отгруженные	216	-	
выполненные этапы по незавершенным работам	217	-	
расходы будущих периодов	218	103	182
прочие запасы и затраты	219	-	
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	33	33
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	**230**	**-**	**-**
В том числе: покупателей и заказчиков	231	-	-
прочая дебиторская задолженность	232	-	-
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	**240**	**4 950**	**9 990**
В том числе: покупателей и заказчиков	241	4 636	8 492
поставщиков и подрядчиков	242	169	1 404
по налогам и сборам	243	61	38
по расчетам с персоналом	244	9	17
разных дебиторов	245	75	39
прочая дебиторская задолженность	249	-	
Расчеты с учредителями	**250**	**-**	**-**
В том числе: по вкладам в уставный фонд	251	-	-
прочие	252	-	-
Денежные средства	**260**	1 835	1 482
В том числе: денежные средства на депозитных счетах	261	100	3
Финансовые вложения	**270**	251	250
Прочие оборотные активы	**280**	8	29
ИТОГО по разделу II	**290**	**10 039**	**15 600**
БАЛАНС (190 + 290)	**300**	**24 673**	**32 955**

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	**410**	993	993
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	**411**	**-**	-
Резервный фонд	**420**	**88**	**100**
В том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством	421	-	-
резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами	422	88	100
Добавочный фонд	**430**	15 278	17 927
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	**440**	**-**	
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	**450**	3 992	4 686
Целевое финансирование	**460**	**-**	
Доходы будущих периодов	**470**	78	88
ИТОГО по разделу III	**490**	**20 429**	**23 794**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	**510**	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	**520**	-	-
ИТОГО по разделу IV	590	-	-
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	**610**	50	
Кредиторская задолженность	**620**	**4 183**	**9 148**
В том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	2 677	4 866
перед покупателями и заказчиками	622	151	2 472
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	708	913
по прочим расчетам с персоналом	624	5	14
по налогам и сборам	625	409	523
по социальному страхованию и обеспечению	626	198	298
по лизинговым платежам	627	-	
перед прочими кредиторами	628	35	62
Задолженность перед участниками (учредителями)	**630**	**11**	**13**
В том числе: по выплате доходов, дивидендов	631	11	13
прочая задолженность	632	-	-
Резервы предстоящих расходов	**640**	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	650	-	-
ИТОГО по разделу V	690	4 244	9 161
БАЛАНС (490 + 590 + 690)	**700**	**24 673**	**32 955**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701	-	-
краткосрочная кредиторская задолженность	702	4 183	9 148

АКТИВЫ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства	001	-	123
Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение	002	-	-
Материалы, принятые в переработку	003	211	284
Товары, принятые на комиссию	004	-	
Оборудование, принятое для монтажа	005	-	
Бланки строгой отчетности	006	2	2
Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов	007	43	55
Обеспечения обязательств и платежей полученные	008	-	
Обеспечения обязательств и платежей выданные	009	-	
Амортизационный фонд воспроизводства основных средств	010	649	475
Основные средства, сданные в аренду (лизинг)	011	-	
Нематериальные активы, полученные в пользование	012	-	
Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов	013	4	4
Потеря стоимости основных средств	014	45	45

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января по 31 декабря 2010 г.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	48 486	40 552
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	7 138	6 219
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	41 348	34 333
Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021	-	-
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	38 021	31 574
Валовая прибыль (020-021-030)	040	3 327	2 759
Управленческие расходы	050	-	-
Расходы на реализацию	060	-	-
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	**070**	**3 327**	**2 759**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	3 410	1 097
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	531	157
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	2 879	940
В том числе: проценты к получению	091	62	26
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092		-
доходы от операций с активами	093	139	185
прочие операционные доходы	099	2 678	729
Операционные расходы	100	2 748	786
В том числе: проценты к уплате	101	-	-
расходы от операций с активами	102	141	75
прочие операционные расходы	109	2 607	711
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)	**120**	**131**	**154**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	182	149
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	12	7
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	170	142
Внереализационные расходы	150	1 279	1 043
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	**160**	**-1 109**	**-901**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)	**200**	**2 349**	**2 012**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	1 243	1 015
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220	98	20
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)	**240**	**3 494**	**3 007**
Налог на прибыль	250	819	706
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	266	237
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	18	32
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	**300**	**1 246**	**1 037**
Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310	-	-
Прибыль (убыток) на акцию	320	313 руб.	261
Количество прибыльных организаций/ сумма прибыли	330	0/0	0/0
Количество убыточных организаций/ сумма убытка	340	0/0	0/0

РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

Показатель		За отчетный период		За аналогичный период предыдущего года	
наименование	код	доход	расход	доход	расход
1	2	3	4	5	6
Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании	350	59	8	6	7
Прибыль (убыток) прошлых лет	360	17	49	94	146
Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств	370			2	
Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте	380	-	-		-
Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности	390	30	12	13	29
Прочие доходы и расходы	400	64	1 210	27	861
ИТОГО	**500**	**170**	**1 279**	**142**	**1 043**

Руководитель А.В. Тарасенко

Главный бухгалтер Л.В. Погодина

03.03.2011

Ликвидационная комиссия ОАО «Белстанкоремстрой» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона) объявляют о проведении 31 марта 2011 г. открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белстанкоремстрой»

№ предмета аукциона	Наименование и характеристики продаваемого имущества	Местонахождение имущества	Начальная цена, рублей (в т.ч. НДС 20%)	Размер задатка, рублей
1.	Одноэтажное кирпичное здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, 1981 г. постройки, площадью 722,3 м² (инв. номер: 350/С-86422), расположенное по адресу: г. Гомель, ул. 9-я Иногородняя, 25а (земельный участок площадью 0,3761 га).	г. Гомель	501 816 600	50 181 660
2.	Одноэтажное административно-хозяйственное здание площадью 238,8 м² (инв.номер 350/С-78596), асфальтированная площадка, забор и здание специализированное автомобильного транспорта (гараж) площадью 89,8 м² (инв.номер 350/С-78786), расположенные по адресу: г. Гомель, ул. Нововетрянная, 11а (земельный участок площадью 0,1376 га)	г. Гомель	618 884 230	61 888 420
3.	Автомобильное шасси ГАЗ 66-11	г. Гомель	8 592 760	859 270
4.	Автомобильное шасси ГАЗ 66-01	г. Гомель	6 186 780	618 670
5.	Автомашина ЗИЛ ММЗ-45021	г. Гомель	8 592 760	859 270
6.	Бытовка деревянная, инв. № 329	г. Минск	2 807 200	280 700
7.	Вагон бытовка, инв. № 368	г. Минск	2 513 400	251 340
8.	Домик вагонного типа, инв. № 361	г. Минск	5 777 570	577 750
9.	Подъемник с электролебедкой К 1.000.000В, инв. № 404	г. Минск	2 448 130	244 810
10.	Кран консольный К 1.00.000ВТЗ с электролебедкой СГ – 10.000.000	г. Минск	1 338 300	133 830
11.	Автомобиль КАМАЗ 5410 (гос. № 5483 МИЛ)	г. Минск	4 080 200	408 020
12.	Автомобиль МАЗ 5551 (гос. № КА 5137)	г. Минск	9 302 870	930 280
13.	Автомобиль ГАЗ 3110 (гос. № 5634 АМ-3)	г. Минск	4 830 960	483 090
14.	Автомобиль МАЗ 5551 (гос. № 8362 МИТ)	г. Минск	9 302 870	930 280
15.	Автомобиль ГАЗ 3110 (гос. № 9312 РН)	г. Минск	1 632 080	163 200
16.	Кран на пневмоколесном ходу (гос. № 5363 КС), инв. № 173 и гусек неуправляемый к крану КС 5363	г. Минск	57 452 560	5 745 250

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии свидетельства о государственной регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, код 153001334; УНП 190398583, в срок до 13.00 29.03.2011 г.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона. Шаг аукциона составляет пять процентов от начальной цены предмета аукциона.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)», возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (покупателем).

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 7 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли продажи по согласованию с продавцом.

Аукцион состоится **31 марта 2011 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 11.03.2011 г. по 29.03.2011 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 40 22.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30.

Погляд

Ё-заводы і іншыя аўтамабільныя аспекты Мытнага саюза

Наступствы і перавагі далучэння Беларусі да стварэння Адзінай эканамічнай прасторы — тэма гутаркі нашага карэспандэнта з вядомым эканамістам, членам Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Л.Ф. ЗАІКАМ.

— Зноў назіраецца ўсплёск цікавасці да Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расійскай Федэрацыі. Але зараз гэты інтарэс, я сказаў бы, з прысмакам насцярожанасці і нават горычы — летам непазбежна ўздымуцца мытныя пошліны на ўвазныя аўтамабілі, а значыць, істотна вырастуць цэны і на машыны. А многія ўжо паверылі ў беспярэчныя перавагі Мытнага саюза. Што бы вы ім сказалі з гэтай нагоды?

— Ведаеце, і мне здавалася, што ў нас пераважная большасць насельніцтва бачыць відавочныя плюсы Мытнага саюза. Але разам з тым у народзе неяк з роспаччу ўспрынятае паведамленне аб ужо непазбежным росце цэн на імпартныя машыны. Таму хачу сказаць, што не зусім карэктна выключна на бытавым узроўні ацэньваць такую важную з'яву на постсавецкай прасторы, як стварэнне Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расійскай Федэрацыі. У канцы снежня мінулага года Прэзідэнт Беларусі падпісаў 17 пагадненняў, якія рэгулююць як умовы нашага далучэння да мытнай прасторы, так і нашы абавязацельствы ў Мытным саюзе. Завяршаецца праца па фарміраванні дагаворна-прававой базы Адзінай эканамічнай прасторы трох краін.

Мы цяпер будзем гуляць па правілах гэтых дамоўленасцяў. А як жа інакш? Маючае адбыцца падаражанне аўтамабіляў, якія ўвозяцца з-за мяжы, — адно з наступстваў уступлення ў Мытны саюз. Бо яго стварэнне, вобразна кажучы, азначае, што знешняя мяжа трох краін нібы абводзіцца чырвоным алоўкам. Усе тавары, якія цяпер будуць завозіцца звонку чырвонай лініі: з суседніх Украіны, Польшчы ці далёкіх Гамбіі, Бразіліі, будуць абкладвацца імпартнымі пошлінамі. А тое, што вырабляецца ўнутры саюза, будзе прадавацца свабодна.

— Гэта зразумела. Але як жа цяпер быць маладым людзям, ды і не толькі ім, якія не адзін год збіралі грошы на сваю мару — іншамарку?

— Ісці ў нагу з патрабаваннямі часу — набываць не патрыманыя замежныя, а новыя расійскія машыны тых жа замежных марак, стымуляваць ці, інакш кажучы, падштурхоўваць наш урад да адкрыцця ў Беларусі прадпрыемстваў па выпуску машын вядомых аўтамабільных брэндаў. Бо мы ў гэтай справе спазняемся. У Расіі ўжо працуе не адзін завод, ёсць такі ў Казахстане. Мы таксама маем неблагія перспектывы адкрыць на замежныя інвестыцыі два-тры зборачныя аўтазаводы. Тым больш што цяпер перад намі адкрытыя рынкі Мытнага саюза. Гэта дае нам вялікія перавагі ў канкурэнтнай барацьбе.

— І што гэта за перавагі? Набыць іншамарку расійскай зборкі?

— Ваша схаваная іронія не зусім да месца. Убачыце, з часам мы будзем мець магчымасць набываць аўтамабілі беларускай, расійскай і казахстанскай вытворчасці па вельмі прымальных цэнах, я б нават сказаў танных, у параўнанні, напрыклад, з еўрапейскімі цэнамі. Я лічу, што цяганіна з допускам замежных інвестараў на беларускі рынак для адкрыцця зборачнай аўтамабільнай вытворчасці — істотны пралік тагачаснага ўрада. Зараз улады заклапочаны эканоміяй валютных сродкаў, рацыянальным і ашчадным іх выкарыстаннем, абачлівым размеркаваннем і г. д. Няма слоў — правільны падыход. Але давайце паглядзім з іншага боку на гэтую праблему. Цікавая лічба: штогод грамадзяне нашай краіны выдаткоўваюць на набыццё патрыманых іншамарак прыкладна адзін мільярд амерыканскіх долараў! Жыхары Беларусі штогод купляюць да 150 тысяч машын. І гэта ўся валюта ў асноўным ідзе за мяжу. Дзіўная атрымліваецца карціна: бяром у МВФ крэдыты на тры з паловай мільярды долараў і адначасова адзін мільярд аддаём за мяжу на аўтамабілі, якія былі ў карыстанні. Дарэчы, наколькі я ведаю, заклапочаны такой сітуацыяй старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч неаднойчы звяртаўся ва ўрад з просьбай разгледзець пытанне аб адкрыцці хоць бы аднаго завода па выпуску запатрабаваных замежных легкавікоў.

«Штогод грамадзяне нашай краіны выдаткоўваюць на набыццё патрыманых іншамарак прыкладна адзін мільярд амерыканскіх долараў!»

— Прабачце, але пад Мінскам вырабляюцца машыны-іншамаркі.

— Давайце не будзем аб сумным. Гэта зусім не тое, што нам трэба. Гэты завод выпускае машыны на базе ўжо састарэлай французскай мадэлі. І ўсё ідзе да таго, як мне здаецца, што ён закрыецца. Калі на «саманд» перасадзіць міліцыянтаў, то ім ніколі не дагнаць злачынцаў.

— А выпуск якой аўтамабільнай маркі, на ваш погляд, быў бы аптымальным для нас па якасці і цане?

— Такой машынай можа стаць новы расійскі «народны» аўтамабіль пад нязвыклай назвай «Ё». З ініцыятывай яго выпуску выступіў вядомы алігарх Міхаіл Прохараў, які валодае велізарнымі фінансавымі сродкамі. Кошт гэтага «ё-мабіля» будзе ў межах 10 тысяч долараў. Думаю, адзін «ё-завод» можна было б пабудаваць у Баранавічах, а другі — у Гомелі. Там развітая прамысловасць, ёсць кваліфікаваныя кадры інжынераў і рабочых. Гэта павінны быць невялікія заводы — кожны па выпуску не больш 10 тысяч штогод. Можна было б падумаць і аб пляцоўцы пад трэці завод. Як ужо паведамлялася, Прохараў плануе выпускаць цэлую сям'ю аўтамабіляў. Акрамя хэтчбэка і седана з'явіцца красавер, універсал і нават купэ! Прохараў плануе зрабіць «ё-мабіль» самым сучасным транспартным сродкам у Расіі, які не будзе саступаць лепшым сусветным аналагам.

— Але ці не зашмат для нас аж тры «ё-заводы»? Ці будзе збыт прадукцыі?

— Будзе. Як я бачу, урады Беларусі, Казахстана і Расіі ўжо падышлі да ўсведамлення таго, што надышоў час стварэння шырокай гамы легкавых машын на ўсе густы, патрэбы і выпадкі жыцця: ад магутных пазадарожнікаў да мініаўтамабіляў для жанчын і дзяўчат.

— Сёння ўражальнымі тэмпамі засвойваюць аўтамабільную вытворчасць кітайцы, упарта перацягваюць на сябе яе коўдру. Як вы ставіцеся да партнёрства з Кітаем у гэтай галіне?

— З вельмі стрыманым аптымізмам, мякка кажучы. Гэта неперспектыўны шлях. Кітайцы капіруюць і паўтараюць нямецкія і японскія машыны. На жаль, з якасцю, якая далёкая ад арыгіналаў. Расійскія інжынеры лепшыя за кітайскіх. Як і беларускія. Увогуле нам трэба самастойна (наколькі гэта дазваляюць умовы і абставіны) развіваць уласную вытворчасць легкавікоў. У нас багатыя традыцыі ў аўтамабілебудаванні. Дастаткова ўзгадаць МАЗ, БелАЗ, завод калёсных цягачоў і іншыя. У нас выдатная кааперацыя з расійскімі калегамі, ёсць пэўныя планы спалучэння патэнцыялаў КамАЗа і МАЗа. Хаця нам трэба павучыцца ў кітайцаў прадпрымальнасці, уменню выкарыстоўваць на сваю карысць нашу непаваротлівасць. Я маю на ўвазе агучаную Прэзідэнтам інфармацыю на нарадзе з новым складам Урада аб тым, што кітайцы ўжо пастаўляюць запчасткі да БелАЗаў замежным пакупнікам гэтых машын.

— Як такое магло здарыцца?

— Я б моцна не зацыкліваўся на гэтым прыкладзе. Напрыклад, у Беларусі вырабляюць запчасткі для такога сусветна вядомага аўтамабільнага брэнда, як нямецкі BMW — машыны, якая славіцца сваёй якаснай зборкай і надзейнасцю. Але ў выпадку з БелАЗам іншая справа. Яго дзейнасць ацэньваецца па колькасці прададзеных на экспарт адзінак машын. Выпуск запчастак не ўключаецца ў статыстыку асноўных паказчыкаў завода. Увогуле вырабляць запчасткі да таго ці іншага мадэльнага рада вядомай аўтамабільнай маркі нікому не забараняецца. Мяне ў выпадку з БелАЗам засмучае не тое, што ў самога флагмана прамысловасці не даходзяць рукі да такой «дробязі». Маўляў, не царская гэта справа. Што казаць — гігант індустрыі. Але ўзнікае пытанне: чаму гэтую беспярэчна выгадную экспартную нішу не занялі нашы малыя і сярэднія прадпрыемствы? Вось яна, амаль гарантаваная валютная выручка. Але не. Мы чамусьці яе саступілі кітайцам. А тыя малайцы, не разгубіліся.

— Вернемся да мілых сэрцу мільёнаў беларусаў легкавікоў. Дык што, з часам ва ўмовах Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы нашы суайчыннікі па новыя машыны паедуць не ў Германію, а ў Казахстан?

— Не выключаю. Казахстан для нас прывабны і з іншага боку. Нам трэба больш уважліва прыглядзецца да пераваг Адзінай эканамічнай прасторы. Адна з такіх пераваг — свабоднае перамяшчэнне працоўнай сілы. Расія, якая не можа эфектыўна развіваць сваю эканоміку без дадатковых дзясяткаў тысяч кваліфікаваных кадраў звонку, з задавальненнем прымае беларускіх спецыялістаў. Казахстан таксама мае патрэбу ў кваліфікаванай працоўнай сіле. Хутка гэты дэфіцыт яшчэ больш абвастрыцца, бо там прынятае рашэнне аб будаўніцтве на працягу пяці гадоў 400 новых, абсталяваных па апошнім слове тэхнікі прадпрыемстваў. Вельмі амбіцыйная і складаная для рэалізацыі задача, бо, акрамя іншага, запатрабуе кваліфікаванага персаналу. А Казахстан — не прамысловая развітая краіна, там бязмежныя палі збожжа і багатая выкапнямі зямля, у тым ліку нафтай і газам, і мала прамысловасці ў нашым разуменні гэтага паняцця. Таму нашы кадры могуць паўдзельнічаць у індустрыялізацыі краіны. Казахстан здольны плаціць ім годную зарплату, таму нашым спецыялістам ёсць сэнс на пэўны перыяд там папрацаваць, зарабіць грошы на новае жыллё і машыну. Калі з Гомеля нашы нафтавікі ляталі ў Італію, дзе працавалі вахтавым метадам на нафтарадовішчах, зараблялі там выдатныя грошы — 5-8 тысяч долараў у месяц, то чаму б не паляцець у Казахстан? Там, напрыклад, чакае шырокае поле дзейнасці для нашых праграмістаў. Беларускія кадры могуць стаць праваднікамі казахстанскай прадукцыі ў Еўропу. З іншага боку, наша сістэма прафесійнага навучання, школа, у тым ліку і вышэйшая, можа істотна дапамагчы ў падрыхтоўцы нацыянальных кадраў для Казахстана.

— Як, на ваш погляд, у будучыні павядуць сябе ўзаемы ў рамках Адзінай эканамічнай прасторы на іншыя тавары?

— Яны павінны знізіцца. Аб'ектыўна запрацуе канкурэнцыя, вытворцы будуць пастаянна імкнуцца паменшыць сабекошт прамысловых тавараў і прадуктаў харчавання. Канцэнтрацыя працы, яе падзел у межах Мытнага саюза прывядуць да зніжэння цэн на тыя тавары, якія сёння больш танныя ў той жа Украіне. Напрыклад, на грэчку, курыныя яйкі, алей.

— Для нас харчовы рынак Мытнага саюза таксама перспектыўны?

— Безумоўна. Вось цікавыя лічбы: беларускія экспартныя цэны адной тоны чорнага металу, тоны нафтапрадуктаў і тоны калійных угнаенняў хаця і вагаюцца, але прыкладна аднолькавыя — больш 500 і менш 600 дол. А тона малочных прадуктаў — каля 2500 дол. Амаль у пяць разоў больш нашых традыцыйных экспартных тавараў. Адсюль выснова: калі мы хочам ездзіць на новых сучасных машынах, запраўляць іх параўнальна недарагім бензінам, то нам трэба ўсяляк нарошчваць, у прыватнасці, наш малочны экспарт, актыўна развіваць іншыя кірункі патэнцыйнай экспартна-арыентаванай вытворчасці. Як члены Мытнага саюза мы можам па расійскіх цэнах набываць сыравіну і матэрыялы, напрыклад, экалагічную сыравіну для нашай харчовай прамысловасці. Дык чаму б сумесна з расіянамі не стварыць праграму выпуску ў Сібіры (там амаль не засталося працаздольнага насельніцтва) сапраўды экалагічна чыстай прадукцыі з вялікім экспартным патэнцыялам? Сёння толькі Аўстралія і Новая Зеландыя могуць пахваліцца выключна чыстым экалагічным прадуктам. У нас ёсць усе шанцы паспяхова заняць гэтую нішу, стварыць новы брэнд і з ім прарвацца, а затым замацавацца на багатых і вельмі плацежаздольных рынках Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Над такім праектам трэба будзе ўпарта папрацаваць. Але гульня, як гавораць нашы расійскія саюзнікі, каштуе свечак. Каб не вывозіць мільярды долараў за мяжу на патрыманыя машыны, закуп разнастайных спажывецкіх тавараў, а наадварот, павярнуць гэту плынь да сабе.

— А з чаго пачаць рэалізацыю вашай ідэі, прапаноў і ідэй іншых прадстаўнікоў Мытнага саюза для ажыццяўлення ў яго межах, нестандартных, скажам так, праектаў?

— Я б рэкамендаваў стварыць пастаянна дзейны форум дзелавых колаў Беларусі, Казахстана і Расійскай Федэрацыі. Напрыклад, у Мінску. Каб іх прадстаўнікі мелі пляцоўку для распрацоўкі стратэгіі эканамічнага ўзаемадзеяння (у прыватнасці, у аўтамабілебудаванні), абмену ідэямі, планамі. Маглі б разам шукаць і знаходзіць шляхі іх рэалізацыі. А перавагу аддаваць новым тэхналогіям і інавацыям. Дарэчы, Беларусь магла б стаць ініцыятарам правядзення такога форуму, запрасіць да ўдзелу ў ім Германію, Францыю, Літву, Чэхію, іншыя краіны, якія зараз праяўляюць вялікую цікавасць да Мытнага саюза.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Прамая лінія

І ГАЛАВА КРУЖЫЦЦА, І Ў СПІНЕ «СТРАЛЯЕ»

На пытанні чытачоў адказаў загадчык неўралагічнага аддзялення 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр ІВАНОЎ.

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 1—5 сакавіка.)

☎— Любанскі раён, Георгій Пятровіч. 64 гады. Калі рухаюся, адчуваю боль, які аддае пад левую лапатку. Баліць у шыйным і грудным аддзелах пазваночніка. Звяртаўся да неўролага, але нічога толкам мне не сказалі. Быў у мяне і інфаркт міякарда...

— З прызначэннем лячэння ў вашым выпадку трэба быць досыць асцярожным. Не любое фізіялячэнне на грудны аддзел пазваночніка вам падыдзе. Аднак існуюць працэдуры, якія не нашкодзяць сэрцу — ультрафіялетавае абпраменьванне, лазератэрапія. З медыкаментаў я раіў бы вам мелаксікам — 1 таблетка ў суткі 5 дзён. Можаце карыстацца мазямі найз або румакар, або індаметацынавай. Ін'екцыі я дома рабіць не раю, паколькі падобнае лячэнне можа выклікаць пэўныя ўскладненні. Унутрымышачныя прэпараты, кропельніцы павінны прызначацца неўролагам у спецыянары.

☎— Капыль, Кацярына. У мяне астэахандроз, дэфармуючы артроз, перфузія, пратрузія міжпазваночных дыскаў і парамедыянная грыжа. Якое лячэнне мне рэкамендавана? Быў боль у паясніцы, аддаваў у нагу. Але пасля дыклафенаку боль прайшоў...

— Вы праходзілі камп'ютарную тамаграфію?

— Так, знайшлі грыжу дыска — 3х6 мм.

— Калі вас нічога асабліва не турбуе, то не трэба прымаць інтэнсіўныя прэпараты. Пажадана прайсці санаторна-курортнае лячэнне. Можна прымаць структум або алфлутоп на працягу года. Гэтыя прэпараты крыху аднаўляюць міжпазваночныя дыскі.

— А хандрамед можна?

— Можна. І пазбягайце перанахаладжвання.

— А ёсць такія эластычныя паясы на спіну...

— Калі не жорсткай фіксацыі, то можна.

— У мяне нядаўна быў нервовы зрыў, верхні ціск узняўся да 120-130. Але для мяне гэта дрэнна. І ад бяссонніцы пакутую. Прызначалі мне эгілок і берліприл.

— Верхні ціск на ўзроўні 120-130 — гэта нармальны ціск. Да гіпатэнзіўных сродкаў, бэта-блакатараў трэба ставіцца асцярожна. Калі вы занадта знізіце ціск, то можа быць сапраўды горш, чым ёсць. Вы, як я разумею, чалавек трывожны. Таму трэба звярнуцца да псіхатэрапеўта, які прызначыць нейкія карэктуючыя сродкі, антыдэпрэсанты. Можна папрымаць санат, седатыўны збор траў.

— Псіхатэрапеўт прызначаў мне адаптол або рэксецін. А што з іх лепш?

— Можаце пакінуць адаптол.

— А дзе можна падлячыць нервовую сістэму?

— Памежныя станы лечацца ў аддзяленнях неўрозаў, якія ёсць у кожным абласным цэнтры. Псіхатэрапеўт ведае, куды і як накіроўваць.

☎— Ганцавіцкі раён, Любоў Леанідаўна. У маёй маці — ёй 73 гады — неўралгія трайчастага нерва. Моцны боль, нават часам не можа есці. Прымае карбамазепін, але ён цяпер не дае ніякага выніку. У бальніцы давалі абязбольвальныя, але боль не адступае. Што нам рабіць?

— Неўралгія трайчастага нерва заўсёды суправаджаецца прыступамі болю. Калі вы праходзілі апошні курс лячэння?

— Тры дні назад, у Ганцавічах.

— Магчыма, праведзенае лячэнне было недастатковым. Яно павінна быць комплексным. Неабходна, каб былі нестэроідныя прэпараты, мачагонныя, антыканвульсанты. Карбамазепіну недастаткова. Варта дадаць тапамакс, які добра пазбаўляе болевых адчуванняў. Добра было б прайсці іголкатэрапію. Калі яе ў Ганцавічах няма, пажадана, каб вас накіравалі ў вобласць. Бо калі нічога не рабіць, болевы сіндром нікуды не знікне. З аператыўным умяшаннем спяшацца не трэба. Я думаю, трэба дабівацца станоўчага выніку з дапамогай кансерватыўнага лячэння.

☎— Брагін, Уладзімір Андрэевіч. 54 гады. У бацькоў было вострае парушэнне мазгавога кровазвароту. Што трэба рабіць для прафілактыкі гэтай паталогіі?

— Калі нешта нам дастаецца ў спадчыну, з гэтым трэба жыць. Першае, што трэба, — не думаць пра тое, што было ў бацькоў. Інакш вы настроіваеце сябе на адмоўныя моманты. Трэба адчуваць сябе здаровым і настройваць сябе на здароўе. Безумоўна, трэба выключыць усе нездаровыя звычкі. Усім людзям — не толькі тым, у каго хваробы бацькі, — неабходна сачыць за вагой, халестэрынам, вытрымліваць рэжым працы і адпачынку. Можна ў нейкі момант пачаць прыём кардыямагнілу або палакарду.

— А танакан можна?

— Калі вам рэкамендаваў яго ўрач, то можна. Бескантрольна нічога, калі ласка, не прымайце.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

Пытальнік

«КАЛІ Ў СТРАЎНІКУ АГОНЬ...»

Якія прадукты рэкамендуюцца і ад якіх варта адмовіцца пры пякотцы? Якія народныя сродкі дапамагаюць ад яе пазбавіцца?

Марыя, *г. Жодзіна.*

Варта адзначыць: калі вы рэгулярна пакутуеце ад «пажару» ў страўніку без відавочных прычын, самы час звярнуцца да доктара. Пякотка можа быць прыкметай непаладак у страўнікава-кішачным тракце.



Што можна есці

● Буракі, бульбу, моркву, квяцістую капусту, зялёны гарошак, кабачкі і гарбузы, спелыя някіслыя памідоры ў невялікай колькасці, свежыя агуркі. Кроп і пятрушку, дробна нарэзаныя ў супы і салаты.

● Кашы, звараныя на малацэ або вадзе: манную, добра разварэную рысавую, грэцкую і геркулесавую.

● Адварную макарону.

● Супы з гародніны, запраўленыя сметанковым маслам, някіслай смятанай, яечным жаўтком.

● Рыбу адварную або тушаную.

● Малако абястлушчанае, тварог, нявостры сыр.

● Нятлустыя віды мяса без скуркі ў адварным або паравым выглядзе.

● Яйкі ўсмятку або ўкрутую, амлет паравы.

● Салодкія ягады і садавіну, пасцілу, зефір у невялікіх колькасцях.

● Нямоцную гарбату з малаком або вяршкамі, какаву на малацэ, салодкія фруктова-ягадныя сокі, адвар шыпшыны.

● Масла сметанковае несалёнае, сланечнікавы і аліўкавы алей у натуральным выглядзе або дабаўленыя ў стравы.

● Хлеб пшанічны ўчарашняй выпечкі або падсушаны; няздобныя булачкі і печыва, сухі бісквіт.

Чаго лепш пазбягаць

Павышаюць кіслотнасць страўнікавага соку:

● Малочныя прадукты з высокай кіслотнасцю, вострыя сыры.

● Вострыя соусы і прыправы.

● Сокі кіслых ягад і садавіны (асабліва цытрусавых і таматны).

● Супы на мясным або грыбным булёне, боршч, вараная капуста, халаднік.

Аказваюць раздражняльнае дзеянне на слізістую страўніка і стрававода:

● Проса, ячныя крупы.

● Белакачанная капуста, баклажаны, цыбуля, часнок, грыбы, агароднінныя кансервы.

● Кіслыя і няспелыя ягады і садавіна ў сырым выглядзе.

● Мацаванае віно, моцныя алкагольныя напоі.

Выклікаюць уздуцце жывата і павялічваюць рызыку пякоткі:

● Свежы жытні хлеб, бліны, піражкі, пірагі, здоба.

● Бабовыя.

● Газіраваныя напоі, квас, піва.

Доўга знаходзяцца ў страўніку, выклікаюць вельмі актыўнае выдзяленне стрававальных сокаў і жоўці, павышаючы рызыку пякоткі:

● Тлустыя віды рыбы; вэнджаная, салёная і смажаная рыба.

● Сала, перасмажаны алей.

● Яечня і смажаны амлет.

● Тлустыя гатункі мяса і птушкі ў смажаным выглядзе, кансервы.

Змяшчаюць рэчывы, якія правакуюць закід страўнікавага змесціва ў стрававод:

● Шакалад, кава, кола.

● Эфірны алей мяты расслабляе сфінктар стрававода. Пазбягайце напояў, араматызаваных гэтым алеем, а таксама мятнай гумкі.

Важна

● Харчуйцеся дробна, 4—5 разоў у суткі. Так вы зможаце пазбегнуць залішняга расцяжэння страўніка, што з'яўляецца дадатковым фактарам рызыкі пякоткі.

● Пасля яды не лажыцеся і не сядзіце ў напаўсагнутым становішчы на працягу 1,5—2 гадзін.

● Не ешце непасрэдна перад сном. Вячэра павінна быць нятлустай.

● Спіце з прыпаднятым (на 10—15 см) галаўным канцом ложка.

● Стравы і напоі пры пякотцы пажадана ўжываць крыху цёплымі. Надта гарачая ежа аказвае неспрыяльнае дзеянне на слізістую абалонку стрававода і страўніка, раздражняючы яе. Халодная ежа прыгнятае сакраторную функцыю страўніка і надоўга затрымліваецца ў ім.

● Некаторыя лекавыя прэпараты, напрыклад, тыя, што змяшчаюць ацэтылсаліцылавую кіслату, аказваюць раздражняльнае дзеянне на страўнік. У гэтым выпадку лепш прымаць падобныя лекі пасля яды. Узмацняюць пякотку некаторыя спазмалітыкі, запакаяльныя, антыдэпрэсанты.

● Курэнне садзейнічае ўзмацненню сімптомаў пякоткі, таму зменшыце колькасць цыгарэт, што выкурваеце за дзень, да мінімуму, а яшчэ лепш — кіньце курыць.

● Неўрозы і павышаная трывожнасць могуць стаць прычынай разавай або паўторнай пякоткі. Заўважана таксама, што людзі, якія пастаянна адчуваюць страх, часцей пакутуюць ад пякоткі.

● Не насіце цеснага адзення. Гэтаксама, як лішні тлушч на жываце, цеснае адзенне «перацісканае» талію, прымушаючы кіслату падымацца назад у стрававод.

● Майце на ўвазе, што працяглы бескантрольны прыём антацыдных прэпаратаў, якія знімаюць праявы пякоткі, можа прывесці да з'яўлення запораў, ванітаў і іншых пабочных эфектаў. Таму перад тым, як пачаць прыём антацыдаў, парайцеся з урачом.

Народная медыцына раіць пры пякотцы:

● надзерці на дробнай тарцы палову невялікай морквы і паволна з'есці;

● пажаваць і праглынуць некалькі адвараных гарошын (людзі, якія пакутуюць ад пякоткі, могуць пастаянна трымаць для гэтых мэт у халадзільніку адварны гарох);

● добра дапамагае насенне кропу;

● выпіць цёплай мінеральнай вады без газу;

● выпіць чвэрць шклянкі бульбянога соку; для прафілактыкі яго можна піць курсам, 3 разы на дзень, за паўгадзіны да яды.

Увага! *Многія з нас для ўстарання праяў пякоткі карыстаюцца папулярнымі хатнімі метадамі — п'юць соду або малако. Спецыялісты гэтыя метады купіравання пякоткі не рэкамендуюць. Пры прыёме соды ўзнікае «эфект рыкошэту»: спачатку кіслотнасць у страўніку рэзка зніжаецца — амаль да нуля, а праз нейкі час зноў узрастае. Такі перапад кіслотнасці неспрыяльна адбіваецца на стане слізістай абалонкі страўніка і можа парушаць кіслотна-шчолачны баланс арганізма.*

Што датычыцца малака, то яго бялкі і прысутны ў ім кальцый зноў-такі стымулююць сакрэцыю кіслаты ў страўніку. А значыць, новы прыступ пякоткі не за гарамі.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Хакей. КХЛ

ПЕРШЫ ПЛЭЙ-ОФ НЕ КОМАМ

Мінскае «Дынама» прайграла апошні ў серыі да чатырох перамог матч і выбыла з розыгрышу Кубка Гагарына.

Матч праходзіў на пляцоўцы суперніка, у Яраслаўлі. Ужо ў першым перыядзе мінчане прапусцілі дзве шайбы, другія дваццаць хвілін дынамаўцаў выратоўваў Андрэй Мезін, а ў трэцім перыядзе гульня ў нашай каманды цалкам разладзілася — шайба ў варотах пабывала яшчэ чатыры разы. Канчатковы лік — 1:6, і лік у серыі стаў 4:3 на карысць «Лакаматыва», які ў 1/4 пачаў гуляць супраць рыжскага «Дынама».

Вось як пракаментаваў апошні ў сезоне матч **галоўны трэнер Марэк СІКОРА**:

— Мы правалілі гульню з самага пачатку. Хацелі дзейнічаць актыўней, але хутка прапусцілі дзве шайбы, гэта збылтала карты. Выдаленні ў другой трэці выхаласцілі хлопцаў, якія абараняліся ў меншасці. У трэцім перыядзе гульня ішла да трэцяга гола, пасля якога адчулі, што выправіць штосьці будзе вельмі складана. Жорсткі вынік вырашальнай гульні серыі, асабліва калі ўзгадаць яе ход. Але ў цэлым я задаволены, як выглядала каманда ў супрацьстаянні з моцным супернікам.

І сапраўды, наша каманда правяла ўсе сем матчаў 1/8 плэй-оф. І мінулы сезон стаў адназначна лепшым у гісторыі яе выступленняў у КХЛ. Праўда, на гэтым сёлетнія выступленні для нашай каманды завершаны. Якой яна будзе ў наступным, думаць яшчэ рана. Праўда, Марэк Сікора паразважаў пра сваю будучыню ў «Дынама»:

— Пакуль ніякай канкрэтыкі наконт маёй будучыні няма. У самалёце я атрымаў станоўчыя водгукі пра сваю працу, але гэтаму спрыяла абстаноўка. У сярэдзіне гэтага тыдня мы абмяркуем маю будучыню. Пакуль жа я вельмі стаміўся. Трэба адпачыць і падумаць, ці трэба працягваць кар'еру.

А вось **Андрэй МЕЗІН** выказаў жаданне застацца ў камандзе:

— Наколькі я ведаю, мы працягнем супрацоўніцтва. Ёсць і жаданне застацца ў камандзе. Два гады я аддаў «Дынама», і мяне ўсё задавальняе: і гульнявы час, і калектыў. Не бачу падстаў шукаць шчасця дзесьці ў іншым клубе.

А вось з яшчэ адным варатаром, **Робертам ЭШАМ**, у «Дынама» вырашылі развітацца. Гэтак жа як з абаронцам **Томашам МОЙЖЫШАМ** і нападаючым **Петэрам СІКОРАМ**. В.а. генеральнага дырэктара клуба **Аляксей ТАРБІН** растлумачыў, што змяненні ў складзе будуць кропкавымі, і развітанне з некаторымі гульцамі азначае, што трэнерскі штаб бачыць на іх месцы іншых выканаўцаў.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

БЕЛАРУСКІЯ БАРЦЫ-ВОЛЬНІКІ ПАРАДАВАЛІ МАЙСТРА

У мінулыя выхадныя ў Мінску прайшоў 41-ы міжнародны турнір Гран-пры па вольнай барацьбе на прызы трохразовага алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Мядзведзя.

Гэты ўнікальны ў сваім родзе турнір у чарговы раз сабраў шматлікую колькасць спартсменаў — іх прыбыло ў сталіцу Беларусі каля 300 чалавек з 18 краін свету. Гран-пры на прызы нашага знакамітага земляка ўжо зарэкамендаваў сябе не толькі як стартавая пляцоўка для маладых і таленавітых барцоў, але і месца для праверкі сваіх сіл і гатоўнасці да галоўных планетарных спаборніцтваў. Напрыклад, да чарговага чэмпіянату Еўропы, які адбудзецца ў канцы сакавіка — пачатку красавіка гэтага года ў Германіі. Трэба адзначыць, што сёлета нашы спартсмены парадавалі і заснавальніка турніру Аляксандра Васільевіча Мядзведзя, і многіх беларускіх заўзятараў вольнай барацьбы — 9 медалёў на рахунку беларусаў, сярод якіх 4 залатыя, і першае каманднае месца! Пераможцамі сталі Уладзіслаў Андрэеў (вагавая катэгорыя да 55 кг), Алі Шабанаў (55 кг), Амаргаджы Магамедаў (84 кг) і Аляксей Шэмараў (120 кг); «серабро» заваяваў Альберт Батыраў (66 кг) і «бронза» на рахунку Андрэя Комара (55 кг) і Аляксандра Кантоева (60 кг). У неафіцыйным камандным заліку гаспадары «няветліва» пакінулі за сабой першае месца — Беларусь (4, 1, 2), далей размясціліся каманды Казахстана (1, 3, 0), Расіі (1, 2, 6), ЗША (1, 1, 2), Украіны (0, 0, 2), Славакіі (0, 0, 1) і Турцыі (0, 0, 1). У спаборніцтвах сярод жанчын вызначыліся і беларускія дзяўчаты — сярэбранымі прызёркамі сталі Заліна Сідакова (59 кг) і Васіліса Марзалюк (72 кг). Як патлумачыў галоўны трэнер зборнай краіны Сяргей Кітаеў, чакаліся вынікі больш сціплыя — з-за таго, што вядучыя барцы па розных прычынах не змаглі прыняць удзел у хатнім турніры.

Іван ХВІР.

Спорт-тайм

Тэнісісты ў Кубку Дэвіса паднялі на 45 радок

У новым рэйтынгу Кубка Дэвіса наша каманда паднялася з 48-га на 45-е месца, а колькасць набраных ёй балаў павялічылася з 400 да 480. На мінулым тыдні беларускія тэнісісты выйшлі ў другі круг II групы Еўра-Афрыканскай зоны, перамогшы каманду Балгарыі з лікам 4:1. 8-10 ліпеня зборная Беларусі згуляе ў гасцях з тэнісістамі Венгрыі.

Футбольная зборная апусцілася на 37-е месца

У новым, сакавіцкім рэйтынгу, апублікаваным ФІФА, зборная Беларусі па футболе страціла адзін пункт, апусціўшыся з 36-га на 37-мы радок. За тэрмін з моманту апублікавання папярэдняга рэйтынгу наша каманда правяла таварыскі матч з камандай Казахстана, дзе згуляла ўнічыю. Рэйтынг па-ранейшаму ўзначальвае зборная Іспаніі. У дзясятцы наймацнейшых — каманды Галандыі, Германіі, Аргенціны, Бразіліі, Англіі, Уругвая, Харватыі, Партугаліі, Грэцыі.

«Барселона» і «Шахцёр» — першыя чвэрцьфіналісты

У 1/4 фіналу Лігі чэмпіёнаў першымі выйшлі іспанская «Барселона» і ўкраінскі «Шахцёр».

«Барселона» ўзяла-такі рэванш у «Арсенала» за першае паражэнне і другі сезон запар выбіла англічан з далейшага розыгрышу Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў. «Арсенал» наўрад ці мог прадбачыць тыя кадравыя непрыемнасці, якія прыйшлося перажыць. На пятнаццатай хвіліне траўму атрымаў асноўны варатар лонданцаў Войцэх Шчэнсны, яго замяніў Мануэль Альмунья. А ў пачатку другога тайма падвёў каманду ван Персі. Трапіўшы ў афсайд, ён зрабіў выгляд, што не чуў свістка, і прабіў па варотах. Другая жоўтая картка ператварылася ў чырвоную, і «Арсенал» застаўся ўдзесяцёх. А «Барселона» ўсёй камандай рынулася ў атаку. У выніку на табло 3:1 (дублем вызначыўся Леанэль Месі, трэці мяч забіў Хаві Эрнандэс, а на рахунку Бускетса аўтагол).

Упершыню ў гісторыі выйшаў у 1/4 фіналу данецкі «Шахцёр». Дома ён у другі раз перайграў «Рому». Дакладней разграміў 3:0. Вынік першага матча задавальняў украінскі клуб, які і дазволіў італьянцам гуляць першым нумарам. Праўда, гэта не перашкодзіла «Шахцёру» адкрыць лік у першым тайме — пасля розыгрышу вуглавога вызначыўся Віліян. У другім тайме «Рома» таксама засталася ў меншасці, а гарнякі давялі лік да разгрому.

Алена КРАВЕЦ.

Крымінал, здарэнні

«ЗАМКНУЛА» НА СВЯТА

Загадчыца крамы, якая знаходзіцца ў гарадскім пасёлку Камарын, што ў Брагінскім раёне, атрымала непрыемны «падарунак» якраз на жаночае свята. Калі жанчына раніцай адчыніла дзверы ў службовае памяшканне, адчула смурод з гандлёвай залы. Харчовы магазін мясцовага спажывецкага таварыства загарэўся, калі пакупнікі там яшчэ адсутнічалі. Пажар быў хутка ліквідаваны выратавальнікамі. У выніку ў знішчаны касавы апарат, пашкоджаны дзве халадзільныя вітрыны і прадукты харчавання. Мяркуецца, што прычынай пажару стала кароткае замыканне касавага апарата, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

АПЁК РАСПАЛЕНЫМ МЕТАЛАМ

З тэрмічнымі апёкамі ў бальніцу раніцай 8 сакавіка былі дастаўлены рабочыя гомельскага завода «Цэнтраліт», паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама. Траўмы распаленым металам мужчыны атрымалі на працоўным месцы. У аднаго з іх пашкоджаны ногі, у другога — твар. Якім чынам адбылося перакульванне ка

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ПРАВ НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

ЗАО «ПАН Маркет» проводит аукционы по продаже прав на заключение договоров аренды следующего недвижимого имущества – павильонов, расположенных в Торговом блоке Главного выставочного павильона («Верхний пассаж» – 2 этаж):

АУКЦИОН № 1

Торги состоятся **21 марта 2011 года в 9.00** по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, 1 этаж, зал совещаний.

№ лота	Наименование объекта аренды	Срок аренды, ставка	Арендуемая площадь, м.кв.	Начальная цена продажи права заключения договора аренды, руб. с НДС	Размер задатка, руб.
1.	павильон № 169	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	17,4	6 000 000	1 800 000
2.	павильон № 84	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	12,6	6 000 000	1 800 000
3.	павильон № 12	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	13,7	4 500 000	1 350 000
4.	павильон № 72	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	12,6	4 500 000	1 350 000
5.	павильон № 13 (с 01.06.2011 г.)	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	13,7	4 500 000	1 350 000
6.	павильон № 133 (с 01.06.2011 г.)	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	13,7	4 500 000	1 350 000

АУКЦИОН № 2

Торги состоятся **21 марта 2011 года в 14.00** по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, 1 этаж, зал совещаний.

№ лота	Наименование объекта аренды	Срок аренды, ставка	Арендуемая площадь, м.кв.	Начальная цена продажи права заключения договора аренды, руб. с НДС	Размер задатка, руб.
1.	павильон № 269	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	11,4	3 000 000	900 000
2.	павильон № 272	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	12,2	3 000 000	900 000
3.	павильон № 276	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	73,1	3 000 000	900 000
4.	павильон № 278	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	70,4	3 000 000	900 000
5.	павильон № 296 (с 01.06.2011 г.)	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	21,8	3 000 000	900 000
6.	место для кофемашины К-1	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	2	3 000 000	900 000
7.	место для кофемашины К-3	3 года; 91 875 руб. за 1 м.кв. + коммунальные услуги	2	3 000 000	900 000

Условия проведения аукционов:

Организатором аукциона и продавцом (арендодателем) является Закрытое акционерное общество «ПАН Маркет», адрес: Минский район, Пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Торговый блок главного выставочного павильона комн.399.

Шаг аукциона – **5 %** от начальной цены продажи права заключения договора аренды.

Для участия в аукционе лицо, желающее участвовать в нем, в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе по форме (выдается организатором) со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

юридическим лицом Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

иностранным гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность;

представителем иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в аукционе, несут лица, желающие участвовать в нем.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению, за исключением случаев, предусмотренных законодательством.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке задаток и заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона.

Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет **ЗАО «ПАН Маркет»** ***р/с 3012201210011 в филиале ОАО «Белагропромбанке», МГД, код 963, г. Минск, ул. Ольшевского, 24***.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона обязан подписать протокол о результатах аукциона не позднее следующего дня после проведения аукциона; оплатить цену продажи предмета аукциона в течение 3-х рабочих дней, со дня проведения аукциона; заключить договор аренды объекта недвижимости в редакции арендодателя, право заключения договора аренды которого приобретено на аукционе, после исполнения обязательств по оплате в полном объеме и в установленные сроки.

В случае отказа Участника от выполнения обязанностей или нарушения сроков их выполнения результаты аукциона аннулируются, сумма внесенного Участником задатка не возвращается.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **18 марта 2011 года до 12.00** включительно по адресу: Минский район, Пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, Административное здание, 1 (первый) этаж, отдел кадров.

КОНЬ ЗАЦУГЛЯНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Коней на першую беларускую выстаўку прывезлі з Расіі, Латвіі, Украіны, вядома, з Беларусі таксама. А калі ўлічваць паходжанне жывёл, дык да нас у госці завітвалі незвычайныя прадстаўнікі Ірландыі, Англіі, Блізкага Усходу. Амаль кожнага коніка выводзілі ў манеж, каб прадэманстраваць лепшыя здольнасці і асаблівасці пароды, статнасць. Выезд коней з нашай Ратамкі, шоу арабскіх скакуноў, тэатралізаванае выступленне конна-гістарычнага клуба, акрабатычныя нумары на конях і нават звычайнае катанне каля будынка Белэкспа — праграма, якую наведнікам прапанавалі арганізатары выстаўкі. І не памыліліся. Колькі было дапытлівых вачэй, захаплення на дзіцячых і дарослых тварах, усмешак! Уразіла колькасць ахвотнікаў зрабіць фота на памяць на фоне каня ці самога коніка, асабліва калі ў цэнтры ўвагі быў шэры арабскі скакун ці самы вялікі конь у свеце — англійскі цяжкавоз пароды шайр, які некалі вазіў на сабе рыцараў вагою ў 200 кіло. Ці цыганскі вупражны конь пароды цінкер з Ірландыі, грыва якога была заплецена «афрыканскімі» коскамі.

«Мама, купі мне такога коніка», — усхліпвала трохгадовая дзяўчынка, разглядваючы жарабятка пані. Уланы на конях секлі на скаку качаны капусты. Бесперапынны гул выстаўкі раз-пораз пранізвала звонкае конскае ржанне.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

К сведению акционеров ОАО «Универсам Рига»:

ВЫПЛАТА ДИВИДЕНДОВ ПО ИТОГАМ РАБОТЫ за 2010 год БУДЕТ ПРОИЗВОДИТЬСЯ **с 15 марта 2011 года по 17 марта 2011 года** с 10.00 до 17.00 по адресу: 220040, г. Минск, ул. Сурганова, 50, 2 этаж, бухгалтерия.

УНП 100299678

Погляд

ЖАРСЦІ ПА БУДЫНКУ

У Мінгарвыканкаме хочуць пазбавіць Саюз мастакоў галоўнай экспазіцыйнай пляцоўкі

Вялізны будынак у цэнтры Мінска (ст. м. «Плошча Перамогі») з высакароднай назвай «Палац мастацтва» ўсе здавён ведаюць як уласнасць і законную тэрыторыю Саюза мастакоў. Шматлікія значныя выставы — ад такіх андэграўндных, як «Дах», да тэматычных «65 год Перамогі» і дзяржаўных культурных акцый «Зямля пад белымі крыламі» — часта праходзяць тут. Разам з тым, Саюз мастакоў здае гэтую плошчу ў часовую арэнду пад прывадзенне, напрыклад, разнастайных святочных кірмашоў, каб было на якія сродкі ўтрымліваць Палац мастацтва. Мастацкая галерэя ў цэнтры сталіцы проста неабходная, як сведчанне цывілізаванасці краіны і рэпрэзентацыя для турыстаў ды і нас саміх нашага ж культурнага багацця. Але сёлета 22 лютага старшыні Саюза мастакоў Уладзіміру Савічу прыйшоў ліст з Мінгарвыканкама:

«З мэтай правесці рэканструкцыю будынка спецыялізаванага культурна-асветніцкага і відовішчнага прызначэння па адрасе вул. Казлова, 3 Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт прапаноўвае ГА «Беларускі саюз мастакоў» прыняць рашэнне пра бязвыплатную перадачу вышэйназванага будынка ў камунальную ўласнасць г. Мінска».

Вялікі будынак у цэнтры сталіцы, вядома, прывабны кавалак. Але з чаго раптам у Мінгарвыканкаме выказалі такую абыякавасць да выставачнага лёсу выяўленчага мастацтва ў Мінску? Мы паспрабавалі разабрацца.

Мой дом — мая крэпасць

Упершыню пытанне пра лёс Палаца мастацтва паўстала ў мінулым годзе, калі зайшла размова пра рэканструкцыю будынка Палаца. На думку Мінгарвыканкама будынак выкарыстоўваецца неэфектыўна.

Цяпер, па сутнасці, у Саюза мастакоў хочуць забраць гэты будынак. Толькі вось словы пра «рэканструкцыю» і «неэфектыўнасць» гучаць надта ўжо непраўдападобна.

— Па-першае, як Мінгарвыканкам можа казаць пра неэфектыўнасць выкарыстання будынка, калі за апошнія гады (я кірую Саюзам мастакоў амаль 4 гады) ні старшыня, ні начальнік упраўлення аддзела культуры Мінгарвыканкама не былі ні на адной выставе, што ладзілася ў Палацы мастацтва, — распавядае Уладзімір Савіч. — У нас часта бываюць прадстаўнікі іншых дзяржаўных структур, напрыклад, міністр замежных спраў, міністр культуры, але прадстаўнікоў Мінгарвыканкама я нешта не прыгадваю. Па-другое, наш будынак не знаходзіцца ў такім крытычным аварыйным стане, калі яму патрэбная тэрміновая рэканструкцыя. Мала таго, усе неабходныя дакументы на карыстанне будынкам, у тым ліку і дазвол да 2014 года ад МНС, у нас у наяўнасці. Да таго ж мы і самі пачалі спаквапя рабіць рамонт унутры Палаца. За 2009—2010 гг. былі праведзены рамонтныя работы на суму 930 млн бел. руб., што ў 78 разоў больш, чым у 2006—2008 гг. Рамонт унутры працягваецца, а з пацяпленнем мы плануем перайсці да вонкавага рамонту.

Саюз мастакоў рашуча настроены абараняць свае правы і захаваць сваю законную ўласнасць за сабой. Тым больш, што вялікіх выставачных пляцовак, якія былі б прыдатныя для маштабных мастацкіх праектаў, у Беларусі і так нестае. А Палац мастацтва, пабудаваны ў 1973 годзе на грошы Саюза мастакоў і Мастацкага фонду СССР (пра што СМ мае адпаведныя дакументы), складаецца з трох вялікіх выставачных залаў: жывапісу (1450 кв. м), графікі (670 кв. м), дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (500 кв. м). Акрамя таго, мае вестыбюль з антрэсолямі (745 кв. м), канферэнц-залу (больш за 200 месцаў) і ўтульны ўнутраны дворык, дзе часта ладзяцца разнастайныя перформансы і чытанні на свежым паветры.

— Мне, як кіраўніку Саюза мастакоў, не зразумела, чаму наогул узнікла такая сітуацыя, — распавядае Уладзімір Савіч, — Будынак Палаца мастацтва — гэта не проста будынак. Гэта культурная «мека» краіны. На нашы выставы ахвотна прыязджаюць людзі з усёй Беларусі і нават з іншых краін. А калі будынак у нас незаконна хочуць забраць, то паўстае пытанне: ці патрэбна наогул Мінгарвыканкаму культура? Ёсць закон, паводле якога Палац мастацтва — наша ўласнасць. Закон — не пусты гук. А раз так, мы будзем абараняць свае правы. Цягам бліжэйшых дзён мы дадзім адказ Мінгарвыканкаму, у якім будуць прыведзены ўсе нашы аргументы. А распараджацца маёмасцю творчага саюза, паводле нашага статута, зацвярджаны Мінюстам, можа толькі Рада альбо з'езд арганізацыі, а не адзін старшыня. Калі дзяржава не цікавіцца выяўленчым мастацтвам, то гэта сведчанне вялікага крызісу. Палац мастацтва — гэта будынак, за кошт якога выжывае Саюз мастакоў. Між іншым, мы не маем ніякіх запазычанасцяў перад дзяржавай. Без Палаца мастацтва — закрывай Саюз мастакоў і гавары: «Такой арганізацыі няма!»

Сітуацыя, якая склалася вакол Палаца мастацтва, турбуе многіх творчых людзей краіны. Але на сёння мы агучылі пазіцыю толькі аднаго боку — Саюза мастакоў. На жаль, атрымаць каментарый у Мінгарвыканкаме пакуль не ўдалося. Спадзяёмся на справядлівае рашэнне праблемы і ў хуткім часе вернемся да гэтай тэмы.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту кантрольна-рэвізійнага аддзела Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ладуцька Ірыны Мар'янаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

ПАКВАПІЎСЯ НА ЗАРПЛАТУ МЕДСЯСТРЫ

З сумачкі медсястры Цэнтральнай гарадской бальніцы Брэста прапала 430 тысяч рублёў і тры долары. Сумка, як заўсёды, знаходзілася ў пакоі для медперсаналу. Па гарачых слядах затрымалі 23-гадовага злодзея. Ён нідзе не працуе.

Яна СВЕТАВА.

ТЫСЯЧУ ДОЛАРАЎ АДДАЛІ ФАТОГРАФУ-АМАТАРУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— І «Брама мар», і міжнародная прэмія ў галіне вэб-журналістыкі — гэта тыя конкурсы, якія ідуць з асяродку студэнтаў, — распавёў «Звяздзе» **дырэктар Інстытута журналістыкі БДУ Сяргей ДУБОВІК**. — Тут яны самі выступаюць у якасці арганізатараў і «рухавікоў» гэтых мерапрыемстваў. Нам падабаецца, што нашы студэнты займаюцца гэтым, што яны такія крэатыўныя. Наша задача — дапамагчы праявіць сябе кожнаму з нашых студэнтаў.

Ці плануе Інстытут журналістыкі як-небудзь прэміраваць найбольш ініцыятыўных студэнтаў?

— Я не ведаю, як прэмія Інстытута, але прынамсі размову ў гэтым накірунку з Міністэрствам інфармацыі мы будзем весці, — гаворыць Сяргей Дубовік. — Таму што тое, што робіць, напрыклад, Дзяніс Місюля, — гэта ўжо не толькі ўніверсітэцкая справа, гэта становіцца ўжо дзяржаўнай справай. Сёння такога ўзроўню конкурсы ў нас у краіне не праводзяцца. І тое, што мы робім, — гэта крок наперад.

Ілья ЛАПАТО.

«Няхай жыве жыццё!». Менавіта гэты здымак атрымаў галоўную ўзнагароду прэміі «Yousmi Media Awards-2010» — тысячу долараў ЗША.

Абзац

У Мінску на ўліку ў органах сацабароны стаяць 37 жанчын, узрост якіх больш за 100 гадоў. Іх аднагодкаў-мужчын усяго 9. Сярод пенсіянераў, старэйшых за 70 гадоў, — 97,1 тыс. жанчын і каля 39,2 тыс. мужчын.

Супрацоўнікі УП «Белтэхагляд», ДАІ і Транспартнай інспекцыі Мінтранса з 10 па 20 сакавіка правядуць праверкі на дарогах Беларусі. Падчас рэйдаў яны будуць правяраць, ці своечасова ўладальнікі транспартных сродкаў праходзяць тэхагляд.

На дарогах Беларусі за выхадныя загінулі 16 чалавек.

У Мінску жанчына загінула ад наезду МАЗа. ДТЗ адбылося 7 сакавіка каля 13.15. Аўтамабіль «МАЗ» пад кіраваннем мужчыны 1964 года нараджэння рухаўся па дваровай тэрыторыі дома № 18 па праспекце Ракасоўскага і наехаў на пешахода, 75-гадовую жанчыну. Яна атрымала цялесныя пашкоджанні і была дастаўлена ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі, дзе ад атрыманых траўмаў памерла.

Супрацоўнікі МНС выратавалі ў Мінску двух чалавек, якія плылі на льдзіне па рацэ Свіслач. Паведамленне паступіла ад мінака, які расказаў, што насупраць аўтазапраўкі па вул. Леніна на льдзіне плывуць два чалавекі і просяць аб дапамозе. Праз 10 хвілін выратавальнікі былі на месцы і ўбачылі, што на льдзіне памерам 15х2 м знаходзіцца двое маладых людзей. Іх выратавалі пры дапамозе спецыяльных сродкаў. Хлопцы патлумачылі, што яны лавілі рыбу, калі лёд нечакана трэснуў, ільдзіна адкалолася і паплыла. Меддапамога нікому не спатрэбілася.

У Мінску пешаход, які спяшаўся сесці ў маршрутку, пазбавіўся пальцаў рукі. На словах кіроўцы, мужчына бег да маршруткі, але спатыкнуўся і ўпаў, літаральна нырнуўшы пад колы. Маршрутка не паспела яшчэ спыніцца, таму пешаход атрымаў сур'ёзную траўму. Як высветлілася, ён быў нецвярозы.

У Брэсцкай вобласці за мінулыя выхадныя (5—8 сакавіка) скончылі жыццё самагубствам сем чалавек, усе — мужчыны.

Мінчанка «падарыла» сабе на 8 Сакавіка касметыку на Br459 тыс. У гэты дзень міліцыя затрымала ў краме на вуліцы Пуліхава жанчыну, якая вынесла касметыкі амаль на паўмільёна рублёў. Парадавацца падарунку, які сама сабе паднесла, мінчанка не паспела: спрацавала сігналізацыя — і на месца прыбыў нарад Ленінскага аддзела аховы г. Мінска. Міліцыя затрымала жанчыну і высветліла, што яна ўжо была судзімая.

Поўны абзац

28-гадовая брытанка Кэлі Джон стане бабуляй. У 14 гадоў яна нарадзіла дачку Тыя. Яе равеснік бой-фрэнд не быў гатовы стварыць сям'ю, таму дзяўчына выхоўвала дзяўчынку адна. І вось 14-гадовая Тыя зацяжарала і заявіла маці, што збіраецца нараджаць дзіця. Кэлі непакоіцца, што ўнука ёй давядзецца расціць сваімі сіламі на сціплую зарплату афіцыянткі ў 368 фунтаў, хоць 15-гадовы сябар яе дачкі Дэвіс гатовы ўзяконіць адносіны і клапаціцца пра малое.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

У МІНСКУ АЎТО БОЛЬШ, ЧЫМ У МАСКВЕ, КІЕВЕ І САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ

Аб гэтым паведаміў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька на сустрэчы з выкладчыкамі і студэнтамі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка, перадае БЕЛТА.

«Мінск па колькасці аўтамабіляў на 1 тыс. жыхароў апярэдзіў Маскву, Кіеў і Санкт-Пецярбург. Гэта сведчыць аб вывераначсі эканамічнага курсу, які праводзіўся ў нашай краіне на працягу ўсяго перыяду часу ў няпростых эканамічных умовах. Гэты курс трэба падтрымліваць і развіваць», — сказаў мэр сталіцы.

Паводле яго слоў, у Мінску зарэгістравана амаль 600 тыс. аўтамабіляў, з якіх каля 60 тыс. грузавыя, астатнія — легкавыя. Штогод аўтапарк сталіцы прырастае на 35 тыс. машын, а на вуліцы выязджае больш за 400 тыс. аўтамабіляў. Таму актуальнай задачай для ўлад, адзначыў Мікалай Ладуцька, становіцца забеспячэнне бесперашкоднага перамяшчэння па Мінску.

У сувязі з гэтым старшыня Мінгарвыканкама паведаміў, што ў горадзе пачалі актыўна рэалізоўваць праграму будаўніцтва транспартных развязак. «Да нашых дасягненняў можна аднесці той факт, што ў горадзе адначасова ўжо ўзводзяць 4 развязкі. Кошт будаўніцтва адной у сярэднім абыходзіцца гарадскому бюджэту ў $25—30 млн. Прычым амаль палова гэтай сумы прыпадае на падрыхтоўчыя работы — перакладанне інжынерных камунікацый, знос будынкаў і інш.», — расказаў старшыня Мінгарвыканкама.

Акрамя таго, у сталіцы прынята праграма «400 тысяч», галоўны напрамак якой — стварэнне месцаў для паркоўкі як за сродкі насельніцтва, так і мясцовага бюджэту. Так, у 2011 годзе ў кожным раёне горада плануецца стварыць па 1 тыс. парковачных месцаў за кошт пашырэння праездаў у дварах. Таксама праектуюцца два паркінгі.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *14 апреля 2011 г.* проводит открытый *аукцион* по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4	Лот 5	Лот 6
1	Адрес земельного участка	Михановичский с/с, д. Чуриловичи, участок № 5	Михановичский с/с, д. Чуриловичи, участок № 14	Михановичский с/с, д. Чуриловичи, участок № 15	Роговский с/с, д. Ашнарово	Роговский с/с, д. Курневичи	Роговский с/с, д. Курневичи
2	Кадастровый номер	623684206601000295	623684206601000228	623684206601000227	623685800601000036	623685811601000040	623685811601000041
3	Площадь земельного участка	0,1529 га	0,1514 га	0,1514 га	0,1870 га	0,1868 га	0,1864 га
4	Целевое назначение	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
5	Расходы по подготовке документации (рублей)	1 100 000	1 100 000	1 100 000	1 200 000	1 074 000	1 154 000
6	Начальная цена земельного участка (рублей)	50 000 000	31 000 000	30 000 000	9 000 000	7 000 000	7 000 000
7	Задаток (рублей)	5 000 000	3 100 000	3 000 000	900 000	700 000	700 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **14.04.2011 г. в 9.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **08.04.2011 г.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–3 перечисляется на расчетный счет № 3600621090116 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лоты 4–6 – на расчетный счет № 3600621140167 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052358, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Цыгарэты і алкаголь небяспечныя ў ложку

Для 5 жыхароў Магілёўшчыны ў мінулыя выхадныя дні непатушаная цыгарэта стала пагібельнай, паведаміў прэс-сакратар абласнога ўпраўлення МНС Юрый Мятліцкі.

У вёсцы Бабірава Глускага раёна на пажары загінуў 53-гадовы мужчына, які перабіваўся выпадковымі заробкамі і выпіваў. Верагодна, што гаспадар хаты 5 сакавіка перад сном пакурыў, а затушыць цыгарэту не здолеў. Ён задыхнуўся ў дыме.

У вёсцы Язёры Чэрыкаўскага раёна на пажары загінуў 25-гадовы мужчына. Ачаг загарання паказаў, што прычына трагедыі — непатушаная цыгарэта пры курэнні ў ложку.

4 сакавіка ўвечары жыхары пасёлка Ялізава Асіповіцкага раёна ўбачылі клубы дыму, якія вырываліся з-пад даху адной з хат. Людзі кінуліся ратаваць гаспадыню і яе сужыцеля. Жанчына з апёкамі трапіла ў шпіталь, а 55-гадовы мужчына загінуў. У пасёлку расказалі, што пара адрознівалася асацыяльным ладам жыцця, яны не працавалі і пілі, а хату ператварылі ў сметнік, які ўрэшце загарэўся.

За два месяцы ў Магілёўскай вобласці адбылося 197 пажараў, на якіх загінула 53 чалавекі. З іх 50 чалавек развіталіся з жыццём з-за неасцярожнага курэння ў нецвярозым стане.

Ілона ІВАНОВА.

БЕЛАРУСКІ БІЗНЭС займеў платформу на 2011 год

Нацыянальную платформу бізнэсу Беларусі-2011 абмеркавалі і прынялі больш за 350 удзельнікаў XII Асамблеі дзелавых колаў, сярод якіх былі прадстаўнікі бізнэсу, прадпрымальніцкіх саюзаў, міжнародных арганізацый, а таксама дзяржаўных органаў. Такім чынам, бізнэс-супольнасць абазначыла свае пажаданні наконт прыярытэтных напрамкаў рэфармавання дзелавога клімату, якія аформіліся ў 103 пункты і шэсць раздзелаў.

— Вельмі правільна, што была падтрымана ідэя прадпрымальнікаў і 2011 год аб'яўлены годам прадпрымальнасці. І гэта не толькі для прадпрымальніка, а для ўсіх галін улады, для ўсяго грамадства — мы сапраўды павінны 2011 год зрабіць годам найбольш паўнавартаснай рэалізацыі ідэі Дырэктывы №4. Я лічу, што яна будзе працаваць доўгі час, і мы павінны правесці наш дзелавы клімат у такі ідэальны стан, каб любому бізнэсмену хацелася сюды прыехаць, укладваць сюды грошы, дабівацца прыбытку і атрымліваць асалоду, а не галаўны боль, — мяркуе **Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.**

Уладзімір Карагін таксама вылучыў з платформы так званую «гарачую дзясятку» праблем беларускага бізнэсу, якія трэба неадкладна вырашыць для паскоранага развіцця эканамічнага патэнцыялу краіны: 1) рэальнае партнёрства і давер бізнэсу і ўлады, 2) новае заканадаўства, якое б стымулявала развіццё бізнэсу, 3) добрасумленная канкурэнцыя і роўныя ўмовы гаспадарання, 4) свабоднае цэнаўтварэнне, 5) канкурэнтаздольныя падаткі, 6) умераныя і справядлівыя штрафы, 7) прыватызацыя арандуемай дзяржаўнай маёмасці, якая дрэнна выкарыстоўваецца ў інтарэсах дзяржавы, 8) зямельныя ўчасткі, 9) вытворчыя плошчы, 10) падтрымка дастойнага іміджу прадпрымальніцтва.

У гэтым годзе была свая спецыфіка: прадпрымальнікі адначасова пісалі Нацыянальную платформу бізнэсу Беларусі-2011 і давалі свае прапановы ў план мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў Дырэктывы №4, пра які ў сваім выступленні гаварыў **Андрэй ТУР, намеснік міністра эканомікі:**

— Падрыхтаваны план мерапрыемстваў, прычым я магу смела сказаць, што гэты план з'яўляецца прадуктам нашай сумеснай працы з дзелавой супольнасцю. Ён складаецца з амаль 140 пазіцый, ён ухвалены на прэзідыуме Саўміна, але да 4 красавіка ён яшчэ з'яўляецца адкрытым для прапаноў, — сказаў Андрэй Мікалаевіч і падкрэсліў, што гэта павінны быць менавіта прапановы. — Вось толькі што мне перадалі дзве прапановы. Прабачце, але гэта не прапановы, а проста канстатацыя праблем. Зачытаю адну: «Як весці бізнэс, калі арэндадаўца без тлумачэння прычын можа разарваць дамову?». Гэта канстатацыя праблем, мы іх і так ведаем. Вы пішыце, як гэтую праблему можна вырашыць, вашыя рэкамендацыі, механізмы, што трэба памяняць у заканадаўстве і гэтак далей.

Пры гэтым Андрэй Тур выказаў меркаванне, што некаторыя палажэнні з платформы бізнэсу могуць быць выкарыстаны для далейшай працы па лібералізацыі дзелавога асяроддзя, і падкрэсліў, што практычна 90% прававых і падзаконных актаў, пазначаных у плане мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў Дырэктывы №4, павінны быць прыняты ў першай палове 2011 года.

Адным з ганаровых гасцей на XII Асамблеі дзелавых колаў быў **Вячаслаў КЕБІЧ, былы прэм'ер-міністр Беларусі:**

— Я веру, што з'яўленне Дырэктывы №4 — вынік новых павеваў у дачыненні да развіцця дзелавога партнёрства. Вы павінны дакладна зразумець: без сярэдняга класа ніякае грамадства развівацца па-сапраўднаму не можа. Так, Дырэктыва №4 адкрывае шлюзы, але адкрыццё шлюзаў яшчэ не значыць, што пайшла вада. Бо трэба вельмі шмат падзаканадаўчых актаў зрабіць для таго, каб Дырэктыва №4 пачала працаваць. Кожны чыноўнік зыходзіць з таго паняцця, што навошта лезці наперад — раптам я што-небудзь зраблю не тое і мяне пакараюць? Таму вам трэба націскаць на ўсіх чыноўнікаў, на ўрад, каб дырэктыва выконвалася.

Дарэчы, на Асамблеі дзелавых колаў былі абвешчаны і вынікі конкурсу «Лепшы горад для бізнэсу Беларусі-2010», які арганізавалі бізнэс-асацыяцыя пры падтрымцы Міністэрства эканомікі. Такім чынам, сярод 65 беларускіх гарадоў, якія прынялі ўдзел у конкурсе, па 16 крытэрыях самымі лепшымі былі выбраны Полацк (у катэгорыі больш за 50 тысяч жыхароў) і Ашмяны (менш за 50 тысяч жыхароў).

Павел БЕРАСНЕЎ.

Кампетэнтна

Тарас НАДОЛЬНЫ:

«Пры скарачэнні долі дзяржавы ў вядучых банках укладчыкі не падвяргаюцца ніякай рызыцы...»

ДАВЕР — гэта той фундамент, на якім стаіць банкаўскі сектар, прычым незалежна ад таго, пра якую краіну свету ідзе гаворка. Менавіта давер дае стабільнасць як банку, так і яго ўкладчыкам. Беларускім банкам удалося заручыцца даверам укладчыкаў і захаваць яго, нягледзячы на наступствы сусветнага фінансавага крызісу, якія не маглі не закрануць і нашу рэспубліку. Прынамсі, такі вывад можна зрабіць, выходзячы са статыстыкі росту дэпазітаў насельніцтва на пачатку гэтага года. Як толькі ўляглася хваля чутак, узнятая напрыканцы мінулага года вакол лёсу беларускага рубля (а наконт надзейнасці банкаў у людзей сумненняў і не ўзнікала), у банках толькі за месяц адбыўся істотны прырост зберажэнняў беларусаў — за студзень дэпазіты фізічных асоб папоўніліся больш як на трыльён рублёў. Як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам нашай газеты намеснік старшыні Нацыянальнага банка Беларусі Тарас НАДОЛЬНЫ, банкаўскі сектар рэспублікі вызначаецца сваёй стабільнасцю, а таму і ў насельніцтва няма ніякіх падстаў для недаверу крэдытным арганізацыям краіны.



— Як і раней, летась банкаўскі сектар краіны працягваў дынамічна нарошчваць свой капітал, — кажа Тарас Надольны. — Каб чытачы «Звязды» ўяўлялі, чым «дыхаюць» сёння банкі, згадаю пра асноўныя тэндэнцыі развіцця банкаўскай сістэмы. На пачатак гэтага года банкаўскі сектар Беларусі ўключаў 31 банк, з якіх 26 з'яўляліся банкамі з удзелам замежнага капіталу, у тым ліку 9 банкаў — са 100-працэнтным замежным капіталам, яшчэ ў двух банкаў толькі па адной акцыі належыць рэзідэнтам рэспублікі. На тэрыторыі нашай краіны знаходзіцца 8 прадстаўніцтваў замежных банкаў Расіі, Літвы, Латвіі, Германіі і Міждзяржаўнага банка.

За мінулы год сукупны статутны фонд павялічыўся на 2,47 трыльёна рублёў і на 1 студзеня 2011 года склаў больш за 12 трыльёнаў рублёў, ці каля 4 мільярдаў долараў ЗША ў эквіваленце. Памер замежнага капіталу ў статутных фондах банкаў павялічыўся за 2010 год на 307,5 мільярда рублёў (102,5 мільёна долараў), яго доля ў сукупным статутным фондзе на 1 студзеня гэтага года складала 24,2 працэнта. Аб'ём нарматыўнага капіталу банкаўскага сектара на пачатак 2011 года склаў 17,6 трыльёна рублёў (каля 5,9 мільярда долараў) і павялічыўся за леташні год на 4,22 трыльёна рублёў (1,4 мільярда долараў), ці на 31,5 працэнта, што вышэй прагнознага параметра. Між іншым, адзін з ключавых паказчыкаў устойлівасці банкаў — паказчык дастатковасці нарматыўнага капіталу. Дык вось, у цэлым па сістэме на пачатак гэтага года ён склаў 20,45 працэнта, што ў 2,6 раза перавышае вызначаны для асобнага банка мінімальны нарматыў (8 працэнтаў). З улікам дынамікі іншых нарматываў бяспечнага функцыянавання, што склаліся да цяперашняга часу, узровень устойлівасці банкаўскага сектара ў цэлым можна ахарактарызаваць як дастатковы для супрацьстаяння ў кароткатэрміновым перыядзе магчымаму ўздзеянню негатыўных падзей.

— Тарас Юр'евіч, а як міжнародныя эксперты ацэньваюць прывабнасць банкаўскага сектара Беларусі і краіны ў цэлым?

— Міжнародныя эксперты таксама адзначаюць тое, што банкаўскі сектар рэспублікі ўстойлівы і прывабны. Так, суверэнны крэдытны рэйтынг, які быў прысвоены Беларусі ў 2007 годзе буйнейшымі міжнароднымі рэйтынгавымі агенцтвамі Standard & Poor's і Moody's, — адзін з нямногіх у рэгіёне, які застаўся нязменным на працягу ўсяго перыяду фінансавага крызісу (B+ —Standard & Poor's і B1 — Moody's).

Рэйтынгі большасці банкаў рэспублікі таксама не былі паніжаныя ў перыяд крызісу. У частцы фінансавага стану і перспектыў функцыянавання банкаў рэспублікі, якія маюць крэдытныя рэйтынгі, агенцтва Standard & Poor's, напрыклад, адзначае шэраг пазітыўных фактараў, сярод якіх высокая верагоднасць дзяржаўнай падтрымкі ці падтрымка асноўнага фізічнага рынку, разгалінаваныя сеткі продажаў, адэкватны ўзровень капіталізацыі, а таксама абмежаваную залежнасць ад фінансавання на рынках капіталу.

Пазітыўныя змены ў цэлым у эканоміцы Беларусі дазволілі нашай краіне перамясціцца за апошнія тры гады са 113 на 68 месца ў рэйтынгу «Вядзенне бізнэсу», які распрацоўваецца штогод Сусветным банкам. На працягу двух гадоў рэспубліка ўваходзіць у лік 10 краін-лідараў, якія найбольш актыўна ажыццяўляюць рэформы ў сферы рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці (краіна прызнаная трэцім самым актыўным рэфарматарам у свеце за апошнія пяць гадоў). Акрамя таго, Беларусь знаходзіцца на 61 месцы па індэксе чалавечага развіцця ПРААН. Гэты індэкс у рэспубліцы вышэй, чым сярэдні яго паказчык у цэлым па Еўропе і Цэнтральнай Азіі.

Паляпшэнне інвестыцыйнага клімату Беларусі і спрыянне прыцягненню ў краіну замежных інвестыцый — цяпер адзін з важнейшых напрамкаў дзейнасці ўрада і Нацбанка. Мы маем намер і далей працягваць планамерную работу па забеспячэнні надзейнасці нацыянальнай валюты, падтрыманні стабільнасці функцыянавання банкаўскай сістэмы і плануем прымаць далейшыя захады па павышэнні прывабнасці эканомікі для інвестараў. На працягу наступных пяці гадоў наша праца будзе накіраваная на далейшую лібералізацыю эканомікі і падтрыманне стабільных тэмпаў росту, паляпшэнне бізнэс-клімату і забеспячэнне ўстойлівасці нацыянальнай валюты і стабільнасці банкаўскай сістэмы. Мяркуем, што дасягнутыя ў выніку гэтай працы вынікі дазволяць нам трапіць у топ-30 краін у рэйтынгу «Вядзенне бізнэсу», у топ-50 краін па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу. Акрамя таго, мы разлічваем палепшыць паказчыкі, у прыватнасці, ВУП на душу насельніцтва — 25-30 тысяч долараў ЗША (па парытэце пакупной здольнасці), чаканая працягласць жыцця пры нараджэнні — 73—75 гадоў.

— Працягваючы тэму наконт даверу ўкладчыкаў, хацелася б развеяць некаторыя сумненні, якія часам выказваюцца людзьмі і датычацца продажу беларускіх банкаў нерэзідэнтам. Не так даўно БПС-Банк быў прададзены расійскаму Ашчадбанку, таксама плануецца продаж аднаго з буйнейшых дзяржаўных банкаў — Белінвестбанка. Асобных ўкладчыкаў у гэтай сувязі турбуе наступнае: ці падвяргаюцца яны рызыцы пры скарачэнні долі дзяржавы ў нашых вядучых банках?

— Адразу зазначу, што стратэгія па скарачэнні долі дзяржавы ў банкаўскім сектары правільная, і яе прытрымліваецца большасць цэнтральных банкаў краін, якія развіваюцца, у тым ліку і Расія. Разам з тым, продаж буйнейшых банкаў стратэгічным інвестарам павінен суправаджацца ростам даверу грамадзян да гэтых фінансавых устаноў, а не стратай гэтага даверу. Важна, каб людзі разумелі, што дзяржава ў любым выпадку будзе падтрымліваць буйнейшыя фінансавыя ўстановы (прысутнічае там дзяржава ці не) таму, што там сканцэнтраваная вялікая кліенцкая база. Гэта значыць, па сутнасці, мы падтрымліваем не саму ўстанову, а яе кліентаў, асабліва калі там вялікая колькасць фізічных асоб. Таму пры скарачэнні долі дзяржавы ў вядучых банках укладчыкі не падвяргаюцца ніякай рызыцы.

Акрамя таго, нагадаю, што дзяржава гарантуе поўную захаванасць грашовых сродкаў фізічных асобаў у беларускіх рублях і замежнай валюце, размешчаных на рахунках і ва ўкладах у банках Беларусі, і кампенсацыю 100 працэнтаў сумы гэтых сродкаў у валюце рахунка ці ўкладу ў выпадку прыняцця Нацыянальным банкам рашэння аб адкліканні ў банка спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці, які дае права на ажыццяўленне банкаўскай аперацыі па прыцягненні грашовых сродкаў фізічных асоб у банкаўскія ўклады (дэпазіты), у цэлым альбо ў частцы ажыццяўлення такой банкаўскай аперацыі. Гэтыя палажэнні прадугледжваюцца Законам Рэспублікі Беларусь «Аб гарантаванай кампенсацыі ўкладаў (дэпазітаў) фізічных асоб» і Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб гарантыях захаванасці грашовых сродкаў фізічных асоб, размешчаных на рахунках і (ці) банкаўскія ўклады (дэпазіты)».

— Тарас Юр'евіч, напрыканцы лютага кіраўнік краіны звярнуў увагу прысутных на тое, што кіраўнікі ўсіх узроўняў павінны працаваць над прыцягненнем замежных інвестыцый. Якія ў галоўнага банка краіны ў гэтым пытанні напрацоўкі?

— Нацыянальны банк разам з урадам і іншымі органамі дзяржаўнага кіравання праводзіць значную працу па стварэнні ўмоў для прыцягнення замежных інвестыцый у банкаўскую сістэму і паляпшэнні інвестыцыйнага клімату ў краіне. Практычныя крокі банка ў гэтым напрамку ўключаюць мерапрыемствы па ўдасканаленні заканадаўчай базы, актыўны ўдзел у розных міжнародных інвестыцыйных форумах і канферэнцыях, якія праводзяцца як у Беларусі, так і за мяжой. Акрамя таго, мы праводзім перагаворы і сустракаемся з прадстаўнікамі вядучых арганізацый сусветнай дзелавой супольнасці па абмеркаванні пытанняў прыцягнення фінансавых рэсурсаў у краіну, а таксама кансультацыі з замежнымі інвестарамі, якія працуюць у рэспубліцы, з мэтай паляпшэння бізнэс-клімату і павышэння інвестыцыйнай прывабнасці Беларусі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ГАСЦІНІЦЫ СТАЛІЦЫ Ў 2010 ГОДЗЕ ПРЫНЯЛІ НА 10% БОЛЬШ ПАСТАЯЛЬЦАЎ, ЧЫМ У 2009-М

Колькасць турыстаў, якія скарысталіся паслугамі сталічных гасцініц і гасцінічных комплексаў, за мінулы год у параўнанні з папярэднім узрасла на 10,5%, або на 37,8 тыс. чалавек. У 2010 годзе пастаяльцамі гасцініц Мінска сталі 398,5 тыс. чалавек, 39,4% з іх — грамадзяне Беларусі, пра гэта паведамілі ў галоўным гарадскім статыстычным упраўленні.

Сярод грамадзян з іншых дзяржаў 61,5% склалі тыя, што прыбылі з краін СНД, у асноўным расіяне (84,1%) і ўкраінцы (9,6%). У 2010 годзе ў параўнанні з 2009-м на 62,2% павялічылася колькасць турыстаў з Кітая, на 40,5% — з Расіі, на 33% — з Літвы, на 29,1% — з Нідэрландаў, на 26% — з ЗША. І наадварот, колькасць турыстаў з Вялікабрытаніі скарацілася на 5,1%, з Італіі — на 3,3%.

Выручка з размяшчэння прыезджых у гасцініцах і гасцінічных комплексах за 2010 год склала 163,3 млрд руб. і павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам на 28,7% у фактычных цэнах. Асноўная частка выручкі (80,9%) паступіла ад размяшчэння замежных грамадзян.

На 1 студзеня 2011 года ў Мінску налічвалася 28 гатэляў (з іх 2 пяцізоркавыя, 2 чатырохзоркавыя, 6 трохзоркавых). Адначасовая ўмяшчальнасць усіх сталічных гасцініц горада на 1 студзеня гэтага года склала 5 417 месцаў.

Алена АНТОНАВА,
«Мінск—Навіны».

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск
№ 9 (671)
адрасы рэкламы 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Дом у Рудзенску, Асіповіцкі напрамак, з усімі выгодамі, гараж, майстэрня, лазня, 21 сотка, 30 км ад МКАД.
Тэл.: 8 029 313 36 93, 8 01713 635 40.

❒ Козы. Смалявіцкі р-н, Жодзінскі с/с.
Тэл. 8 01776 600 23.

❒ Дача ў в. Гарняты Мядзельскага р-на, возера 100 м.
Тэл.: 8 0215 555 12 33, 8 029 777 23 09.

❒ Дом у Бягомлі, 91 кв. м, выгоды ў доме, вада, цвёрдапаліўны кацёл, гараж, лазня, на ўскрайку сасновага лесу.
Тэл. 8 033 317 39 26.

❒ Каляска інвалідная з электрапрывадам.
Тэл. 8 044 530 54 74.

❒ Бульба насенная ў Уздзенскім раёне, 20 км ад Мінска.
Тэл. 8 01718 49 177.

❒ Дыван на падлогу (100 % шэрсць) у выдатным стане, памеры 2х3 м. Цана 150 тыс. руб.
Тэл. 8 044 769 77 14.

❒ Самазвал ГАЗ-53; паўпрычэп ЗІЛ; МАЗ-93866-тэнт, або памяняю на а/м маркі Джып.
Тэл. 8 029 949 70 70.

❒ Драўляны дом 59,3 кв. м у в. Жыгалкі Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл., ацяпленне, газ, вада, тэлефон, 0,3 га.
Тэл.: 8 01717 39 152, МТС 606 39 68.

❒ А/м ГАЗ-3110, 1999 г.в., у ідэальным стане, прабег 65 тыс. км.
Тэл. 8 029 677 39 85.

КУПЛЮ

❒ Машынку для стрыжкі авечак электрычную.
Тэл. 8 029 674 88 62.

РОЗНАЕ

❒ Рэпетытар па рускай мове 5—11 кл., тэсціраванне, ст. м. «Аўтазаводская».
Тэл.: 8 017 246 20 45, 8 029 274 93 79.

ЗВЯЗДА **КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЫЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

ЗДАЙ «АРСЕНАЛ». ПАЗБАЎСЯ ПРАБЛЕМ

З 9 па 13 сакавіка ў сталіцы будуць праводзіцца аператыўна-прафілактычныя комплексныя мерапрыемствы «Арсенал» па добраахвотнай здачы насельніцтвам зброі і боепрыпасаў.

Звяртацца па гэтым пытанні неабходна ў Першамайскае РУУС г. Мінска на адрас: зав. Інструментальны, 5. Тэлефоны: 280 97 31, 280 02 02, 280 24 42. Упраўленне ўнутраных спраў адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска нагадвае, што асобы, якія добраахвотна здалі зброю і боепрыпасы ў органы ўнутраных спраў, вызваляюцца ад адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці.

Святлана БАРЫСЕНКА.

НА ПАЖАРЫ ЗАГІНУЎ ГАСПАДАР КВАТЭРЫ

Пра пажар у васьмікватэрным цагляным двухпавярховым жылым доме ў вёсцы Гасцілавічы ўвечары ў Лагойскае раённае падраздзяленне МНС паведаміла суседка.

На месцы работнікі МНС з кватэры на першым паверсе выратавалі гаспадара, пенсіянера, якога перадалі брыгадзе «хуткай дапамогі». Аднак па дарозе ў раённую бальніцу ён сканаў... Работнікамі МНС на лесвіцы з кватэры на другім паверсе была таксама выратаваная ўчаніца 1 класа. Яна не пацярпела. На момант пажару дзяўчынка была дома па прычыне хваробы, а бацькі знаходзіліся на працы. У выніку пажару выгараў пакой 3х4 метра, закураныя сцены і столь трохпакаёвай кватэры на першым паверсе. Мяркуецца, што прычынай здарэння стала неасцярожнасць з агнём загінулага.

ПЕНСІЯНЕР ПАЛЯВАЎ З ПЕТЛЯМІ

Факт незаконнай здабычы зайца-русака і казулі на тэрыторыі Нацыянальнага парка «Нарачанскі» сумесна ўстанавілі работнікі Мядзельскіх міжрайінспекцыі і РАУС, супрацоўнікі самога парку.

Браканьерам аказаўся пенсіянер — мясцовы жыхар. «Паляваў» ён з дапамогай металічных петляў. У парушальніка канфіскаваныя тры пятлі і мяса дзічыны агульнай вагой 15 кілаграмаў. Заведзена крымінальная справа. Шкода складае амаль 2,5 мільёна рублёў. Парушальнік пакрыў яе добраахвотна і ў поўным аб'ёме.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ТАРЫФ НА ВЫВАЗ СМЕЦЦЯ ЦІ НА НАШУ СВЯДОМАСЦЬ?

З вёскі Хатынічы Ганцавіцкага раёна ад месцічаў паступіла скарга наконт вывазу камунальнай службай бытавога смецця з іх падворкаў. Забягаючы наперад, зазначым, што праблема аказалася куды больш сур'ёзнай, чым здалося на першы погляд: па-першае, закранала яна не толькі канкрэтных заяўнікаў, але і многіх іншых вяскоўцаў, таму нейкія імёны жыхароў на старонках газеты мы называць не будзем. Па-другое, і сама пастаноўка пытання з боку месцічаў у большы шырокім сэнсе нам падалася не зусім карэктнай. Зрэшты, як у нечым і спосаб яго вырашэння — ужо з боку канкрэтных бакоў, прызваных зрабіць тое. Але спачатку паслухаем сутнасць вышэйназваных скаргі.

— Дагавор на вываз смецця з камунальнікамі наша сям'я не заключала, і два апошнія гады яго ў нас не забіралі. Тым не менш у снежні мінулага года мы атрымалі паперу з патрабаваннем аплаціць запазычанасць па вывазу бытавога смецця — за перыяд, пачынаючы з чэрвеня 2008 года, — на суму 33 тысячы рублёў, — тлумачылі нам. — Ці павінны мы плаціць за паслугу, якой не карысталіся? Смецце ў тых, хто заключыў дагавор на вываз, забіраюць адзін раз у месяц. Прычым людзі скардзяцца, што трэба стаяць побач з тымі мяхамі і пільнаваць машыну. Інакш могуць і не забраць. Паслуга па вывазе каштуе 600 рублёў у месяц з кожнага члена сям'і. У мяне заробак у калгасе 300 тысяч, працую без выхадных. Няма ў мяне лішніх грошай! А тут чарговая папера прыходзіць — позва ў суд. І пазначана, што мы павінны, ужо з улікам пені, заплаціць больш за 50 тысяч рублёў?!.

Перш чым пайсці далей у разборы скаргі, варта спыніцца на адным абавязковым пытанні, якое мы і задалі заяўніцы: а куды яна, адмовіўшыся, як сцвярджае, ад вывазу смецця, потым дзявае бытавыя адходы? На жаль, у нашым цяперашнім жыцці практычна немагчыма абысціся без пластыку, поліэтылену, шкла — якім бы экалагічна свядомым не быў чалавек. Залішне казаць, напэўна, якой праблемай з'яўляецца забруджванне прыроды, у тым ліку несанкцыянаванымі звалкамі бытавога смецця ў лясных масівах, на тэрыторыях, прылеглых да чыгункі, аўтамабільных дарог, на берагах вадаёмаў...

— Лісце закапваю на агародзе або палю. Гэтак жа і непатрэбную паперу выкарыстоўваю для распальвання. Усё, што можна такім чынам утылізаваць — знішчаю самастойна.

— Ну, добра. А пластыкавую бутэльку, металічную накрыўку ад слоіка, поліэтыленавы пакет вы куды дзяваеце?

— Бочка вялікая на дварэ стаіць, туды і кідаю шкло і бляшанкі. Яна яшчэ і не запоўненая нават цалкам. Няхай, каму трэба, прыедуць, паглядзяць.

Зноў жа добра, што чалавек не выкідвае абы-куды смецце, якое ў прыродзе вельмі працяглы час забруджвае навакольнае асяроддзе. Але ўявім сітуацыю: згаданая бочка напоўнілася цалкам. І куды цяпер смецце з яе? Нейкага канкрэтнага адказу на гэта простае пытанне мы так і не пачулі...

Зноў жа — 600 рублёў у месяц з чалавека за вываз смецця і пазбаўлення ад праблемы яго самастойнага вывазу (зноў жа — куды?) — няўжо гэта такія вялікія грошы няхай сабе і пры невялікім заробку? Нават калі гэта будзе 1,2 тысячы ў месяц — з дваіх членаў сям'і? На жаль, паразумення з суразмоўцай і тут дасягнуць не атрымалася.

Аднак вернемся да скаргі. З мэтай разабрацца ў сітуацыі мы патэлефанавалі ў камунальнае ўнітарнае міжгаліновае вытворчае прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Ганцавіцкая жыллёва-камунальная гаспадарка». Што датычыцца папрокаў вяскоўцаў адносна няякаснага прадастаўлення паслугі па вывазе бытавога смецця — несвоечасовасці, у прыватнасці, — нам удакладнілі, што праз аб'явы ў мясцовым друку насельніцтва інфармуецца пра графік вывазу, пра тое, што смецце трэба з раніцы выстаўляць каля веснічак.

Увогуле пра сітуацыю з утылізацыяй бытавога смецця ад насельніцтва і тыя праблемы, што ўзніклі канкрэтна з жыхарамі вёскі Хатынічы, мы больш падрабязна размаўлялі ўжо з юрысконсультам прадпрыемства Юрыем КАЎШОМ.

— У 2006 годзе было прынятае заканадаўства, якое рэгламентавала пытанні ўтылізацыі бытавых адходаў ад насельніцтва. Была пастаўленая задача ахапіць абавязковай паслугай па вывазу бытавога смецця 100 працэнтаў вясковага насельніцтва. Таму, у адпаведнасці з рашэннем ужо мясцовых органаў улады (ад 22.03.2006 года — «Аб рэалізацыі сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў і паляпшэнні абслугоўвання насельніцтва ў сельскай мясцовасці (на прыкладзе Агарэвіцкага і Начскага сельвыканкамаў)»), у 2006-2007 гадах бланкі на аказанне паслуг перадаваліся ў сельскія Саветы — для заключэння дагавораў: з аднаго боку — наша прадпрыемства, з другога — канкрэтны грамадзянін. Аказанне ж саміх паслуг пачалося фактычна з красавіка 2008 года, — распавёў Юрый Уладзіміравіч. — І вось што далей часам атрымлівалася? Скажам, у сям'і — некалькі чалавек. Нехта з іх — муж ці жонка — наведаў сельскі Савет па якой патрэбе, напрыклад, даведку ўзяць. Між іншым вяскоўцу прапанавалі падпісаць і дагавор на вываз бытавога смецця. Чалавек падпісаў, і сам з цягам часу забыўся, а сямейнікам пра тое не паведаміў. Адсюль і шэраг пытанняў, мяркую, мы ніякіх дагавораў не падпісвалі. А сам факт подпісу дагавора з'яўляецца для бухгалтара падставай для налічэння аплаты за паслугу.

Як сказаў далей Юрый Коўш, зараз позвы ў суд ужо падрыхтаваныя на 20 чалавек. Яшчэ на 29 дадаткова яны рыхтуюцца. Па словах суразмоўцы, гэта менавіта той крок, які дазволіць расставіць усе кропкі над «і», вырашыць усе спрэчкі. Таму грамадзянам не варта загадзя палохацца. (Наша заяўніца якраз згадвала пра намер патрабаваць праверкі сапраўднасці подпісу — **С.Р.**)

— Туды з'яўляюцца ўсе члены сям'і з пашпартамі. І потым мы звяраем подпіс у дагаворы з подпісамі ў пашпартах іх уладальнікаў. Можа быць прызначаная і графалагічная экспертыза, але, думаю, нават простае параўнанне дапаможа разабрацца. І калі мы пераканаемся, што сапраўды ніхто з сямейнікаў дагавор не падпісваў, прадпрыемства адмаўляецца ад іскавога патрабавання, суд справу спыняе і гэта з'яўляецца падставай для спісання бухгалтарам налічанай неправамерна, калі так атрымаецца, запазычанасці, — зазначыў Юрый Уладзіміравіч.

Спадзяёмся, канкрэтна па сітуацыі мы нашых чытачоў зарыентавалі — у станоўчым, што склалася, позва ў суд прызваная канчаткова высветліць пазіцыі бакоў. А нам нарыканцы ўяўляецца важным зноў вярнуцца да таго, пра што мы ўжо крыху гаварылі напачатку. Тым больш што з тымі думкамі не толькі салідарны, але і — па працы — на справе сутыкаецца Юрый Коўш.

— Добра, паперу чалавек спаліў у печцы. Пластык і поліэтылен ён так не ўтылізуе, а на агародзе раскладваць з іх вогнішча забаронена, паколькі забруджваецца навакольнае асяроддзе. Нармальны чалавек не стане закопваць такія небяспечныя адходы і на сваім участку, на якім вырошчвае нешта для сябе і сваіх дзетак. Так, некаторыя часам кажуць, што б'юць шкло і выкарыстоўваюць яго разам з жалеззем пры заліцці падмуркаў — для трываласці апошніх. Няхай так. Аднак усё роўна паўстае пытанне: калі ў вашай чытачкі, іншага чалавека запоўніцца цалкам бочка, куды і як ён павязе смецце?! — гаварыў суразмоўца. — Ці чалавек будуе дом і зразумела, што ў яго абавязкова будзе шмат будаўнічага смецця? Мне часам адказваюць: дык на ваш жа палігон і вывезу. Дык, грамадзяне, мы з той жа самай мэтай і ідзём вам насустрач — каб пазбавіць неабходнасці пад покрывам ночы весці смецце на звалку! Прапануем рэгулярны і за невялікую плату вываз... Мне бачыцца тут праблема яшчэ і ў тым, што, паставіўшы задачу ахапіць усё вясковае насельніцтва вывазам бытавога смецця, забыліся ў заканадаўстве прапісаць адказнасць чалавека за адмову ад гэтага. У прыватнасці, можна прыгадаць рашэнне абласнога Савета дэпутатаў № 104 ад 14 сакавіка 2008 года «Аб зацвярджэнні прыкладнага палажэння аб парадку забеспячэння індывідуальнымі домаўладальнікамі належнага ўтрымання дваравых і прылеглых да іх тэрыторый». У гэтым дакументе гаворыцца пра тое, што грамадзяне павінны падтрымліваць на сваіх участках чысціню і парадак, аднак адсутнічаюць меры ўздзеяння ў выпадку невыканання названых патрабаванняў...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Нефармат

ГАРЭЛКА З ГЛУЗДУ ЗВОДЗІЦЬ?

Гісторыя гэта літаральна страсянула павольнае жыццё райцэнтра. Не, крымінальныя выпадкі, на жаль, і да гэтага не абыходзілі палескі гарадок, здараліся і забойствы. Але каб такое! Іван Пятровіч, назавём яго гэтым імем, заўсёды быў звычайным чалавекам, ва ўсялякім выпадку, нармальным і адэкватным яго называюць суседзі, калегі, знаёмыя. Шмат гадоў працаваў начальнікам аддзела аднаго з адметных у райцэнтры прадпрыемстваў. І, як пішуць у службовых паперах, па працы характарызаваўся станоўча.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Некалькі гадоў таму напаткала яго бяда — памерла жонка. З той пары, многія заўважылі, мужык пачаў папіваць. Але ж на чарку налягаў пасля працы. Што называецца, мае права. Іншыя спачувалі: топіць гора ў бутэльцы.

Вось і ў той дзень, які ён ужо не раз пракляў, Іван Пятровіч захапіў пляшку па дарозе з працы. А каб піць было весялей, паклікаў крыху маладзейшага прыяцеля. На вечар ім той пляшкі не хапіла, прыбавілі яшчэ. Абмяркоўвалі розныя тэмы: ад палітыкі да кабет. І вось у нейкі момант ацэнкі адной са знаёмых жанчын у сабутэльнікаў аказаліся дыяметральна супрацьлеглымі. Тады Іван Пятровіч не знайшоў іншага спосабу ўнушыць суразмоўцы думку аб тым, што жанчына не заслугоўвае такой крытыкі, якая толькі што прагучала... як узяць сякеру ды стукнуць апанента абухом па галаве.

Потым ужо нежывога прыяцеля ён зацягнуў да палатна чыгункі, якая праходзіць непадалёку. А сам вярнуўся дадому. Калі яго прыйшлі арыштоўваць, ён, працверазелы, не мог спачатку паверыць, што гэта зрабіў, потым асэнсаваць і неяк раскласці па паліцах свядомасці. Выходзіла, што ў чалавеку абудзілася нейкая іншая субстанцыя і стала кіраваць яго ўчынкамі. Царква называе гэту субстанцыю д'яблам. Медыцына звязвае з'яву з часовымі псіхічнымі адхіленнямі.

Цікавую версію на гэты конт мае адна з супрацоўніц пракуратуры, з якой давялося гутарыць не так даўно. Дык вось юрыст з вялікім стажам сказала, што, на яе думку, цяперашняя гарэлка мае ў складзе нейкае рэчыва альбо некалькі іх, што разбуральна дзейнічаюць на псіхіку. Такога раней не назіралася, каб злачынствы насілі настолькі бессэнсоўна жорсткі характар. Трапляюцца справы, калі здзекуюцца захвяры, літаральна рэжуць на кавалкі без усялякай прычыны або проста паводзяць сябе неадэкватна. Потым, як правіла, растлумачыць нічога не могуць.

Быў жа ў Брэсце не так даўно выпадак, калі на канцавым прыпынку вадзіцель тралейбуса пачала будзіць пасажыра, што заснуў на сядзенні. А ён прачнуўся... і стаў збіваць жанчыну. Потым высветлілася, што грамадзянін — узорны сямейнік, добры працаўнік. А пра той інцыдэнт ён толькі бубніў адно: ехаў з гасцей, там ужывалі...

Зусім нядаўна ў Баранавіцкім раёне адбылося вельмі жорстк

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

ФОТА СЛОВА

Не замярзае рэчка часу,
Плывуць стагоддзі па вадзе,
Адвечны рух -
яе украса
І броду тут няма нідзе.
Нішто не сцішыць
плынь нямую,
Ніхто не скорыць глыбіню,
Я гэтай быстрынёй
вяслую -
Плыву па ёй
з зімы ў вясну.



Я сніў…
Ў заінелых вышынях,
Дзе звеку гняздуюць снягі,
Пранізлівы крык жураўліны -
Як знак невядомай тугі.
Куды у бязлітаснай сцюжы
Спяшаюцца белыя крылы?
Іх люты мароз не адужыў
І хцівая ноч не скарыла.
Навошта,
вандроўнік крылаты,
Скрозь снежны заслон
прабівацца –
Зарана вяртацца дахаты,
Запозна у вырай збірацца…
Мне сніўся
ў зімовых вышынях
Нязможанай птушкі палёт,
Углядаліся
ў неба шыпшыны
І ціхнуў асуджаны лёд.

ІНСЦЭНІРАВАЛА НАПАД

А грошы, якія нібыта былі выкрадзеныя невядомымі злачынцамі, прысвоіла

Заблытаць уласнае кіраўніцтва і следства паспрабавала адміністратар гульнёвага клуба аднаго з ААТ ва Уздзе: у прыватнасці, у міліцыю паступіла паведамленне пра тое, што трое невядомых каля двух гадзін ночы праніклі ў клуб, ударылі яе і выкралі выручку.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, «пацярпелая» заявіла, што здабычай нахабнікаў стала каля 4 мільёнаў рублёў. Следствам жа, якое было распачатае па гэтай справе, высветлена, што жанчына была, мякка кажучы, не зусім шчырая, выкладаючы сваю версію таго, што адбылося: мяркуецца, што адміністратар клуба інсцэніравала гэтае злачынства, а грошы прысвоіла.

Ігар ГРЫШЫН.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Кадрыліяж. Маісееў. Жэрдка. Кас-та. Звяно. Сіл. Спыт. Ліра. Гарадок. Ане. Аскет. Дзні. Наклад. Vuy. Пяята. Шасі. Рак. Дар. Маят. Пінот. Дуб. Вараб'ёў. Кальнадар. **На вертыкалі:** Гальлін. Шапе-люў. Зарок. Луцэр. Ядзіт. Ата. Дзюка. Дуўр. Коска. Кадмій. Кіра. Бар. Струк. Станок. Макет. Пята. Асат. Мыс. Ядта. Пнеў. Эстэда. Уран. Катух. Іран. Балівар.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.37	18.03	11.26
Віцебск —	6.28	17.52	11.24
Магілёў —	6.28	17.53	11.25
Гомель —	6.23	17.51	11.28
Гродна —	6.53	18.18	11.25
Брэст —	6.52	18.20	11.28

Месяц

Апошняя квадра 7 сакавіка. Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Тараса.*

К. *Яўгеніі, Аляксандра, Макара, Цыпрыяна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Дзве даты

10 сакавіка

1249 год — Мінданаў разграміў каля горада Крутагор'е войскі татарскага князя Койдана, і з таго часу Крутагор'е стала называцца Койданавам (з 1932 года — горад Дзяржынск).

1876 год — вынаходнік Аляксандр Бел у Бостане ўпершыню правёў тэлефонную размову.

Цытата дня:

«Раўніўцы вечна глядзяць у падзорную трубу, якая рэчы малыя пераўтварае ў вялікія, карлікаў — у гігантаў, здагадкі — у ісціну».

Мігель дэ Сааведра Сервантэс (1547—1616), іспанскі пісьменнік.

Усміхнемся

Кажуць, пасля 8 Сакавіка ў «Шлюбны кодэкс» будзе занесена «шахматная» папраўка: «Крануў — жаніся!»

☺

Сяброўка гаспадыні дапамагае прыбірацца пасля 8 Сакавіка і дае парады:

— Апельсінавую лупіну збяры, высушы і пакладзі ў шафу ад молі.

— Агуркі ў смятане добрыя як касметычная маска.

— Гарчыцай адмыем посуд.

— Гарэлку можна...

— Дапіць! — рэзка ўставіў муж гаспадыні, кульнуў чарку і вярнуў твар у салату.

☺

Пры спробе папрацаваць быў знойдзены інтэрнэт.

☺

Рынак. Пакупнік — прадаўцу:

— Які ў вас сабекошт кілаграма бульбы?

— Сабекошт — камерцыйная таямніца, а табекошт — 3000 рублёў за кіло.

Фота Сяргея АЛЯКСАНДРАВА.

«НАДЗВЫЧАЙШЧЫКІ» ГЛЯДЗЯЦЬ — РАТАВАЦЬ, НЕ РАТАВАЦЬ?..»

Хто каго?

Чыстая праўда (у Аўцюках, як вы ведаеце, бывае і чыстая брахня): адзін з тамтэйшых вяскоўцаў, значыць, з жонкай палаяўся — у чарговы раз. І вырашыў, што ўсё: гэта — ужо ў апошні, бо лепей жудасны канец, чым жуда без канца. Прыйшоў ён да ракі Закананкі, закінуў вяроўку на старую вярбу, што стаяла на беразе, зрабіў пятлю, усунуў галаву і...

Гайдануўся б — напрыканцы... Аднак сук не вытрымаў — адламаўся. І мужык той — боўць у раку!

А тапіцца ж ён намеру не меў...

Адкуль — крый Божа, лёд падымецца, крыгаход пачнецца, пабудовы затопіць... Рабі тады, што хочаш.

Зрэшты, цяпер людзі ўжо ведаюць, што канкрэтна трэба рабіць у экстрэмальных сітуацыях: выклікаць супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Кадры там падрыхтаваныя, адпаведнай тэхнікай узброеныя, можна сказаць, да зубоў... Адзінае — ім рашучасці можа не хапіць. У дзеяннях:

«Надзвычайшчыкі» глядзяць — Ратаваць, не ратаваць?..
Пакуль раду правялі,
З бабы бурбалкі пайшлі, —

піша пра бедную спадарыня Кусянкова.

А, між іншым, як лічаць сябры з гуртка «Юны журналіст» агульнаадукацыйнай школы № 3 г. Вілейкі, шчасце было такім магчымым, такім блізкім, бо кабета, перш чым пусціць тыя бурбалкі, заспявала (ці не голасам Кадышавай?):

— Не судзіце мяне, людзі,
Не марудзьце, мужыкі.
Бо са мной шчаслівы будзе
Той, хто выцягне з ракі.

Магчыма. Але ж, на думку спадарыні Лапацкай з той жа Вілейкі, рызыка ёсць:

Ну, Мікола, ты і выбраў —
Нарабіў сабе бяды:
Ці русалка тут, ці выдра —
Жыць не можа без вады.

А, значыць, плёхаецца ў ёй пастаянна. Альбо (на думку спадара Гарачова) зрэдку прыходзіць, прычым з пэўнай мэтай:

У палонцы бізнэс-людзі
Змыць рашылася грахі,
А ахоўнікі-мядзведзі
Зашпілілі кажухі.
Ды дарэмна тых герояў
Прывяла яна сюды,
Бо любога абяззброіць,
Калі вылезе з вады.

Ці не пра тыя ж цяжкія грахі (толькі мужчынскія) піша і спадар Дубовік з Бярэзіншчыны:

Кожны трэці ўлева ходзіць...
Ім вось ведаць не пашкодзіць:
Хто ў пельку апускаецца,
Таму грэх і адпускаецца:
На Вадохрышча... У палонку.
Каб не знала толькі жонка!

Дык, значыць, прыйшлі яны, а палонка якраз і занятая. Той самай... жонкай — падманула! А вось аднаго свайго мужыка ці ўсіх пяцярых — ёсць пытанне. У спадара Гарачова:

Запрасіла дзеўка ў пушчу,
Але ж зноў — «кідалава»,
Бо яна — не Люся Лушчык
І не Саша Паўлава.

А хацелася б! Бо мужчыны — яны ў большасці сваёй за здаровы лад жыцця — з... гарэліцай, цыгарэтамі, півам, дзяўчатамі... (Хіба ж гэта не здорава?!). Ім здаецца, што яшчэ і як! А вось тым дзяўчатам:

Без маржа вусатага
Жытка распраклятая...
Хоць у пельку, хоць у крык,
Выраджаецца мужык!

Канстатацыя факта — ад Валерыя Гаўрыша. Ад спадара Астроўскага з Мінска прыгожыя радкі пра маржоў. Не, не тых, якія зімой у палонках купаюцца, а сапраўдных: млекакормячых з атрада ластаногіх, якія вызначаюцца цікаўнасцю і лагодным норавам, харчуюцца малюскамі, жывуць сем'ямі... Прычым у хілых асобін, як правіла, ніводнай жонкі, а ў дужых — з дзясятак. Адкуль і радкі:

Я па тэлеку знайшоў
Перадачу пра маржоў.
І здзівіўся: гэта ж жах,
Колькі жонак у маржа!
Пры такой вадзе сцюдзёнай
Ад чаго імпэт ягоны?..
Як, скажыце, людцы, братцы,
Мне вось так загартавацца?!

Складанае пытанне, бо Іван Іванавіч, наколькі ведаем, не начальнік ЖЭКа. Вось таго б загартавалі. Прычым (на думку спадара Сітніка з в. Палажэвічы Старадарожскага раёна) лёгка. І на здымку якраз той самы «працэс» загартоўкі. Дзівіцеся:

Божа ж мой... Начальнік ЖЭКа!
Што загнала чалавека
У люты холад у палонку?
Угнявіў каханку-жонку?
Ці людзей? Прайшла зіма!
Вады цёпленькай няма.
(Пра гарачую нам, грэшным,
Заікацца нават смешна).
Вось жанчыны і загналі.
Яшчэ й ліфчык прывязалі.

Здзек за здзек, гэта называецца, бо не будзеш жа добраму чалавеку ліфчык шкадаваць — хай сфатаграфуецца для найстарэйшай беларускай газеты, якую спадар Дубовік з Бярэзіншчыны настойліва раіў бы ўсім (асабліва чынавенству), па-першае, выпісваць, а па другое, трымаць пры сабе выразкі з рубрык «Хто каго?», «Алё, народ на провадзе!» і зрэдчас зазіраць у іх, каб у тэлевізары не такія кіслыя твары былі. Ход падзей жа да лепшага, лічыць Міхаіл Паўлавіч — значыць, можна ўсміхацца. А хоць бы і таму, што

Неяк баба захацела
Акунуць душу і цела...
Ну яна ж не вінавата,
Што рачулка мелкавата?!

(Пытанне ад спадарыні Чыгрынавай).

...Завяршыць жа агляд хацелася б аптымістычным (ад спадара Гарачова):

Па-над Прыпяццю і Бугам
Зімка люта дыхае.
Мужыкі і хлопцы цугам
Ходзяць за маржыхаю.

Зімой... Што ўжо казаць пра вясну?!

Хіба тое, што яна (і гэта непазбежна!) — ідзе... Нават прыйшла, калі верыць календару. А значыць, пера-зіма-валі! З чым і хочацца павіншаваць усіх чытачоў-падпісчыкаў, усіх удзельнікаў конкурсу і... адну пераможцу. На думку вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі да здымка пра гандаль у крэдыт («Звязда» ад 22.01) даслалі спадары Нефідовіч з Лунінеччыны, Гаўрыш з Чавусаў, Гарачоў з Іўеўшчыны, спадарыні Бурко з Бярэзіншчыны, Тарасік з Мінска, Лабажэвіч з Клецка і Чыгрынава з вёскі Забалацце Вілейскага раёна. З гэтым, апошнім, меркаваннем пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. А значыць, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету накіроўваецца на Вілейшчыну. Хочаце, каб да вас? Пішыце! Здымак, як заўжды, дадаецца. Умовы ранейшыя: коратка (не больш за восем радкоў), дасціпна, разборліва і па-беларуску.

Валянціна ДОЎНАР,
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

P.S. *Спадар Спірыдовіч з г.п. Івянец анекдот даслаў. Сустракаюцца два мужыкі.*

— Як справы? — пытае адзін.
— Выдатна! — адказвае другі.
— У «Звяздзе» друкуюся.
— Ух ты! І што ж надрукаваў?
— Аб'яву.
Адчулі: аб'яву... І ўжо шчаслівы.
Зрабіў палову той, хто пачаў! Пішыце.

«ШЧАСЦЕ» Ў СПАДЧЫНУ

Перш, чым пакласці дзіця ў калыску, выконвалі шэраг рытуальных дзеянняў: абмыркавалі яе святой вадой, абсыпалі спасаўскім макам ці чацвярговай соллю, бабка-павітуха малявала вакол яе кола, чытала замовы, каб дзіця добра расло, добра спала па начах і г.д.

● Потым, на працягу ўсяго першага года, маці будзе чытаць малітву і выказваць бласлаўленне кожны раз, калі будзе класці дзіця ў люльку.

● Па ўяўленнях нашых продкаў, калі калыску гушкаць, гэта паспрыяе хуткаму росту і развіццю дзіцяці. Першы раз калыхаць дзіця ў люльцы неабходнай было правай рукой — «каб дзіцяці ў жыцці шанцавала».

● У нашых продкаў існаваў шэраг строгіх забаронаў, якія тычыліся калыскі: **нельга было люляць пустую калыску, гушкаць яе ўдваіх, садзіцца ці абапірацца на калыску**.

● У калысцы дзіцятка маглі трымаць ад аднаго да трох гадоў. Калі малое вырастала, калыску хавалі. Выкідаць ці ламаць калыску забаранялася пад страхам смерці. Толькі пасля таго, як калыска станавілася непрыдатнай, яе разам з іншымі старымі рэчамі спальвалі на купальскім вогнішчы.

● Калі ў сям'і больш не чакалі дзяцей, «шчаслівую» калыску перадавалі ў спадчыну маладым сваякам ці захоўвалі для ўнукаў.

● Калі ў сям'і на свет з'яўляліся адны хлопчыкі ці адны дзяўчаты, дзве сям'і мелі права абмяняцца калыскамі — з надзеяй, што «зменіцца» і пол наступнага дзіцяці.

● Калі калыску пазычалі, то абавязкова даведваліся, ці не паміралі ў гэтай сям'і дзеці, каб перасцерагчы сваіх дзяцей.

● Звычайна, калі дзіця паміралі ў калысцы, яе ламалі і спальвалі, як і ўсе дзіцячыя рэчы, у якіх памерла дзіця.

● Катэгарычна забаранялася несці калыску з хаты ў хату пустой; у любым выпадку ў яе нешта неабходна было пакласці.

● Таксама, калі пераносілі калыску, яе нельга было ставіць на зямлю, каб не наклікаць на дзіця беды і нястачы.

● Вяртаць калыску неабходна было так: яе прыносілі да той хаты, дзе бралі, а ў хату яе павінен быў занесці сам гаспадар.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: rek@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 1136. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12